АГОНЬ І СНЕГ

Аповесць трэцяя

1941

24 чэрвеня

Вайна... Трэція суткі, як яна пачалася. Ударыла, як гром з яснага неба, аглушыла, і я ніяк не магу апомніцца. Не толькі цяпер, пасля бою, пасля першых выбухаў бомбаў і нашых няўмелых стрэлаў, гудзіць у вушах. Не, гэты звон і гул у галаве з'явіліся адразу ж, як толькі я, першым на багарэі, пачуў аб вайне. І страх (мне сорамна прызнацца ў гэтым), страх таксама запаланіў душу з першых хвілін. Увесь час думаю пра смерць. Няўжо гэта канец? У дваццаць адзін год? Няўжо я ніколі не вярнуся дадому, не ўбачу маці, Сашу і маю маленькую дачушку?..

Здаецца, страшная не сама смерць, не ўсведамленне, што я, маленькі чалавечак, кропля ў людскім акіяне, перастану існаваць. Найбольшы страх ад думкі, што ніколі... ніколі (вось ад чаго ледзянее кроў) я не ўбачу Сашу. Саша! Каханне маё! Каб ты пачула крык майго сэрца! Я не хачу паміраць! Я хачу жыць! Жыць! Я хачу прыйсці да цябе, упасці да тваіх ног і цалаваць іх, цалаваць сляды на той дарозе, па якой ты хадзіла.

Не магу спаць, сон не прыходзіць трэцюю ноч. Як толькі заплюшчу вочы — адразу ж паўстаюць яна, мая Саша, з дачушкай на руках, Аніна хата, такая любая цяпер майму сэрцу, дарога, наша дарога ўздоўж Дняпра, па якой прыйшоў я і

па якой Саша правяла мяне сюды, у гэты далёкі, суровы паўночны край, не ведаючы, што праводзіць на вайну. Як ніколі раней, прыгадваюцца кожнае яе слова, кожны жэст, пацалунак — усё-ўсё. І страх смерці расце, душыць, скоўвае.

Дзіўная рэч! Ці даўно быў той час, калі я любіў чытаць пра вайну і, як, напэўна, многія мае равеснікі, употай марыў аб ваенным подзвігу? Мне здавалася, што адразу ж я здолею зрабіць нешта такое, што праславіць маё імя і выратуе чалавецтва... Цяпер я сумна ўсміхаюся, успамінаючы гэтыя думкі. Наіўны хлопчык! Ты можаш памерці, не зрабіўшы аніякага подзвігу, нават самага маленькага. Ужо сёння я мог памерці. Зусім інакшай паўстала ў маім уяўленні вайна — нічога прыгожага, адно жудаснае. Я думаю: якое гэта шчасце — мір, цішыня на зямлі! О, каб дажыць да такога дня!

Усяго некалькі дзён назад мы, курсанты, амаль усе крыху фразёры, многа гаварылі пра немцаў, аб іх ваеннай тэхніцы і перамогах, якія ім так лёгка даваліся ў Еўропе. Мы нават крыху захапляліся іх аперацыямі. Я асабіста ды, напэўна, і мае сябры таксама не адчувалі асаблівай нянавісці. Больш было слоў, гучных фраз, чым пачуццяў. А цяпер... Як я ненавіджу іх цяпер! Ажно кіпіць у грудзях, калі я думаю пра іх, пра іх тэхніку, пра іх перамогі... Ад гэтых «перамог» паміралі вось такія ж, як я, як Сеня, як Віктар, хлопцы — чэхі, французы, югаславы... Цяпер яны прыйшлі, каб забіць нас.

Я ўспамінаю сённяшні бой, і мне робіцца яшчэ больш страшна, горка і крыўдна.

Яны прыляцелі адвячоркам. Разлікі займаліся каля гармат, вялі ўмоўную стральбу па сваіх самалётах. Цяпер мы трэніруемся дзень і ноч, толькі і чуваць: «Па самалёту над другім!» Між іншым, мне адразу не спадабалася, што мы «страляем» у свае самалёты. Іншая рэч, калі гэта было да вайны: вучыліся лётчыкі — вучыліся мы. А цяпер яны лётаюць на заданне, у бой, па іх вядуць агонь немцы, часта яны вяртаюцца (мы бачым гэта) з прабітымі крыламі і фюзеляжамі, магчыма, раненыя. І раптам каля роднага аэрадрома іх сустракаюць нацэленымі зеніткамі. Я на іх месцы запратэставаў бы супраць такой сустрэчы. Учора я сказаў пра гэта лейтэнанту Купанаву, камандзіру батарэі. Ён паглядзеў на мяне, падумаў і лагодна сказаў:

— Вы многа разважаеце, Шапятовіч.

...Аднак.

Яны прыляцелі тады, калі недзе там, у нас, у Беларусі, заходзіла сонца. А тут яно павісла над лясістай градой невысокіх гор, каб больш не зніжацца да самай «раніцы». Спачатку вельмі нечакана, быццам вынырнулі з гары, з'явіліся над Туломай два «месершміты». Даўгія, чорныя, як вужы, яны прайшлі нізка над гідрастанцыяй, схаваліся за ўсходнімі сопкамі і зноў вынырнулі над аэрадромам.

— Трывога! — страшным голасам закрычаў разведчык.

Крык гэты ўсіх скалануў. У мяне задрыжалі рукі, заляскалі зубы. Я да болю сціскаў ручку паваротнага механізма, не зводзячы вачэй са стрэлкі азімута. Але стрэлка была мёртвая: ПУАЗО[1] не мог злавіць самалёты, якія шныралі паміж сопак. Там, на КП, каля прыбора, нешта крычалі, нешта камандавалі, але каманды гэтыя не мелі дачынення да нас, гарматных разлікаў. Разгублена стаяў наш камандзір, сяржант Тарных. Стукаў снарадам аб затвор, зараджаючы,— у яго таксама дрыжалі рукі.

Раптам бухнуў гарматны стрэл. Ударыла чацвёртая пушка; самы адсталы ў мірным вучэнні разлік, з якога мы заўсёды кпілі, першы адкрыў агонь, напомніўшы астатнім, што можна страляць і без прыбора.

— Па самалёту, прамой! — закрычаў сяржант.

Я хутка аб'ехаў вакол тумбы... Але самалётаў — чорт меў, «месершміты» зніклі, як прывіды. Я выцер рукавом сухі лоб, з палёгкай адчуўшы, як саграваецца спіна, па якой бегалі вельмі непрыемныя халодныя мурашкі. Дзякуй Богу, міма! Ды ў той жа міг загучаў надзіва спакойны голас Сені Пясоцкага:

— Цэль злоўлена! Азімут...

Я не пачуў ні азімута, ні вышыні, якую ён перадаваў, бо ў гэты момант засакаталі стрэлкі сінхроннай перадачы. Але няроўны, цяжкі — ажно тузалася паветра — гул я пачуў. Гэта ішлі яны. Ішлі на нас, несучы смерць. Колькі іх? Зноў тыя ж агідныя раўчакі холаду пацяклі па спіне, і яшчэ мацней затрэсліся калені, невядомая сіла падкідала ўсё цела, і сядзенне пада мной непрыемна брынчала.

---

[1] ПУАЗО — прыбор кіравання артылерыйска-зенітным агнём *(з рус.)*.

Першы стрэл балюча ўдарыў у вушы.

«Гэта таму, што не раскрыў рота,— падумаў я.— Трэба раскрыць рот. Раскрыць рот!»

І, чакаючы наступнага стрэлу, я шырока разявіў рот. Але стрэлкі... Я не зусім дакладна сумяшчаю іх. Ад гэтага залежыць пападанне: будуць праклятыя фашысты збіты ці, непакараныя, паляцяць назад. Аднак што там робяць прыборшчыкі? Чаму так ліхаманкава скача стрэлка? Хіба так можна страляць?

— Баязліўцы! Арыстакраты! Пацукі! Мандражэ вас узяло! — лаяў я сваіх сяброў на прыборы, гэтак жа ліхаманкава кідаючы гармату то ў адзін, то ў другі бок.

А гул, пагрозлівы, незнаёмы, ад якога дрыжыць усё навокал,— вось ён, над маёй галавой. Зараз паляцяць бомбы. Я ўтуляю галаву ў плечы, рыхтуюся «прыняць» на сябе першую бомбу...

Але чаму маўчыць наша пушка? Няўжо я больш не чую стрэлаў? Не, я не аглух. Я чую нават чалавечыя галасы. Нехта схапіў мяне за плечы.

— Не круціся ты, маць тваю... Круціцца, як... Снарад заклініла!

У мірны час сяржант ні разу не вылаяўся на каго-небудзь з курсантаў (паказваў прыклад культурнасці), а тут крыў самымі адборнымі мацюкамі. Я не адразу зразумеў, што здарылася, што значыць «заклініла», бо пры вучэбных трэніроўках ніколі не было такой затрымкі.

— Ключ! Дзе ключ? Ты адказваеш за інструмент!

— Які ключ? Ключоў многа.

— Ды гэты...

Я саскочыў з сядзення і ўбачыў, што здарылася, які ключ патрэбны. Тырчала пятка патрона, зацiснутага клінам затвора. Зараджаючы Фама Паўлюк, былы стрэшынскі трактарыст, хлопец на шэсць пудоў вагою, які заўсёды ў сталоўцы прасіў «перайграць», але лічыўся лепшым зараджаючым у дывізіёне, стаяў разгублены, белы як палатно, бездапаможна апусціўшы свае пудовыя кулакі. Астатнія нумары шукалі ключ-экстрактар, каб выцягнуць патрон, і нідзе не маглі знайсці, хоць усе ведалі, у якой скрынцы ён павінен ляжаць.

Мне здалося, што гул самалётаў рассеяўся, як бы аддаляецца. Я глянуў у неба і мімаволі прыгнуўся: проста нада мной, у самым зеніце, віселі два чорныя крыжы ў жоўтых кругах. Больш я нічога не ўбачыў — толькі гэтыя агідныя крыжы. Потым позірк мой упаў на агнявую пазіцыю батарэі, уразіла дзіўная рэч: насуперак правілам стральбы ўсе чатыры гарматы павернуты ў розныя бакі, і толькі адна, чацвёртая, вядзе агонь. Я падумаў: значыцца, варожыя самалёты з усіх бакоў, яны не ходзяць баявым курсам і ўсе нашы дакладныя разумныя прыборы, у якія мы так верылі,— непатрэбная рэч, дарэмна там да хрыпаты крычаць прыборшчыкі.

Мае думкі перапыніў моцны выбух, ад якога калыхнулася пад нагамі зямля. За ім другі, трэці... Над аэрадромам, над пасёлкам шуганулі ўгору слупы полымя і дыму.

Цяпер я бачыў іх, фашысцкія самалёты, нават бачыў, як падаюць бомбы. Фашысты з розных бакоў заходзілі на аэрадром, з якога ўзнімаліся, захопленыя знянацку, нашы знішчальнікі. Адзін з іх вынырнуў проста з выбуху і... загарэўся ў паветры. Другі, не набраўшы вышыні, урэзаўся ў будынак клуба лётчыкаў. На маіх вачах гінулі людзі... Нашы людзі!.. Ашаломлены, аглушаны, я не мог адарваць вачэй ад жудаснай карціны вайны, забыўшыся на нейкі момант на свой уласны страх. Там, у тых самалётах, сядзелі такія ж хлопцы, як я; напэўна, і ў іх ёсць жонкі і нарадзіліся дзеці, якіх яны ўжо ніколі не ўбачаць... Яны не проста забіты, яны, магчыма, гараць жывыя...

Знішчальнікі, якім удалося ўзляцець, атакавалі варожых бамбардзіроўшчыкаў. Застракаталі кулямёты. Пачаўся паветраны бой. Зноў з'явіліся «месершміты».

Полымя шуганула побач з агнявой пазіцыяй, там, дзе на беразе ручая стаяла наша дашчаная сталоўка. Са свістам праляцелі камені, кавалкі дрэва. У вышыні, у дыме і гары, натужліва зараўлі маторы.

«Падае»,— мільганула думка.

Не, самалёт не падаў, ён пікіраваў на батарэю. Забумкалі яго пушкі, ударылі буйнакаліберныя кулямёты. Грымнулі выбухі ўжо з другога боку пазіцыі.

Я зірнуў угору і зноў убачыў усё тыя ж чорныя крыжы ў жоўтых кругах, нібы яны павіслі тут назаўсёды. Праз гул,

выбухі і страляніну мы, аднак, пачулі каманду лейтэнанта Купанава:

— Ва ўкрыццё!

Першы нырнуў у земляную нішу Паўлюк. Мне нішы не хапіла: пакуль я агледзеўся, усе шчыліны занялі, з кожнай тырчалі ногі ў абмотках. Я ўпаў на зямлю каля гарматы і засунуў галаву пад лафет. Відаць, я не доўга ляжаў гэтак, бо не ўправіўся падумаць што-небудзь істотнае, ці, можа, гэта былі хвіліны такога здранцвення, калі нават думкі не прыходзілі.

Нехта даволі груба пацягнуў мяне за гімнасцёрку і злосна загадаў:

— Вылазьце, чорт вазьмі!

Я высунуў з-пад лафета галаву і ўбачыў перад сабой камандзіра дывізіёна маёра Ярмілава. Дух дысцыпліны адразу ўзняў мяне на ногі. Я падхапіўся, выпрастаўся, папраўляючы гімнасцёрку.

— Чаму не страляеце?

— З-з-за-заклініла, т-таварыш маёр...— Я ніколі ў жыцці не заікаўся, а тут пачуў, што заікаюся, бо зубы ўсё яшчэ ляскалі, быццам выцягнулі мяне не з-пад лафета, а з ледзяной вады.

— Што заклініла? — глянуў ён на затвор і закрычаў: — Выбіць! Не ведаеце, што рабіць! Баннік у рукі! Хутчэй! — Маёр тупнуў нагой, убачыўшы маю нерашучасць.

Баннік — гэта пяціметровы шомпал — ляжаў на брустверы, на рагульках. Я выскачыў з катлавана. Камандзір дывізіёна сам апусціў ствол пушкі, адначасова загадваючы нумарам заняць свае месцы.

Я асцярожна ўсадзіў баннік у ствол. Восем месяцаў нас вучылі, што выбіваць патрон баннікам небяспечна — снарад можа разарвацца. І раптам я павінен выбіць яго... Загінуць ад свайго снарада пры першай сустрэчы з ворагам... Хіба можа быць больш недарэчная, больш крыўдная смерць?

— Выбівайце ж! — закрычаў маёр.

Угары зноў зараўлі маторы. Я задраў галаву і... зноў убачыў усё тыя ж крыжы... Злавесныя крыжы! І нейкая неразумная, адчайная рашучасць апанавала мяне ў гэты міг: усё адно ад чаго паміраць! Адступіўшы, праўда, крыху ўбок, з

усёй сілай штурхнуў баннікам у снарад. І застыў, чакаючы, што здарыцца: разнясе мяне ўсяго ці толькі адарве рукі? Нічога не здарылася. Цяжкі унітарны патрон вылецеў з магазіна. Маёр злавіў яго і перадаў сяржанту. Потым, глянуўшы ўгору, закрычаў мне, але ўжо не ўладарна, не злосным, а ўстрывожаным голасам:

— Назад! У катлаван!

Я выхапіў баннік, і ён... пераламаўся недалёка ад маіх рук, а з-пад ног у мяне, ад камення, пырскнулі іскры. Я ў жаху адкінуў абломак і, паваліўшыся на зямлю, скаціўся ў катлаван.

Маёр падхапіў мяне на рукі.

— Ранены, таварыш курсант?

Ён спытаў так па-чалавечы хораша, ласкава, што я нічога не мог адказаць — праглынуў салёны камяк. Як маленькаму, захацелася прытуліцца да грудзей гэтага дужага і смелага чалавека.

— Цэлы? Доўга жыць будзеш! Па табе фашыст біў... Бачыш, баннік, сукін сын, перасек чаргой.— Маёр трасануў мяне за плечы, прыветліва ўсміхнуўся і, агледзеўшы неба, сказаў: — Ну, здаецца, адбой. Доўга яны віселі над намі.

Калі неба, бясхмарнае паўночнае неба, стала чыстае і ціхае, маёр пастроіў батарэю. Панурыя, з пазелянелымі тварамі сталі курсанты: відаць, ва ўсіх быў такі ж прыгнечаны і цяжкі настрой, як і ў мяне. Маёр спакойна прайшоў паўз строй, аднаму паправіў рэмень, другому змахнуў з грудзей пясок; хітрая і добрая ўсмешка хавалася ў зморшчынках каля вачэй.

— Што, атрымалі баявое хрышчэнне? Страшна? — Строй маўчаў.— Страшна, безумоўна,— адказаў ён сам за ўсіх.— Першы бой самы страшны, я помню. Але зарывацца ў зямлю насамі нам, зенітчыкам, не дазволена...

Лейтэнант Купанаў, які стаяў побач з камандзірам дывізіёна, пачырванеў, як дзяўчына, выцягнуўся.

— Вінаваты, таварыш маёр.

Наш камбат — тыповы вайсковец, узорны ва ўсіх адносінах афіцэр: падцягнуты, акуратны, лаканічны ў словах, у меру суровы і мяккі, заўсёды справядлівы, а галоўнае — усё ўмее: не было, здавалася, такой справы, якой ён не зрабіў бы. Нізкі ростам, шчуплы, ён, аднак, хутчэй за ўсіх зараджаў

гармату, дакладней за ўсіх працаваў на дальнамеры і прыборы, лепш за ўсіх страляў з вінтоўкі і пісталета; ён вучыў нас абіраць бульбу хутка і эканомна; ён у тры разы хутчэй наматваў абмоткі і выбягаў па трывозе, чым самы спрытны і ўвішны з нас — масквіч, спартсмен Раман Войтаў. Мы любілі лейтэнанта і паміж сабой называлі Напалеонам. Асабліва мы, вальналюбцы, паважалі яго за тое, што ён ніколі не губляўся ні перад якім начальствам, ні перад якой інспекцыйнай праверкай, няхай бы яе рабіў хоць сам маршал. Заўсёды Купанаў паводзіў сябе спакойна і ўпэўнена.

А тут так разгубіўся, што ажно неяк па-дзіцячы зашморгаў носам. Я зразумеў, што яму сорамна за сваю слабасць — за каманду: «Ва ўкрыццё!», за батарэю, за нашу ганебную стральбу, і мне стала шкада яго, бо і самому мне было сорамна і прыкра. Добра, што маёр разумны чалавек.

— Я пакуль што нікога не вінавачу,— сказаў ён.— Але майце на ўвазе. Зарубіце, як кажуць, на носе. Любы род наземных войск мае права, нават павінен укрывацца ад авіяцыі. Мы, зенітчыкі, не маем гэтага права. Мы можам схавацца ад агнявога налёту артылерыі, але ад самалётаў — ніколі! Добранькая справа, калі б мы, замест таго каб прыкрываць аэрадром, станцыю, свае войскі, залезлі ў шчыліны. Чаго б мы былі варты?! Гэта ўсё адно, каб пяхота схавалася ад штыкавой атакі праціўніка. Запэўняю вас, калі б усе гарматы вялі агонь хаця б так, як чацвёртая, фашысты не адважыліся б лезці на батарэю так нахабна...

Мяне ўразіла, што ён гаворыць пра ўсё гэта так проста і развážліва. Уразіла, але не заспакоіла, а яшчэ больш напалохала: ён гаворыць так, быццам нам наканавана праз многія месяцы і гады штодзень бываць пад бомбамі і кулямётным агнём. Няўжо штодзень будзе паўтарацца такое? Колькі ж часу бомбы і кулі будуць пралятаць міма? Сёння яны разбілі сталоўку і ранілі кухара і шафёра. А заўтра? Заняты сваімі думкамі, я дрэнна чуў, што яшчэ гаварыў маёр Ярмілаў.

Ды раптам у другой шарэнзе, там, дзе стаяў чацвёрты разлік, нехта пырснуў смехам.

Маёр сурова нахмурыўся:

— Што за смех? Хто смяяўся?

Строй застыў.

— Хто смяяўся?

— Я! — адгукнуўся зараджаючы чацвёртай гарматы Павел Кныш, здзівіўшы ўсіх: бадай што самы сур'ёзны і стрыманы курсант, старэйшы па гадах за іншых, нават за камандзіра батарэі. Ён, як настаўнік, карыстаўся колькі год адтэрміноўкай ад прызыву ў армію. Што здарылася з ім?

— Два крокі ўперад, марш!

Кныш выйшаў са строю.

— З чаго смяяліся?

— Вінаваты, таварыш маёр... Я ўспомніў, што наш сяржант даў каманду: «Газы»... пасля таго, калі вунь там, за пазіцыяй, упала бомба. А цяпер я ўбачыў, што бомба гэтая разнесла, прабачце... прыбіральню.

Усе павярнулі галовы туды, дзе стаяла батарэйная прыбіральня, і нечакана... строй грымнуў рогатам. Маёр таксама засмяяўся. Ажно слёзы заблішчалі ў вачах. Выціраючы іх, праз смех сказаў:

— Газы? Ах, чортавы дзеці! Але і газы могуць быць!

Толькі лейтэнант Купанаў гідліва зморшчыўся. Ды яшчэ адзін чалавек не ўсміхнуўся нават — я. Было не да смеху. Я не разумеў, як можна рагатаць з такога глупства, калі ў твар табе глядзіць смерць.

Калі чысцілі гарматы і рыхтавалі новы камплект боепрыпасаў, у мяне нечакана з'явілася думка — пачаць зноў весці дзённік. Некалі да арміі, у тэхнікуме, я акуратна запісваў усе падзеі свайго студэнцкага жыцця. Тут, на батарэі, кінуў — замяніў пісьмамі да Сашы, якія пісаў кожную вольную хвіліну (хоць хвілін такіх было няшмат), кожны святочны дзень, і нават прасіў дазволу ў камандзіра рабіць гэта ў «мёртвую гадзіну», пасля абеду, калі ўся батарэя адпачывала. А цяпер... ці будуць цяпер даходзіць мае пісьмы ў родную далячынь? Ды і не ўсё можна напісаць, цяпер вайна. А мне хочацца, каб Саша, мая Саша, і мая дачка калі-небудзь даведаліся, як я пачаў вайну, з якімі думкамі жыў гэтыя дні... Я веру, што, калі загіну, знойдзецца добрая душа і перашле дзённік Сашы. Дарагі таварыш, калі трапіць у твае рукі мой дзённік, вельмі прашу выканаць маё жаданне, адрас запісаны на многіх старонках гэтага сшытка.

І вось я пішу... Можа, залішне падрабязна апісаў наш першы бой з нямецкімі самалётамі, бой, пра які хочацца забыцца, не ўспамінаць, ды, напэўна, ніколі, да смерці, не забудзеш.

Пішу, прымасціўшыся ў гарматным катлаване, за снараднымі скрынкамі, ад якіх пахне дрэвам і маслам. Батарэя адпачывае. Цішыня. Неверагодная цішыня навокал. Нават чамусьці не чуваць шуму гідрастанцыі. Толькі Паўлюк парушае цішыню сваім моцным храпам. Ды зрэдку перакідваюцца паміж сабой словамі разведчыкі. Цяпер іх двое — сочаць за небам, аглядаюць яго празрысты блакіт у вялікія біноклі. Сіратліва, як бы яно не натуральнае, а зробленае, дэкаратыўнае, вісіць над сопкамі халоднае сонца. Дзве гадзіны ночы. Я зайздрошчу сябрам, якія здолелі заснуць пасля ўсяго, што адбылося. Не, не ўсе заснулі...

25 чэрвеня

Уночы, калі я пісаў, да мяне падышоў Сеня Пясоцкі, мой лепшы друг. Мы пасябравалі яшчэ ў дарозе, у цяплушцы, калі нас везлі з Гомеля сюды, на Поўнач. Разгаварыліся, і высвятлілася, што ён добра ведае Сашу, што маці яго — тая ўрач Марыя Сяргееўна, пра якую расказвала мне Саша з павагай, з гордасцю за сваю дружбу з гэтай жанчынай. Праўда, я трохі быў насцеражыўся, калі Сеня пачаў хваліць Сашу, нават варухнулася раўнівае пачуццё: ці не закаханы гэты хлапчук у маю жонку? Але потым я зразумеў, што захапляцца людзьмі, хваліць іх больш, чым трэба,— рыса яго характару. У армію яго ўзялі са школьнай парты, ён толькі скончыў дзесяць класаў. І на выгляд Сеня быў яшчэ дзіця, вучань: маленькі, худзенькі, з тонкім, як у дзяўчыны, голасам, з вялікімі вачамі, у якіх вельмі выразна адбіваўся яго настрой, з маленькімі, смешна адтапыранымі вушамі. Помню, у вагоне яму казалі: «Хлопчык, пасунься, дай месца. Хлопчык, збегай па ваду». Ён вінавата ўсміхаўся і паслухмяна ўсё выконваў. Але на батарэі даволі хутка Сеня заваяваў агульную павагу за сваю сардэчнасць і надзвычай шырокія веды. Яго так і называлі — «эрудыт». Эрудыцыя гэтая спалучаецца ў яго з рамантычнай, крыху наіўнай юнацкай узнёсласцю. Я палюбіў яго, мы сталі, як кажуць, неразлучнымі сябрамі.

Сеня падышоў непрыкметна. Я ўбачыў яго, калі ён сеў на бруствер, амаль над галавой у мяне, правільней — не ўбачыў, а адчуў і адразу пазнаў — хто. Не вельмі сумеўся ад

таго, што мяне захапілі ў такі незвычайны час за такім дзіўным заняткам (бадай, нікому не прыйшло ў галаву пісаць адразу ж пасля бою). Я напісаў яшчэ некалькі слоў, потым загарнуў сшытак, глянуў на друга. Як завастрыўся яго твар, як запалі яго вялікія вочы за тры дні.

— Што ты пішаш? — спытаў ён шэптам.

Я падняўся, абапёрся на бруствер каля яго ног і даверліва прызнаўся:

— Дзённік.

— Дзённік? — Ён здзівіўся.— Ведаеш, на вайне не раяць пісаць дзённік.

— Ты думаеш, могуць забараніць? — устрывожыўся я, верачы, што Сеня ўсё ведае.

Ён падумаў.

— Не, забараняць бадай што не будуць. Але навошта табе? Я не люблю дзённікаў. У іх хлусяць...

Я сціснуў яго калена і горача зашаптаў:

— Не, я напішу праўду. Напішу ўсё, што перажыў, што перадумаў... Я пішу для Сашы, а ёй я ніколі не хлусіў. Я хачу, каб тады, калі мяне не стане...

— Пеця! Выкінь з галавы дурныя думкі.

— Ты думаеш, мы выйдзем жывыя з гэтага пекла?

— Ніхто не ведае, хто загіне, хто будзе жыць. Але ўсе мы павінны думаць пра жыццё. Інакш які сэнс у змаганні? Каб перамагчы...

— Усё гэта правільныя словы, Сеня. Але ў мяне прадчуванне...

— Глупства. У цябе проста страх. Думаеш, у мяне, у другіх хлопцаў няма яго? Але мне здаецца, што я пачынаю перамагаць гэтае агіднае пачуццё. Пасля сённяшняга бою...

— Бой! Які гэта бой! Пасля яго я адчуваю сябе яшчэ горш! Як мы стралялі! Ганьба!

Ён усміхнуўся:

— Праўда, стралялі пагана. Але, кажуць, першы блінец заўсёды комам...

— Блінец! — пачаў злавацца я.— У каго ты набраўся такой разважлівасці? Такія «блінцы» нам вылезуць бокам... Заўтра, можа, праз гадзіну... Наляцяць зноў... і расстраляюць такіх зенітчыкаў з кулямётаў.

Мы адначасова паглядзелі на неба. Колькі часу яно будзе чыстае?

Сеня ўздыхнуў і задумліва сказаў:

— Але... За восем месяцаў мы добра навучыліся хадзіць на лыжах, класічна казыраць... І толькі страляць з асноўнай сваёй зброі не навучыліся. Усе гэтыя трэніроўкі без баявой стральбы... чаго яны варты? А Кідала нават сілуэтаў не ведае. Даказвае, што гэта былі «Ю-88».

— Пясоцкі! Вы зноў за сваё. Не навучылі вас? — нечакана прагучаў з нішы голас сяржанта Тарных.— Шапятовіч, спаць! Развінціліся!

Не ўсе, значыцца, спяць! Сеня ўздрыгнуў, пабялеў і, падняўшыся, панура пасунуўся да свайго дальнамера. У мяне балюча сціснулася сэрца. Стала вельмі шкада гэтага добрага, разумнага хлопца. «Зноў за сваё». За што — сваё? Што кепскае ён сказаў? Чаму часам невукі, выскачкі, салдафоны ў большай пашане, чым такія, як Сеня? Колькі ён перажыў за гэтыя тры дні, мой друг! Больш, чым усе мы. І не скардзіцца, не ные, не кідаецца ў паніку, а мужна трывае. Мне хочацца напісаць пра ўсё, што здарылася з ім. Магчыма, запісы мае праз Сашу дойдуць да яго маці.

Пачну спачатку.

Мы так стамляліся ад заняткаў, работы, вучэбных трывог, што нядзелі, калі можна трохі адпачыць, лішнюю гадзіну паспаць, чакалі, як найвялікшага свята. Але для мяне тая нядзеля не была радасная: за чытанне Горкага на палітвучобе я атрымаў тры нечарговыя нарады і мусіў дняваліць.

Ішоў дождж. Другія суткі нізкія хмары ахутвалі вяршыні навакольных сопак і бесперапынна сеялі густы дождж. Накінуўшы плашч-палатку, я хадзіў па лінейцы, якую сам толькі што старанна падмёў. Лінейка цягнецца ўздоўж зямлянак, выкапаных на схіле пясчанага ўзгорка, на якім віднеюцца накрытыя чахламі гарматы. З другога боку, унізе, скача па каменнях вясёлы гаманлівы ручай. Навокал пуста і ціха. Пасля снедання мае сябры «дабіраюць» тое, што недаспалі за тыдзень, ці пішуць пісьмы. Мне было крыху зайздросна: хацелася і паспаць і напісаць пісьмо. Але разам з тым было прыемна хадзіць у адзіноце і думаць пад шум дажджу і ручая — ніхто не перашкаджаў. Я думаў пра Сашу, «пісаў» чарговае пісьмо, шукаючы самыя пяшчотныя словы.

У дванаццаць гадзін у пасёлку, кіламетры за два ад нас, загаварыла радыё. Слоў нельга было разабраць, але мне здалося па тону, што перадаюць нешта важнае. Захацелася паслухаць. Рэпрадуктары былі ў ленінскім кутку і ў афіцэрскай зямлянцы. У кутку, я ведаў, палітрук і рэдкалегія выпускаюць насценную газету, дзе, напэўна, распісваюць і мяне — мае нарады. Я не любіў малодшага палітрука Сідарэнку. Нічога кепскага ён мне не зрабіў і ўвогуле, здаецца, чалавек неблагі, мяккі па характару, гаманкі, просты. Але не падабаліся яго жарты. Мяне, напрыклад, ён даволі часта насмешліва называў «жанацік» і колькі разоў з непрыемнай цікавасцю распытваў, як я жаніўся, якая ў мяне жонка. Таму я не пайшоў у ленінскі куток, а зазірнуў у камандзірскую зямлянку, каб сказаць лейтэнанту Купанаву, што перадаюць нешта важнае, і паслухаць самому. Але камандзір батарэі смачна і бестурботна спаў, па-дзіцячы раскінуўшы рукі.

Я ціха ўключыў радыё і... аслупянеў. Вайна! Я адразу зразумеў гэта і страшэнна разгубіўся, не ведаючы, што павінен рабіць як днявальны, як баец, як чалавек, нарэшце, грамадзянін сваёй Радзімы. Помню, я падумаў пра Сашу, і мне зрабілася так балюча, быццам у той міг я назаўсёды страціў яе, самага дарагога чалавека.

Лейтэнант расплюшчыў вочы, глянуў на мяне і... павярнуўся на другі бок, напэўна, яму здалося, што ён нешта сніць.

Тады я крыкнуў:

— Таварыш лейтэнант! Вайна!

Ён падхапіўся, як па трывозе, пачаў імкліва адзявацца. Вокамгненна нацягнуў штаны, абуў боты і раптам застыў, усунуўшы руку не ў той рукаў гімнасцёркі. Дзіўна збялела яго ніжняя губа, калі ён пачуў заключныя словы Старшыні Саўнаркома. Упершыню ўбачыў я таго, каго мы з павагай называлі Напалеонам, разгубленым і спалоханым.

— Што рабіць, таварыш лейтэнант?

— Што рабіць? — Ён апусціў гімнасцёрку і знясілена сеў на ложак.— Што рабіць? — Ён, як і я, не ведаў, што рабіць у гэтую страшную хвіліну, і, можа, цэлую мінуту сядзеў нерухома са скамянелым тварам. Потым схамянуўся, успомніў свае абавязкі і крыкнуў:

— Трывога!

— Трывога! Тры-ы-во-ога! — не сваім голасам падхапіў я, выскачыўшы з зямлянкі.

Віктар Вальноў, які не спаў і выбег першы, незадаволена кінуў мне:

— Звар'яцелі вы з Напалеонам. Якая трывога ў такі дождж? Тры дні матчастку будзеш чысціць.

Я не паспеў яму адказаць — трэба было хутчэй скідаць з гарматы чахол.

— Другое гатова! Першае гатова! Прыбор гатоў! — дакладвалі адзін за адным камандзіры, як заўсёды, весела, задаволеныя спрытнасцю сваіх разлікаў, якія навучыліся выбягаць па трывозе за адну мінуту.

Камбат стаяў пасярод пазіцыі ў адной гімнасцёрцы і ўглядаўся на захад, у заслону дажджу, чакаючы ворага. Крыкнуў сувязістам:

— Запытайце гукаўлоўнікі!

Не, шуму матораў не было. Шумеў дождж. Потым Купанава паклікалі да тэлефона.

Я сказаў сваім сябрам па разліку:

— Вайна, хлопцы.

Паверылі не адразу.

На мітынгу, на які нас склікалі пасля таго, як камандзір і палітрук пагутарылі з камандным пунктам дывізіёна, Сідарэнка, заікаючыся больш, чым звычайна, паведаміў, што ў чатыры гадзіны раніцы фашысцкая Германія вераломна напала на Савецкі Саюз. Мяне ўразіла гэтае паведамленне: восем гадзін ідзе вайна, а мы нічога не ведалі, баявая батарэя спакойна, па-мірнаму адпачывала. Чаму? Мы ж ведаем, што недалёка ад нас, у Нарвегіі, таксама немцы і яны не могуць не выступіць. Думка такая, відаць, шмат каго з курсантаў устрывожыла. А выказаў яе шчыры, непасрэдны Сеня Пясоцкі. Калі палітрук скончыў сваю прамову, ён спытаў:

— Таварыш малодшы палітрук, чым растлумачыць, што мы так позна падняліся па ваеннай трывозе? У век радыё...

Сідарэнка сумеўся, не ведаючы, што адказаць, глянуў на камандзіра батарэі і загадаў:

— Та-т-та-аварыш П-пясоцкі, т-трымайце я-язык з-за-за зубамі.

Першым выступіў зампаліт Сцяпан Кідала, таксама мой друг, але не па душэўнай блізкасці, як Сеня, а па абставінах. Чатыры гады мы вучыліся ў адным тэхнікуме, у адной групе, нават нейкі час жылі на адной кватэры. Сцяпан гады на два старэйшы за мяне. Асаблівымі здольнасцямі ён не вызначаўся, але быў надзвычай настойлівы ў дасягненні мэты, і таму заўсёды актыўны. У тэхнікуме ён узначальваў прафком. Тут, у арміі, таксама хутка пайшоў угору: праз паўгода начапіў трохкутнікі зампаліта. Ён гаварыў так, быццам перад ім была не батарэя, а сама меней — дывізія. Ажно недзе за Туломай, у гарах, адбівалася рэха яго басавітага голасу.

— ...Фашысты дрэнна ведаюць магутнасць нашай Чырвонай Арміі. Хутка яны пазнаюць яе! Не пройдзе і тыдня, як мы будзем маршыраваць па вуліцах Берліна! Вораг будзе разбіты на яго ж зямлі!..

Потым ён гаварыў яшчэ, што няхай толькі з'явяцца фашысцкія самалёты тут, над «паўночнай крэпасцю», усе адразу будуць збіты трапным агнём нашых батарэй. (Я ўспамінаю цяпер, пасля налёту, яго словы, і мая непрыязнасць да гэтага пустаслова расце.)

Усе мы цвёрда ўпэўнены, што няма ў свеце больш магутнай арміі, чым наша, і дагэтуль верым, што вайна будзе перанесена на чужую зямлю — у Польшчу і далей — у Германію, што нашы часці не адступяць ні на крок ад мяжы. Але залішне крыклівая, занадта ўжо самаўпэўненая прамова Кідалы была мне непрыемная. Навошта гэтак крычаць у такі момант? Хіба такія словы патрэбны людзям, каб узняць баявы дух? Нялёгка знайсці іх, патрэбныя словы!

Відаць, гэта адчувалі многія, а таму выступалі неахвотна і ў сваіх прамовах паўтараліся.

Палітрук звярнуўся да Сені — ён быў выдатнік вучобы:

— Вы, Пясоцкі, скажаце?

Сеня адмовіўся. Можа, таму, што яму толькі што загадалі «трымаць язык за зубамі».

Пасля мітынгу мне захацелася пагутарыць з Сенем, з іншымі хлопцамі, пачуць, што думаюць, што адчуваюць яны. Магчыма, гэта было хітрае жаданне: праверыць свае ўласныя думкі, адчуванні. Разлікі стаялі нагатове каля гармат і прыбораў, хоць наўрад ці была такая патрэба: дождж і хма-

ры засцілалі ўсё наваколле і самалёты ў такое надвор'е не маглі ўзляцець. Я папрасіўся ў камандзіра схадзіць да дальнамера. Хлопцы сядзелі пад чахлом, маўклівыя, панурыя. Я сеў побач, абдумваючы, з чаго пачаць гаворку, каб прымусіць іх выказацца шчыра пра ўсё. Спытаў у Сені, чаму ён не выступіў.

— А што гаварыць? — неяк ажно ўстрапянуўся ён.— Крычаць, як Кідала? Абяцаць праз тыдзень Берлін узяць? Нельга забываць, што ў немцаў двухгадовы вопыт вайны, лепшая авіяцыя... танкі... Вайна з такім ворагам будзе нялёгкая! Страшная вайна будзе, Пеця, вельмі страшная. Пра гэта трэба было сказаць...

— Значыцца, вы не верыце ў перамогу, курсант Пясоцкі? — раптам прагучаў над нашымі галовамі голас Кідалы. Ён стаяў на брустверы неглыбокага дальнамернага катлавана ў накідцы, з-пад капюшона блішчалі яго злосныя вочы.

Сеня не разгубіўся ад такой нечаканасці і смела адказаў:

— Я веру ў перамогу! Але крычаць, не ведаючы ворага, што мы закідаем яго шапкамі, каму гэта патрэбна? Каб заспакоіць нас? А я не хачу быць спакойным у такі час! Не жадаю!..

— Ах, не жадаеш?

— Не! Я хачу быць гатовым да ўсяго, самага страшнага!

— Да чаго — страшнага?

— Да ўсяго, што можа быць на вайне.

— Ты выдаеш сябе за вялікага разумніка. Пабачым, адкуль у цябе такі розум!

— Пакінь, Сцяпан! Не рабі з сябе начальніка! Не такі сёння дзень, каб сварыцца,— не стрываў і ўмяшаўся я, карыстаючыся правам друга.

— А ты чаму тут, падпявала? Тваё месца каля гарматы! Бягом, марш!

Я аслупянеў. Усяго я чакаў ад Кідалы, але такога... Не, я кепска ведаў гэтага чалавека.

Праз нейкую гадзіну на закрытым камсамольскім сходзе абмяркоўвалі пытанне: «Аб паражэнчым настроі ў курсанта Пясоцкага».

— У той час, калі ўся наша вялікая Радзіма, увесь савецкі народ узнімаецца, каб даць адпор нахабнаму ворагу, у

нашых радах, таварышы, знайшоўся чалавек, які сумняваецца ў магутнасці Чырвонай Арміі...

— Няпраўда! Я не сумняваюся! — запярэчыў збялелы Сеня.

Усе паглядзелі на яго са здзіўленнем: перапыняць палітрука — парушэнне дысцыпліны, за гэта можна атрымаць яшчэ большую кару.

— К-курсант П-пясоцкі! — Сідарэнка губляў думку, калі яму перашкаджалі, а таму доўга маўчаў — нервова хадзіў перад камсамольцамі, якія зноў панурылі свае галовы, цёр далоні. Нарэшце сказаў, але ўжо не спакойна-інфармацыйна, а з гнеўным абурэннем: — Б-бачыце, гэты чалавек хоча падарваць баяздольнасць батарэі. Распускае панічныя чуткі... Усхваляе фашысцкую тэхніку... авіяцыю...

Я сядзеў крыху збоку і бачыў твары многіх курсантаў, нашых з Сенем сяброў, з якімі мы восем месяцаў разам спалі і елі, займаліся і адпачывалі, чыталі адны кнігі, абмяркоўвалі адны падзеі. Усе яны раней паважалі Сеню за яго веды і сціпласць. Але цяпер — я чытаў гэта на іх тварах — амаль усе верылі ў словы палітрука.

У такі час, праз нейкія дзве гадзіны пасля паведамлення аб вайне, калі гарэла сэрца і апаноўваў страх, магчыма, што і я паверыў бы, каб абвінавацілі каго іншага. Але Сеню я ведаў, як ніхто, я чуў, што ён сказаў, як сказаў. Якія ж гэта панічныя чуткі? Ён сказаў простыя разважлівыя словы, ад якіх мне зусім не страшна, а можа, нават стала спакайней. Але іншыя, відаць, паверылі, што іменна ён, юнак з інтэлігентнай сям'і, «мамчын сынок», «кніжнік», як яго называў той жа Кідала, мог стаць паражэнцам. Я не асуджаю сваіх таварышаў. Але мне зрабілася холадна, калі я прачытаў у іх вачах знявагу, нават гнеў да Сені.

Кідала, калі выступіў, спачатку даволі дакладна, амаль слова ў слова, перадаў нашу размову, якую падслухаў, а потым зноў-такі крыкліва пачаў рабіць свае вывады:

— ...Цяпер, таварышы, нам зразумела, чаму Пясоцкі не пажадаў выступіць на мітынгу... Што мог сказаць чалавек, які не верыць у перамогу? Я больш скажу... Нам варта спытаць: чаму ў Пясоцкага такая цікавасць да ўсяго нямецкага? Мы ўсе вучыліся, але хто з нас ведае нямецкую мову так,

як ён? Ніхто. А ўдумайцеся ў такі факт... Яшчэ да таго, як мы пачалі вывучаць сілуэты, ён адзін з усіх курсантаў ведаў маркі нямецкіх самалётаў, назвы лінкораў. Адкуль? А ў каго была патрэба, скажыце мне, запамінаць, хто ўваходзіць у гітлераўскі ўрад? Мне агідна запамінаць іх прозвішчы. А Пясоцкі ведае кожнага з гэтых бандытаў...

Я жахнуўся: страшэннае абвінавачанне вынікала з яго даволі празрыстых намёкаў. І я не вытрымаў — злосна перапыніў Кідалу:

— Як табе не брыдка, Сцяпан! Ты абвінавачваеш Пясоцкага за тое, што ён чытаў газеты. Ды ты ж услаўляеш невуцтва! А нам усім сорамна было, калі ты, зампаліт, не ведаў, хто прэм'ер-міністр Англіі. І ты ставіш гэта сабе ў заслугу? Ганьба!

Кідала глядзеў на мяне з нянавісцю, каб мог, здавалася, з'еў бы. Твар яго, звычайна чырвоны, задаволены, спапялеў. Ён паглядзеў на палітрука так, быццам загадваў, каб той сунуў мяне. І Сідарэнка закрычаў:

— Курсант Шапятовіч! Маўчаць! З кім вы так размаўляеце? Як паводзіце сябе? Для вас зампаліт Кідала — «таварыш зампаліт», а не «Сцяпан». І каб я не чуў такога тыкання!

О, каб гэта было не ў армейскіх умовах, а дзе-небудзь у нашым тэхнікуме, я сказаў бы, хто для мяне гэты балбатун! Але тут я мусіў маўчаць. Сідарэнка «перанёс агонь» на мяне: успомніў мае нарады, мае спрэчкі з малодшымі камандзірамі.

Ды раптам выступіў Купанаў. Я ўвесь час сачыў за ім і чакаў, што ён, разумны і стрыманы, сваім аўтарытэтам камандзіра спыніць гэтую ганебную камедыю. І сапраўды ён сказаў:

— Думаю, што курсант Кідала перабольшвае.— Я радасна ўстрапянуўся, бо словам «курсант» камбат шмат што ставіў на сваё месца, а ў першую чаргу — гэтага выскачку: ён такі ж курсант, як усе, і мы маем поўнае права звяртацца да яго, як да роўнага.— Нельга вінаваціць чалавека, што ў школе ён лепш вучыў нямецкую мову, чым мы з вамі, Кідала. Недарэчна абвінавачваць байца Чырвонай Арміі за тое, што ён акуратна чытае газеты... больш уважліва, чым многія іншыя.

І ўсё, больш ні слова. Мяне, безумоўна, расчаравала выступленне камандзіра. Але большасць камсамольцаў уздыхнулі з палёгкай, бо на ўсіх цяжкае ўражанне зрабіла выступленне Кідалы, які сваімі дурнымі закідамі па сутнасці рабіў з Сені фашысцкага агента. Купанаў адмёў гэтую лухту. Але чаму ён нічога не сказаў пра паражэнчы настрой? Няўжо ён верыць, што такі настрой мог з'явіцца?

Па прапанове Сідарэнкі большасцю галасоў (мяне ўсцешыла, што прагаласавалі не ўсе) Сямёна Пясоцкага выключылі з камсамола. Мне ўляпілі вымову. Завошта? Я заўсёды быў сумленны і актыўны камсамолец. Праўда, я не надта перажываў з-за вымовы. Што яна значыць у параўнанні з тым, што чакае нас наперадзе? Але Сеню шкада, хацелася суцешыць яго, падбадзёрыць. Я зноў пайшоў да дальнамера. Убачыў, як адзінока сядзіць ён у катлаване, унурыўшы галаву, і ўсе словы, якія я падрыхтаваў, здаліся мне нікчэмнымі, непатрэбнымі, нават абразлівымі. Я моўчкі сеў побач.

Ён глянуў на мяне і прашаптаў:

— Гэта страшней за смерць, Пеця...

Зноў-такі я не знайшоў, што адказаць.

...Дзіўна раскрываюцца душы людзей! Пасля таго як сяржант разагнаў нас з Сенем, я, падпарадкаваўшыся загаду, заснуў. Прачнуўся і здзівіўся: была позняя раніца, я праспаў добрых гадзін пяць. Але яшчэ больш здзівіў мяне сяржант. Ён лагодна ўсміхнуўся і проста, па-сяброўску спытаў:

— Выспаўся? Суп твой вунь у кацялку... у нішы.

Сяржант Тарных быў бязлітасны камандзір, у час вучобы ён не даваў нам хвіліны адпачынку, і мы не любілі яго. Ён ніколі не дазваляў сабе фамільярнасці ў адносінах з курсантамі. І раптам такі клопат — даў выспацца, не разбудзіў нават на снеданне, загадаў прынесці суп... І сяброўскае ты... Дзіва!

Зноў нахмарыла. Імжыць дождж. Слава табе, неба Поўначы, што ты так часта пакрываешся хмарамі! Здаецца, з учарашняга дня я моцна палюбіў такое надвор'е. Ды ці я адзін? Праўда, ніхто не можа даць гарантыі, што яны не прыляцяць і ў дождж. Але пакуль што іх няма, пакуль што мы маем перадышку.

Камандзір батарэі сабраў каля першай гарматы ўсіх зараджаючых і трэніруе да сёмага поту, не можа даравацъ заклінення. Мне шкада хлопцаў: ім і ў час вучобы даставалася больш, чым іншым нумарам, і цяпер таксама. А ці так ужо вінаваты яны? У іх дрыжалі рукі, як і ва ўсіх нас, як, напэўна, і ў самога Купанава... Я думаю, што наш разумны камбат робіць не вельмі разумна: а калі налёт — ці здолеюць стомленыя людзі зараджаць лепш?

Хлопцы сабралі грошы, усе, у каго якія былі, упрасілі сяржанта, і — дзіва! — той дазволіў, каб самы спрытны і ўвішны, устаноўшчык трубкі масквіч Раман Войтаў падскочыў на пасёлак у краму. Ён прынёс адтуль цэлы рэчавы мяшок папярос, самых дарагіх, якіх ніхто, бадай, акрамя Рамана, з нашага разліку яшчэ ніколі не курыў, нават сяржант. Цяпер хлопцы ляжаць за каменем, з асалодай пускаюць дым і бяскрыўдна лаюць мяне дурнем за тое, што адмовіўся ад прапановы пачаць курыць.

— Не хоча — не трэба, хай беражэ сваё дарагое здароўе.

— Дурань! Не п'е, не курыць... Памрэ — пашкадуе.

Памрэ... Навошта лішні раз гаварыць пра смерць?

Я стараюся не слухаць іх размовы, залажу глыбей у нішу і пішу. Пішу з ліхаманкавай хуткасцю. Але адчуваю, што не ўпраўлюся запісаць усё, што мінулая ноч і гэтая хмарная раніца — шчаслівая для мяне выпадковасць, якая, магчыма, ніколі не паўторыцца. Трэба выкарыстаць цалкам гэтыя вольныя хвіліны. Якія падзеі, якія думкі і перажыванні я забыўся занесці ў гэты сшытак? Чатыры дні здаюцца вечнасцю. Божа мой, калі гэта на зямлі быў апошні мірны дзень, той суботні вечар, калі мы ў сваім чырвонаармейскім кутку праводзілі сход, прысвечаны пяцігоддзю з дня смерці Максіма Горкага! Я чытаў на памяць урывак з «Чалавека».

«Человек! Точно солнце рождается в груди моей, и в ярком свете его медленно шествует — вперед! и — выше! — трагически прекрасный Человек!»

Хораша я прачытаў гэтыя і яшчэ многія цудоўныя словы, сам заварожаны іх музыкай, іх глыбокім сэнсам. Хлопцы апладзіравалі так, што мне зрабілася няёмка. Купанаў сядзеў, з ухвалай ківаў галавой і неяк дзіўна ўсміхаўся. А Сідарэнка сказаў пасля:

— Вы, Шапятовіч, дрэнна разумееце Горкага.

Мяне гэта здзівіла і пакрыўдзіла. Я не разумею Горкага?

— А як вы разумееце? — спытаў я.

Ён не адказаў, і я дагэтуль не ведаю, што не спадабалася палітруку ў маім чытанні. І вось цяпер зноў загучалі ў маёй галаве горкаўскія словы. Я не толькі чую іх, але адчуваю, нібы яны матэрыяльныя, бачу перад сабой і бясстрашную велічную Мысль, і Любоў, і Нянавісць... і Надзею!.. Чаму «палахлівае бяссілле Надзеі»? А я хачу мець Надзею! І мая Надзея не можа мне спяваць аб радасцях спакою, не можа быць у саюзе з Хлуснёй і штурхаць у ціну салодкай Лянoты. Не! Мая Надзея іншая! А што сказана пра страх? Якое месца ў Чалавеку адводзіць яму вялікі пісьменнік? Я натужліва ўспамінаю... Няўжо пра страх нічога няма? Не, вось — «страх смерці ўладна гоніць Чалавека ў цямніцу Веры...». Не, немагчыма, нельга запісаць палёт думак. Яны — як маланкі, ахапілі адразу ўсё. А пішу я марудна, страшэнна марудна, хоць, магчыма, ніводзін чалавек у звычайных умовах не мог бы пісаць хутчэй... З усяго хаосу думак я зразумеў толькі адно: інакш, больш глыбока і цвёрда, сэрцам прымаю я тыя словы, якія чатыры дні назад ■ тэатральнай узнёсласцю чытаў, ■ патаемным самалюбным жаданнем бліснуць перад сябрамі, якія ведаюць Горкага, і здзівіць тых, хто не чуў, не чытаў, не помніў «Чалавека». Шмат за якія пачуцці мне зрабілася сорамна і больш за ўсё за страх. Я напісаў гэтае слова з вялікай літары, але тут жа закрэсліў яе: не, не мае права агіднае пачуццё на такую пашану! Але мне ніколі не будзе сорамна за маю Любоў! Ніколі!

Здаецца, я хачу спрачацца з Горкім, папраўляць яго. Наіўна!

У катлаван зайшоў камандзір гарматы, убачыў мяне, крыва ўсміхнуўся:

— Раман пішаш?

Я сумеўся:

— Не. Пісьмо. Жонцы.

— Такое доўгае пісьмо? — здзівіўся ён. — Глядзі, каб лішняга не напісаў. Цяпер ваенная цэнзура будзе правяраць.

— Я ведаю.

— Канчай сваё пісьмо, ды будзем трэніраваць устаноўшчыкаў трубкі.

Ну вось, перадышка скончана. А я сапраўды хацеў напісаць пісьмо Сашы. Я ведаю, з якой нецярплівасцю яна, гаротная, чакае маіх пісем.

Вечар 26 чэрвеня

Пасля бамбёжкі не працуе радыё, і мы ўсю раніцу не давалі спакою сувязістам, каб яны папрасілі ў сваіх калег на камандным пункце дывізіёна ўчарашнюю зводку. Выказвалі здагадкі. Яны былі розныя: занадта аптымістычныя і памяркоўныя, ура-крыклівыя і стрыманыя, але і ў першым і ў другім выпадку крыніцай іх было пазаўчарашняе паведамленне аб тым, што «на Шаўляйскім і Рава-Рускім напрамках праціўнік, які ўклініўся з раніцы ў нашу тэрыторыю, у другой палавіне дня контратакамі нашых войск быў разбіты і адкінуты за дзяржаўную граніцу». Помнілі толькі гэта і забывалі на другую частку зводкі, дзе гаварылася, што ворагу ўдалося заняць Ломжу, Брэст. Вельмі хацелася пачуць, што нашы войскі развіваюць наступленне за мяжой, няхай сабе хоць на адным напрамку.

У абедзенны час, калі разлікі па чарзе хадзілі ў сталоўку, мы з Сенем зноў сустрэліся каля прыбора. Мяне цягнула да яго шчыра пагутарыць, пачуць разумныя, аргументаваныя меркаванні. Але пасля таго, што здарылася, прыходзілася азірацца — ці няма паблізу Кідалы. Размова не ладзілася. Мы стаялі і моўчкі сачылі, як разрываюцца хмары аб сосны на сопках.

— Праясняецца,— сказаў я.

— Ага. К вечару будзе лётная пагода,— зазначыў Сеня.

Людзі, напэўна, ніколі не праяўлялі такой увагі да неба, якую цяпер праяўляем мы. Ды ці толькі мы адны? Не, усе цяпер глядзяць на неба. Не для таго, каб палюбавацца яго прыгажосцю. Знікла хараство блакіту. Больш даспадобы нізкія свінцовыя хмары. Помню, я думаў пра тое, які дзень там, у нас, над Дняпром. Няўжо і Саша з такім жа страхам узіраецца ў неба? Безумоўна. Балюча думаць пра гэта.

З зямлянкі вылез сувязіст Мельнікаў. Убачыў нас, азірнуўся, нясмела наблізіўся, шэптам спытаў:

— Слухай, Пясоцкі, ты ўсё ведаеш... Скажы, Кобрын і Вільня далёка ад граніцы?

— А што? — насцеражыўся Сеня; ён стаў падазрона-недаверлівы.

— Ідуць баі за гэтыя гарады.

— Хлусіш! — вырвалася ў мяне. Я добра ведаў Кобрын, бо жыў там, калі ездзіў на пераддыпломную практыку. І ў Вільню ездзіў. Я праехаў па многіх дарогах, што вядуць да дзяржаўнай граніцы.

— Я зводку прыняў. Толькі палітрук загадаў нікому не паказваць пакуль што.

— Дай, — сказаў Сеня такім настойлівым голасам, што асцярожны Мельнікаў дастаў з кішэні невялічкую пакамечаную паперку, разгарнуў, але не выпускаў з рук. Сеня зірнуў у яе, і я ўбачыў, як перасмыкнуліся яго вусны, змяніўся ён з твару. Моўчкі адышоў ад Мельнікава. Я рушыў за ім.

— Што там, Сеня?

Ён спыніўся, паглядзеў на мяне і сказаў ціха, але з вялікім болем і роспаччу:

— Пеця! Мы з табой маленькія стратэгі. І ты ведаеш, я не панікёр, не баязлівец, дарэмна на мяне… Але мне балюча… Там — адступаюць… Здаюць гарады… Нашы гарады!

Калі зводка была перапісана і прачытана ва ўсіх разліках, хлопцы больш не складалі стратэгічных планаў. Чаму нашы адступаюць? Чаму на трэці дзень вайны ідуць баі за Гродна, Кобрын, Вільню, Каўнас?

Нехта з хлопцаў выказаў думку, што гэта стратэгічны манеўр камандавання, што нашы адступяць не далей, як да старой граніцы, дзе зроблены ўмацаванні куды больш трывалыя, чым лініі Мажыно і Зігфрыда.

Хачу верыць у гэта!

Неба праяснілася, і мы стралялі па разведчыку. Ён ішоў на вышыні трох кіламетраў, па курсу з поўдня на поўнач, відаць, аглядаў чыгунку. Ён як бы знарок даваў самыя выгодныя даныя для нашых прыбораў.

Страх, агідны, ганебны страх, які я перажыў у першым баі, знік, калі я ўбачыў, што гэта ўсяго-наўсяго разведчык. Але ў чаканні залпа ўсё адно дрыжаў, напружана звінеў у целе кожны мускул, кожны нерв. Дрыжаў ад злосці, ад не-

цярплівасці, ад моцнага жадання збіць сцярвятніка, што нясе смерць. О, як мне хацелася збіць яго! Быццам ад гэтага залежаў вынік усёй вайны. Я зноў верыў у нашы складаныя і дакладныя прыборы, якія мы дасканала вывучылі. Нельга не збіць, калі ён так зручна ідзе!

І вось ужо знаёмае:

— Ёсць сумяшчэнне!

Застракаталі стрэлкі сінхроннай перадачы. Я забываюся на ўсё, увесь напружваюся, каб дакладней сумясціць зялёную і чырвоную стрэлачкі на прыёмніку азімута. Залп. Сапраўдны залп, чуць-чуць адстала адна гармата. Другі залп, трэці... Добра страляюць хлопцы! Малайцы! Няма ні заклінення, ні адставання, ні лішняга шуму. Адзін трэці нумар крычыць што мае сілы — чытае трубку.

Адрываю вочы ад стрэлак, кідаю позірк у неба. Прыгожыя чорныя букеты разрываў вісяць у ясным блакіце. Дзе ж самалёт? Няўжо ён не падае яшчэ? Не, грымяць залпы... Стукаюць аб лапы гільзы.

Нарэшце — стоп! Усё адразу сціхла. «Збілі! Збілі!» — хацелася закрычаць мне ад радасці. Я саскочыў з сядзення, глянуў у неба... Што гэта? Фашыст аддаляўся ад нас роўна, спакойна, на той жа вышыні, па тым жа курсе. Ён быццам смяяўся з нас, не звяртаючы ўвагі на разрывы, што цягнуліся па яго следу.

Хацелася плакаць ад роспачы. Хто ж вінаваты? Гарматы, прыборы ці мы, людзі, наша няўменне? Няўжо гэта будзе паўтарацца кожны раз?

Сяржант наш злосна закрычаў на кагосьці. Ён злаваў. Я, ён, Паўлюк — усе мы саромеліся глядзець адзін аднаму ў вочы, саромеліся больш, чым пасля таго першага бою, калі, як суслікі, схаваліся ў норы. Тады нас бамбілі, абстрэльвалі... А цяпер нішто не перашкаджала збіць яго...

Нехта з гарматнікаў абвінаваціў прыборшчыкаў: трапнасць агню залежыць ад іх, а яны баяцца, у іх дрыжаць рукі і яны робяць памылкі ў вылічэннях, якія паступаюць на гарматы.

Абураны, я першы крыкнуў ім:

— Халтуршчыкі! Партачы! Саломай вас трэба карміць за такую работу!

А на дальнамеры і прыборы — мае лепшыя сябры.

Напалеон чамусьці ўзлаваўся за мой папрок прыборшчыкам, выклікаў да сябе і моцна «намыліў» галаву. Сідарэнка пры гэтым падгравоў камбата, напамінаў усе мае старыя грахі. Я чакаў, што ён скажа пра маю падтрымку Пясоцкага. О, як бы я адказаў яму, нагадаўшы ўчарашнюю зводку! Але гэты «грэх» ён не ўспомніў.

27 чэрвеня

З'явіўся Мінскі напрамак. Мінскі! Нічога не разумею. Што ж там адбываецца? Хлопцы надаюць нейкае значэнне паведамленню аб пераходзе да нас нямецкага салдата, заяве палоннага лётчыка аб тым, што ваяваць з рускімі яны не жадаюць і робяць з гэтага аптымістычныя вывады, спадзяюцца на рэвалюцыю ў Германіі. А я чамусьці не маю гэтай надзеі. Я не веру перабежчыкам і палонным! Усе яны хлусяць, ратуючы сваю шкуру. Мяне больш трывожыць паведамленне аб тым, што вораг скідае ў Беларусі парашутыстаў. Ледзянее кроў, калі я думаю, што гэтыя адборныя фашысцкія галаварэзы могуць апынуцца там, дзе жыве Саша. Што яна будзе рабіць адна, бездапаможная, магчыма, яшчэ хворая, з дзіцем на руках? І наогул, дзе яна цяпер? Што з ёй? Адгукніся, мой друг, маё каханне, і мне будзе лягчэй, я ўсё перамагу тады!

Зноў двойчы стралялі, і зноў паляцелі яны непакараныя, паказаўшы нам хвасты са свастыкай. Я пачынаю страчваць веру ў зброю, пра якую нам восем месяцаў расказвалі цуды.

29 чэрвеня

Па батарэі пранеслася чутка, што нас будуць пасылаць малодшымі камандзірамі ў іншыя батарэі, дывізіёны, нават некуды на поўдзень ці ўсход, дзе фарміруюцца новыя зенітныя часці. Зусім натуральна — нас вучылі, каб мы сталі камандзірамі, мы даўно ўжо рыхтаваліся да таго, што хутка раз'едземся ў розныя бакі. Хоць з гэтага краю зямлі можна паехаць толькі ў адзін бок — на поўдзень, калі меціць на ўвазе дальнюю паездку. І дзіўныя пачуцці апанавалі мяне: да

болю ў сэрцы захацелася паехаць туды, на поўдзень, дзе ідзе, шырыцца страшная бітва, якую нават цяжка асэнсаваць. Я ведаю, што маё жаданне недарэчнае, што я не маю права нават выказваць яго, бо кожны скажа: усюды савецкая зямля і ўсюды аднолькава важна абараняць яе ад ворагаў; ад поспехаў на адным напрамку залежыць поспех на іншых франтах і ўчастках. Усё гэта добра разумею. Але каб хто ведаў, як мне хочацца туды, на зямлю бацькоў, дзе кожная прыдарожная бярозка здавалася б маці, сястрой, жонкай і засланяла б ад куль, дзе не трэба зямлю дзяўбці ламамі, як гэты граніт, там яна такая мяккая, што любы гарматны катлаван можна выкапаць за гадзіну. Не, хіба ў гэтым справа — у зямлі і бярозах! Неадольнае жаданне апынуцца там вынікае з нечага больш глыбокага і моцнага. Можа, хочацца хутчэй прыйсці да свайго шчасця, да цябе, Саша, каб не траціць потым нават дня на дарогу? Жаданне гэтае мацней за страх смерці, які крыху заглух у апошнія дні, але ўсё яшчэ жыве ў сэрцы маім, у мозгу! Дзіўна! Выходзіць, што яно перамагло гэты страх. Яно мацней за яго, значна мацней, бо гэта — жаданне змагацца, жыць... А смерць? Хто ведае, дзе каго яна напаткае. Калі мне наканавана памерці як герою, а не як баязліўцу, я хацеў бы сустрэць яе, смерць, блізка ад цябе, Саша, засланяючы цябе сваімі грудзьмі. Можа, таму мне хочацца быць там, што дзесьці ў глыбіні душы цепліцца надзея, што я магу апынуцца блізка ад родных мясцін... Хоць колькі шансаў на такім фронце, у такім жудасным віры вайны?

На вайне ўсё робіцца імкліва. Ужо некаторых маіх сяброў выклікаюць да камандзіра батарэі. У нецярплівым чаканні моцна грукае сэрца і калоцяцца рукі. Ці паклічуць мяне?

Паклікалі.

Я старанна агледзеў сябе, паправіў рэмень, па ўсіх правілах зайшоў у зямлянку, казырнуў і адрапартаваў выразна і гучна:

— Таварыш лейтэнант! Курсант Шапятовіч па вашаму загаду з'явіўся!

Само сабой прыйшло жаданне паказаць сябе ў гэтую хвіліну з найлепшага боку, быццам ад гэтага мог залежаць мой лёс, маё назначэнне. Купанаў, маленькі, перацягнуты рамянямі, стоячы каля стала, адказыраў, як заўсёды,

прыгожа; ён ніколі не адказваў на прывітанне малодшых няўважліва, абыякавым узмахам рукі, як часам робяць іншыя афіцэры.

— Таварыш старшы лейтэнант,— пачуўся збоку голас Сідарэнкі.

Не адразу я зразумеў, што да чаго. Ды раптам позірк мой упаў на пятліцы Купанава, і я ўбачыў на іх трэці квадрацік. Не разгубіўся:

— Віншую вас...

— Дзякую, Шапятовіч,— проста адказаў камандзір батарэі і, наблізіўшыся, дакрануўся пальцам да незашпіленага гузіка на маёй гімнасцёрцы. Вось ліха, заўсёды гэтак здараецца: стараешся-стараешся, а ўсё адно што-небудзь ды не так. Зашпільваючы злашчасны гузік, я ажно спацеў. Камандзір тым часам сеў за стол, зазірнуў у нейкія паперы. Палітрук сядзеў за шахматным столікам збоку (усё гэта адбывалася ў нашым ленкутку) і расчэрчваў аркуш паперы — для нейкага спіса.

Я чакаў...

Пакутліва доўгая была паўмінута маўчання. Хутчэй бы пачуць прысуд, ад якога, здавалася, павінен залежаць мой лёс!

Купанаў узняў галаву, у вачах яго не было ні цеплыні, ні ўсмешкі. Я пахаладзеў, магчыма, ажно змяніўся з твару, бо паглядзеў на мяне камандзір надзвычай уважліва, пранікліва. Я даўно прыкмеціў, што, у процілегласць палітруку, Купанаў не любіць выпрабоўваць людзей псіхалагічна — глядзець у вочы, гаварыць паўнамёкамі, ставіць загадкавыя пытанні. Ён доўга часам думае, што сказаць, але потым гаворыць, быццам камандуе,— рашуча, коратка:

— Пойдзеце камандзірам гарматы на другую батарэю. Збірайцеся.

— Можаш камандаваць? — спытаў Сідарэнка, не адрываючыся ад паперы.— Дэмакрат ты вялікі, Шапятовіч.

Я не адказаў палітруку, не сказаў нават патрэбнага «слухаюся» камандзіру. Рушылася мая надзея, і я бяссільна схіліўся пад гэтым цяжарам. Невядома чаму спытаў:

— Адзін я?

— На гармату адзін.

Палітрук запытаў:

— Другі — на прыбор?

— І на дальнамер.

Я страпянуўся і папрасіў горача і шчыра:

— Пашліце Пясоцкага, таварыш старшы лейтэнант.

Камбат падняўся. Я чакаў, што ён закамандуе: «Кругом!» Але гэтага не здарылася.

Палітрук сказаў:

— Што гэта ў вас такая гарачая любоў да Пясоцкага?

— Ён разумны хлопец.

— Разумны хлопец не заўсёды можа быць разумным камандзірам. Сталасці ў яго не хапае. Мамчын сынок!

«Няпраўда»,— ледзь не вырвалася ў мяне, але я спахапіўся. Чакаў, што скажа камандзір. Ён прайшоў па зямлянцы, спыніўся каля сцяны, на якой вісела вялікая карта Савецкага Саюза. Хацелася б мне ведаць, што ён падумаў, калі затрымаў свой позірк на карце. Безумоўна, падумаў аб тым, што адбываецца там, на поўдні. Але якім чынам ён звязаў гэтую думку з Пясоцкім? Можа, меў намер паслаць яго туды? Наўрад. Туды будзе накіроўваць не ён. Яму, трэба думаць, далі загад адабраць для свайго дывізіёна лепшых курсантаў, недарма адбор ідзе ў першую чаргу.

Купанаў вярнуўся да стала і сказаў разважліва і як бы крыху няўпэўнена:

— Што ж, няхай будзе Пясоцкі. Пакліччце яго.

Паварочваючыся па форме, я ўбачыў, што палітрук глядзіць на камбата здзіўлена і незадаволена. Ён супраць. Я ўяўляю, якая ў іх адбылася размова. Але гэты маленькі чалавек з жалезнай воляй — наш Напалеон — ніколі не адступае ад сваіх рашэнняў.

Мы з Сенем едзем разам. Уласна кажучы, нікуды не едзем. Ехаць — гэта тое, пра што я марыў, на што спадзяваўся. Але што мае мары? Не заўсёды ад мяне залежыць іх здзяйсненне, я — салдат. Ды, нарэшце, ці не ўсё роўна, дзе ваяваць, біць фашыстаў! Я ўдзячны камбату. Упершыню з пачатку вайны адчуваю нейкую радасць. Радуюся не толькі таму, што побач са мной будзе мой лепшы друг. Рады за Сеню: яму вераць. Аб прыкрым выпадку першага дня вайны ўсе маўчаць, нават Сідарэнка не ўспомніў пра яго, сказаў пра іншае — што Пясоцкаму не хапае сталасці.

Сеня вярнуўся ад камбата ўвесь прасветлены, усхваляваны. Піша пісьмо маці. Трэба і мне напісаць Сашы. Пад такі настрой пісьмо будзе больш жыццярадаснае. Ці палучае яна мае пісьмы? Ад яе ўсё яшчэ прыходзяць даваенныя.

30 чэрвеня

Вось я і камандзір! І мне раптам чамусьці стала неяк па-інакшаму неспакойна і страшна. Прыгадаліся словы Сідарэнкі: «Можаш камандаваць?» Ніколі пра гэта я не думаў раней. А цяпер задумаўся: ці магу я камандаваць? Ці будуць слухацца мяне гэтыя незнаёмыя яшчэ мне людзі? Іх шэсць, і ўсе яны такія розныя, ёсць старэйшыя за мяне па гадах. Сустрэлі яны мяне не вельмі ветліва. Ці, можа, мне так здалося? Можа, таму яны былі хмурыя, незадаволеныя, што іх паднялі сярод ночы?

Мы прыехалі пасля дванаццаці, калі ўсе адпачывалі. Камандзір батарэі, старшы лейтэнант Сеўчанка, вясёлы і просты чалавек, з добрым сялянскім тварам, крыху пабітым воспай, спачатку прадставіў Віктара Вальнова разліку прыбора. Потым падвёў Сеню да дальнамера, але падначаленых яго не разбудзіў. Гэтых «арыстакратаў» усюды шкадуюць — у іх павінны быць зоркія, стэрэаскапічныя вочы.

Нарэшце звярнуўся да мяне:

— Пайшлі да тваіх арлоў. Лепшы разлік табе даю. Толькі трымаць у руках трэба, а то на галаву сядуць. Разгільдзяі вялікія...

Атэстацыя не вельмі каб высокая. Але мне спадабаўся камбат, яго прастата, жартаўлівасць. Гаворыць ён з прыкметным украінскім акцэнтам, і калі хоча вылаяцца, то гаворыць дзіўныя словы — «японскі бог». Наогул тут усё неяк прасцей, чым там, на нашай батарэі. Цяпер я пачынаю разумець, што, рыхтуючы нас на камандзіраў, там даволі моцна «закручвалі гайкі». Маленькі, чорны, як цыган, баец-дзяжурны далажыў, што разлік адпачывае.

— Разбудзі!

Падымаліся марудна, перапытвалі — навошта? Адзін нават брыкнуў дзяжурнага нагой.

Камбат узлаваўся і закрычаў сам:

— Пад'ём!

Вылецелі куляй, адкуль узяўся той спрыт.

— Разгільдзяі, японскі бог! Гэта вы мне і па трывозе будзеце так падымацца?

— Ну-у, таварыш старшы лейтэнант!.. Вы ж добра ведаеце, як мы падымаемся па трывозе,— пакрыўджана запярэчыў першы нумар, высокі, з тонкім, як у дзяўчыны, станам, цёмна-руды хмуры яфрэйтар.

Камбат не асёк яго, наадварот, усміхнуўся, але сказаў, як, напэўна, кажа часта:

— Разгаворчыкі, Муха! — і прадставіў мяне: — Вось вам новы камандзір — яфрэйтар Шапятовіч. А гэта ваш баявы намеснік — яфрэйтар Муха. Хоць падобны ён больш на асу, чым на муху.

Муха нешта забурчаў. Дзяжурны — шосты нумар — выскаліў надзвычай прыгожыя, белыя-белыя зубы. Гэты юнак валодае дзіўнай уласцівасцю — смяяцца бязгучна.

Іншыя разышліся гэтак жа панура і маўкліва, як і пастроіліся. Залезлі ў нішы. Я не ведаў, што сказаць ім, як, з чаго пачаць знаёмства. Ды, уласна кажучы, я і не меў права на доўгія размовы — камандзір батарэі загадаў спаць. Я адчуў сябе даволі няёмка — на мяне не звярталі ўвагі, як бы не прызнаючы за камандзіра. Толькі гэты Муха спытаў, не высоўваючыся з нішы:

— Камандзір, ты што скончыў?

— Як — што? Я з вучэбнай батарэі...

— Не. Да арміі.

— Аўтадарожны тэхнікум.

— А-а,— зняважліва працягнуў ён і, памаўчаўшы, паведаміў: — А наш камандзір ва універсітэце вучыўся...

«Чаму ж недавучыўся?» — хацелася спытаць з іроніяй, але я ўспомніў, што былы камандзір гэтай гарматы старшы сяржант Малашкін цяпер камандзір агнявога ўзвода, да таго ж я не бачыў яшчэ гэтага чалавека, і было б мне проста непрыстойна гаварыць так. Ды і не гэта закранула мяне ў словах Мухі, а яго зварот на ты. Ці не будзе гэта падрывам майго камандзірскага аўтарытэту? Колькі месяцаў нам упарта паўтаралі, што найбольшы дысцыплінарны грэх — быць з падначаленымі запанібрата. Але я адчуваю і цяпер, калі сяджу ў адзіноце і пішу, што ў мяне не хопіць рашучасці

напачатку патрабаваць, каб да мяне звярталіся інакш. Мяне непакоіць гэта і ў той жа час здаецца недарэчным. Няўжо трэба вырашаць такія праблемы, калі ідзе змаганне не на жыццё, а на смерць, калі яна, смерць гэтая, глядзіць табе ў вочы кожную хвіліну? Добра ў такі час адказваць толькі за самога сябе і больш ні за кога. Напісаў я гэта і падумаў: а як жа тым, хто адказвае за лёс цэлага палка, арміі, усёй краіны? Нікчэмнымі здаліся мне праблемкі, страхі, перажыванні. Я проста спалохаўся новых цяжкасцей. А я не маю права палохацца — трэба ўсё перамагчы, трэба быць гатовым да большых цяжкасцей і большай адказнасці!

Калі ўсе паснулі, а мне, узрушанаму, не спалася, я пагутарыў з дзяжурным, гэтым чорным прыгожым юнаком, і, на дзіва сабе, даведаўся, што ніякі ён не цыган, не малдаванін, а наш, магілёўскі, хлопец. Ён бліснуў сваімі прыгожымі зубамі.

— Таму нас у вёсцы Чарнякамі празвалі.

Потым, між іншым, сказаў:

— Муха заняў месца, дзе спаў камандзір. Ваша месца. Дужа хоча камандзірам стаць.

Я ўбачыў, што Сеня таксама не спіць — блукае па пазіцыі, і мы сустрэліся. Селі недалёка ад маёй гарматы, за вялікім каменем, каб ніхто не бачыў нас.

Унізе раскінуўся горад — увесь як на далоні: скрыжаванне пяці вуліц у цэнтры, драўляныя, са стандартных дамоў пасёлкі на паўночнай і паўднёвай ускраінах, гмахі рыбакамбіната каля заліва, партовыя склады, да якіх падыходзяць чыгуначныя лініі, доўгія стрэлкі прычалаў, каля іх сіратліва туляцца адзінокія караблі. Горад спіць. У дамах спяць жанчыны і дзеці. Тут, як і ўсюды на зямлі, многа дзяцей, мы бачылі іх, калі часам прыязджалі ў горад у выхадны дзень, атрымаўшы «ўвальніцельныя». Не, неспакойны сон людзей у такі час. Магчыма, толькі дзеці, маленькія, такія, як мая Ленка, спяць спакойна...

Мы доўга сядзелі моўчкі і глядзелі на горад. Два вялікія чырвоныя сонцы сляпілі нам вочы: адно — з белага паўночнага неба, зацягнутага празрыстай смугой, другое — з чорнага заліва, нерухомага, люстрана-гладкага. Чаму сёння сонца такое чырвонае?

— Ведаеш, Сеня, мне неяк па-новаму неспакойна. Магчыма, я баюся, што не змагу камандаваць гэтымі людзьмі.— Я кіўнуў назад, на ствол гарматы, накіраваны ў неба на захад.— Яны непрыветліва сустрэлі мяне. Адзін, першы нумар, Муха — прозвішча якое! — адразу на ты. «Ты, камандзір...» Абразліва неяк.

Прыжмурыўшы блакітныя вочы пад густымі брывамі, Сеня паглядзеў на мяне з прыкметнай іроніяй, як дарослыя глядзяць часам на дзяцей.

— Глупства. Не думай пра форму,— сказаў ён. Я не адразу зразумеў, што ён мае на ўвазе.— Калі нас вучылі, то залішне надавалі ўвагі форме, нібы ўсё вызначае яна. Ад нас нават патрабавалі — помніш? — каб мы, я да цябе, ты да мяне, звярталіся на вы. А хіба ў гэтым галоўнае? Галоўнае ў змесце, у сутнасці людзей — у іх шчырасці, адданасці ідэі, у калектывізме і прыязнасці аднаго да аднаго... Ты ўстрывожыўся, што сустрэлі не так, як ты хацеў. Дзівак, людзі проста хацелі спаць. Пройдзе час, разам пабудзеце ў баі, ты праявіш сваю волю, яны...

— Ты думаеш, яна ёсць у мяне, воля?

— Ого, яшчэ якая! Я, магчыма, менш за цябе здатны да ўсялякага камандавання. Але я веру ў людзей. Людзі добрыя. Пераважная большасць. Яны заўсёды памогуць — і самі падначаленыя і камандзіры. Толькі твайму другу Кідалу хацелася «ўтапіць» мяне...

— Які ён, да д'ябла, мне друг!

— Я табе прызнаюся... Ты вось не спіш, бо нечага спалохаўся, чаго — сам не ведаеш. А я хаджу і радуюся. Ведаеш чаму? Што я адарваўся ад гэтага чалавека — ад Кідалы. Сорамна прызнацца, але я баяўся яго. І ненавідзеў. І гэта, разумееш, як было цяжка?.. Гэта блытала мае пачуцці. А я хачу, каб у іх была поўная яснасць... Вораг ёсць вораг, і ўся мая нянавісць павінна скіравацца туды.— Ён махнуў на той бок заліва.— А чалавек, які са мной разам страляе па ворагу, наш чалавек, яго я павінен... абавязаны любіць... ну, паважаць хаця б, верыць яму... А я баяўся яго і ненавідзеў, хадзіў і азіраўся... Чорт ведае, якая неразбярыха была тут.— Ён пакруціў кулакамі каля сваіх грудзей.— А цяпер супакоілася, проста і ясна стала. Я дагэтуль ні да кога не адчуваў нянавісці. Я любіў людзей. Мой бацька быў і маці

вялікія гуманісты. Тата сам паехаў на ліквідацыю эпідэміі тыфусу і заразіўся там...

З пачатку вайны Сеня ніколі не гаварыў так многа і шчыра. Цяпер жа ён гаварыў з нейкай дзіўнай асалодай, разважліва, паклаўшы на камень галаву і часам нават заплюшчваючы вочы. Толькі калі ўспомніў маці і бацьку, прыўзняўся. Спачатку на кароткі момант як бы нейкі прамень асвятліў яго твар, а потым наплыў цень смутку. Ён уздыхнуў:

— Мая гаротная мама!

У мяне балюча сціснулася сэрца. У яго — адна мама, у мяне — і маці, і бацька, і Саша, і дачка... Але хіба мне лягчэй? Мой неспакой, трывога — за многіх дарагіх людзей.

На аэрадроме, што схаваны за сопкамі на поўнач ад горада, загулі матоPы. Пачуўся голас камандзіра батарэі, значыцца, яму не спіцца таксама:

— Разведчык! Што за шум?

— Свае, таварыш старшы лейтэнант!

У паветра ўзнялося шэсць тупаносых знішчальнікаў і, развярнуўшыся, чамусьці пайшлі не на захад, а на поўнач, па заліву, нізка над вадой. Мы правялі іх позіркамі.

— Відаць, дзесьці нашы караблі атакуюць. Паляцелі на дапамогу,— сказаў Сеня.

— Ты чуў вячэрнюю зводку? — спытаўся я.— Яны перайшлі ў наступленне і тут...

Я сам здзівіўся, што сказаў пра гэта зусім спакойна, як, дарэчы, спакойна і выслухаў гэтае паведамленне ад знаёмага радыста на КП дывізіёна, дзе мы спыняліся па дарозе сюды, на батарэю.

Сеня кіўнуў галавой і задумліва памаўчаў.

— Калі і тут здарыцца тое, што там, на Заходнім фронце, горача нам прыйдзецца... Тут няма куды адступаць.

Мяне перасмыкнула ўсяго, і я мімаволі азірнуўся на высокі камень за нашымі спінамі, які сапраўды як бы перагароджваў дарогу назад.

— Ты думаеш, яны перамагаюць там?

— Яны наступаюць,— адказаў ён са спакоем, які на гэты раз абурыў мяне.

— Як гэта ты можаш вось так... спакойна? Не разумею! А чаму ты не думаеш, што гэта манеўр, стратэгічны манеўр, такі, як у Кутузава?

— Ты ж сам не верыш у гэта, а таму хвалюешся. Навошта нам ашукваць сябе? Трэба глядзець праўдзе ў вочы. І без панікі. Без страху. Так мы хутчэй мабілізуем свае сілы.

— Будзь спакойны, мабілізацыя гэтая разгортваецца па ўсёй краіне, я ўпэўнены, з такім размахам...

— Я кажу не толькі пра мабілізацыю людзей, арміі, але і пра мабілізацыю душэўных сіл... Маіх... тваіх... Нашых, Пеця. Нашых сіл! Каб усе мы перамаглі страх, паніку!..

Я паглядзеў на яго з павагай і неяк адразу супакоіўся, мне нават зрабілася сорамна, што я сапраўды панікую, у той час калі ён, Сеня, якога мы называлі «мамчыным сынком», вось такі спакойны і разважлівы. Мне захацелася сказаць яму нейкія добрыя, сардэчныя словы, але я не знаходзіў іх і толькі ўглядаўся ў адзінокую постаць на адной з гарадскіх вуліц. Калі ж павярнуўся да Сені, то ўбачыў, што ён... спіць, няёмка адкінуўшы галаву на выступ каменя.

Тады я дастаў з кішэні свой сшытак і пачаў пісаць. Захацелася хутчэй, пакуль не забылася, запісаць нашу размову. А заадно падзяжурыць пры Сеню, каб разбудзіць яго на выпадак трывогі. І вось канчаю свой запіс. Сонца, як добры вартавы, нізка абышло Баранцава мора і цяпер ужо глядзіць з усходу, з прастораў Кольскай тундры. Неба зноў стала блакітнае, без смугі. Зноў лётны дзень!

3 ліпеня

Тры дні не было ні сну, ні адпачынку. Канчаўся адзін бой — цягалі цяжкія скрынкі з боепрыпасамі. Не ўпраўляліся сцерці змазкі са снарадаў — новы налёт. Ад выбухаў бомбаў, грукату стрэлаў, ад стомы і бясконцага напружання гудзе ў галаве і баліць усё цела.

Фашысты наступаюць недзе там, за Заходняй Ліцай, на Мурманскім напрамку, як афіцыйна паведамляецца ў зводках, і хочуць паралізаваць тыл, разбурыць горад, які забяспечвае фронт усім неабходным.

Горад гарыць. Другі дзень гараць бензасклады, і ўсё навокал засцелена чорным едкім дымам. Ад яго слязяцца вочы і кашаль раздзірае грудзі.

Усе батарэі нашага дывізіёна сцягнуты да горада. На дапамогу нам прыйшлі ваенныя караблі. Такое ўражанне, што

маракі прымаюць на сябе ўдары пікіроўшчыкаў, каб адцягнуць іх ад горада,— большасць бомбаў падае ў заліў. Сёння з раніцы хмарна і ўдалося крыху паспаць. Хочацца шмат што запісаць. Але ўсяго запісаць не ўдасца, бо ведаю, адчуваю — перадышка ненадоўга. Памяць асабліва яскрава ўтрымлівае першы дзень, першы мой бой, калі я стаў камандзірам.

Заснуць у тую раніцу мне так і не ўдалося. Камбат яшчэ да снедання пачаў вучэбную трэніроўку, падняўшы батарэю па сігналу «трывога». Даведаўшыся, што стральба не баявая, нумары майго разліку бурчалі, асабліва Муха:

— Мала баявых трывог, дык на табе яшчэ вучэбную. Трэба было да вайны вучыць... Сеўчанка жонку ў тыл адаслаў, дык не спіцца яму... блукае ўсю ноч, злуе...

Я здзівіўся: там, на вучэбнай батарэі, мы ніколі ў прысутнасці камандзіраў аддзяленняў не адважваліся асуджаць учынкі і дзеянні афіцэраў. «Ці не таму яны так паводзяць сябе, што не прызнаюць, не жадаюць прызнаць мяне за камандзіра?» — думаў я.

«Стралялі» вяла і няўважліва. Адзін маленькі Чарняк вельмі спрытна ставіў трубку і перадаваў снарад заражаючаму. Павел Астахаў, высокі, з доўгімі рукамі, былы каваль падольскага завода, лёніва браў патрон, узважваў на руках і не зараджаў, а перадаваў яго другому трубачнаму — Фрыду. А мы, калі вучыліся, зараджалі абавязкова. Чаму ж Астахаў не зараджае? Знарок, на злосць мне? Увесь час карцела патрабаваць, каб ён зараджаў і «страляў» — паварочваў ручку спуску. Але я не адважваўся: раптам тут рабілася так і да мяне? Але калі я ўбачыў, што першы нумар — Муха — сумяшчае стрэлкі азімута вельмі прыблізна, без патрэбнай дакладнасці, не вытрываў:

— Яфрэйтар Муха! Хіба так трэба сумяшчаць?

— А як трэба? — агрызнуўся ён.

— Ды пры такім сумяшчэнні снарад будзе чорт ведае дзе... У неба пацэлім.

— А ты хочаш кожны снарад у самалёт? Ого!

— Мы і так у неба цаляем,— засмяяўся на другім баку гарматы чацвёрты нумар — маўклівы Конкін.

І тут жа пачуўся крык камандзіра батарэі:

— Чацвёртае! Куды ў вас ствол глядзіць, японскі бог? Камандзіра да мяне!

Я з'явіўся перад разгневаным Сеўчанкам і здзівіўся — дзе той добры жартаўлівы чалавек, які ўначы прадстаўляў мяне разліку!

— Што ў вас там робіцца?

Я не стаў выдаваць Муху, ведаў, як можна апраўдацца ў такім выпадку:

— Закруціўся кабель сінхроннай перадачы, таварыш старшы лейтэнант! — схлусіў без запінкі.

Калі вярнуўся да гарматы, Чарняк і Астахаў глянулі на мяне вінавата і спачувальна, Муха сустрэў нахабнай, зларадная усмешкай: ага, больш не будзеш прыдзірацца!

Я не пазнаў свайго разліку, калі неўзабаве аб'явілі баявую трывогу. Куды дзеліся вяласць і няўважлівасць. Усе ўраз падцягнуліся, застылі на сваіх месцах у напружаным чаканні. Самыя непрыемныя хвіліны, якія праходзяць з моманту, калі вораг выяўлены, і да пачатку агню. Па арыенцірах НП і каардынатах, якія далі разведчыкі, мы хутка знайшлі самалёты ў ранішнім блакіце. Няўзброеным вокам яны сталі відаць кіламетраў за трыццаць. Іх было не два і не тры. На горад ішла цэлая паветраная армада — машын дваццаць. Куды яны абрушаць свой смяртэльны груз? На каго?

У горадзе натужна раўлі сірэны паветранай трывогі.

Маленькія чалавечкі мітусліва бегалі па вуліцах. Куды яны схаваюцца? Ці даволі там надзейных месц?

Сірэны, якія пачуў упершыню, і цывільныя людзі — а там жа жанчыны і дзеці! — нарадзілі новыя пачуцці — боязь за тых, што мітусяцца там, на вуліцах, шукаючы ратунку ад ненавіснага ворага.

Нейкія тры мінуты здаліся пакутліва доўгімі. Хутчэй бы яны зайшлі ў зону агню!

Я ўбачыў, як у Мухі збялелі вушы. Няўжо і я такі ж? Якая ганьба! Хіба будуць паважаць такога камандзіра? Дзякуй Богу, што ніхто не глядзіць на мяне.

Маленькі Чарняк і доўгі Фрыд заціснулі каленямі патроны, надзелі на дыстанцыйныя трубкі ключы. Яны так шчыльна надзяюцца, гэтыя ключы, але ўсё адно дзынкаюць — дробненька-дробненька стукае метал аб метал.

Тоўсты, не надта паваротлівы комі Габаў шэптам чытае застыглую трубку:

— Сто шэсцьдзесят два... сто шэсцьдзесят два... сто шэсцьдзесят два...

Збоку здаецца, што ён шэпча малітву.

Чацвёртага нумара я не бачу — ён за гарматай... Але Астахаў... Толькі на яго твары, у яго рухах, жэстах не відаць таго, што так прыкметна ва ўсіх іншых. Ён тупае каля свайго затвора, павольны, паважны, як добры дзед, і маленькай фланелевай анучкай старанна выцірае клін і патроннік. Няўжо такім чынам яму ўдаецца схаваць свой страх? Не, цяпер, пасля трох дзён баёў, я ведаю, што паводзіны яго зусім натуральныя, гэты каваль хутчэй за ўсіх пазбыўся страху.

Сеня Пясоцкі праз оптыку дальнамера ўжо вызначыў маркі машын.

— Група злева — «Ю-88», справа — «87». Зверху — знішчальнікі! — паведаміў ён у напружанай цішыні так гучна, што пачула ўся батарэя. Пад Мухам забрынчала сядзенне. Агідна гэта, непрыемна. Варта яму сказаць. Але ці маю я права? Колькі дзён назад яно гэтак жа брынчала пада мной. Ды і голас... невядома, які будзе ў мяне голас. Каб я не выдаў сам сябе...

Не спускаю вачэй з чорных сілуэтаў, што, здаецца, засланілі ўсё неба. Няўжо нельга яшчэ страляць? Чаму не пастаўлены батарэі на тым баку заліва, каб сустракаць іх агнём на падлёце да горада? Але ж яны могуць зайсці з любога боку... Магчыма, у той момант і не было гэтых думак, шмат якія з іх з'явіліся, безумоўна, толькі цяпер, калі я пачаў запісваць... Тады было адно жаданне — хутчэй адкрыць агонь. Вось ужо «месершміты» рвануліся ўбок. Ага, у паветры нашы знішчальнікі! Сышлі з баявога курсу «Ю-87», зрабіўшы разварот на поўнач.

«На аэрадром», — адзначыў я.

Пачалі агонь караблі.

Нарэшце і ў нас доўгачаканае: «Ёсць сумяшчэнне».

— А-а-онь!

У першым залпе «рассыпалі гарох». Камандзір батарэі злосна закрычаў, але тут жа сам сябе асек чарговай камандай — лаяцца няма калі!

Быццам тым снопам агню, што вылятаў з гарматы, апякала думка: я, камандзір, зусім непатрэбны, лішні і толькі

замінаю трубачным! Сапраўды, мне няма чаго рабіць. Ці, можа, я забыўся на свае абавязкі? Назіраць за работай нумароў... За цэлямі... Я назіраю... Добра назіраю... Перад фашыстамі ўзнікла заслона разрываў. Няўжо разбілі іх строй? Не, відаць, яны проста перастройваюцца перад заходам на аб'ект. Не, усё-такі яны рассыпаліся. Відно, як ад фюзеляжаў адна за адной аддзяляюцца бомбы і ляцяць... д'ябальскі павольна ляцяць... Свіст... Выбухі... Бомбы рвуцца ў розных канцах горада. Усё-такі гэта не прыцэльная бамбёжка! Ад усведамлення гэтага прыйшла ўпэўненасць.

Я закрычаў:

— Так іх, хлопцы! Так гадаў! Муха! Сумяшчай!

Я знайшоў сабе занятак — выкідаў за бруствер пустыя скрынкі, адчыняў новыя. Мяне захапіла работа Астахава. Гэты чалавек не ваяваў, а сапраўды працаваў — так спакойна ён зараджаў і страляў. Спачатку здавалася, што ён робіць гэта залішне павольна. Але ніводнага разу ён не спазніўся са стрэлам, а заўсёды, зарадзіўшы, яшчэ нейкі міг чакаў каманды, трымаючыся за ручку спуску.

Залпы настроіліся, і я падумаў, што тут страляюць лепш, чым стралялі мы на вучэбнай батарэі. Мне нават стала трошкі крыўдна. Праўда, у іх было больш баёў. Аднак гэтыя людзі неяк спакайней сябе паводзяць...

І раптам усё паляцела да д'ябла. Пачалося з крыку разведчыка:

— Самалёты над чацвёртым!

Некалькі «Ю-87» зайшлі з усходу і знянацку атакавалі батарэю. Яны спікіравалі з дзікім свістам; пасля мы даведаліся, што разам з бомбамі фашысты кідалі рэйкі і пустыя бочкі, каб нагнаць больш панікі. Адна бомба разарвалася зусім блізка, нас абдало гарачым паветрам і абсыпала зямлёй. Стральба з прыборам разладзілася. Праз выбухі, стракатанне кулямётаў, крыкі я пачуў каманду Сеўчанкі:

— Прамой наводкай!

Я паўтарыў яе для свайго разліку:

— Па самалёту — прамой!..

Але Муха, аглушаны, спалоханы, падсунуў галаву пад аптычны прыбор, быццам такім чынам мог закрыцца ад бомбаў і куль, згорбіўся і не рэагаваў на каманду.

Я схапіў яго за плечы:

— Прамой! Муха! — І вылаяўся, злосна, груба, як, бадай, не лаяўся ніколі ў жыцці.

Але Муха ў адказ яшчэ больш згорбіўся і ўтуліў галаву ў плечы, бо ў гэты момант зноў над намі завыў пікіроўшчык. Я глянуў угору і, як у першым баі, убачыў чорныя крыжы ў жоўтых кругах. Быццам хваляй ад выбуху, ударыла ў сэрца, у галаву нянавісць, лютая злосць на гэтыя крыжы, а потым — на Муху. Я рвануў яго з сядзення і шыбнуў на снарадныя скрынкі, а сам уміг апынуўся на месцы наводчыка, адразу злавіў самалёт, падвёў пад скрыжаванне нітак у оптыцы.

— Цэль злоўлена! Агонь!

Малайчына Астахаў! Стрэл грымнуў без затрымкі. Другі — так хутка за першым, што я, асеплены ўспышкай, не ўправіўся зноў злавіць цэль.

— Зараджаючы! Каманду!..

І Астахаў, гэты спакойны і разважлівы каваль, пачуў мае словы і зразумеў іх сэнс, хоць у гэты момант зноў недзе блізка рваліся бомбы і над нашымі галовамі ляцелі снарады суседняй гарматы.

— Цэль... А-а-онь! — не зусім па правілах камандаваў я.

Але Астахаў добра разумеў: «цэль» — зараджай, «онь» — страляй. І раптам бачу, што пад самалётам, які я вёў у аптычным прыцэле, шуганула полымя, мусіць, выбухнуў бензабак, і ахутаная дымам машына, нязграбна і цяжка кулячыся ў паветры, грымнулася на суседнюю сопку.

Праз павелічальнае шкло я глядзеў, як іргваўся і гарэў той, хто нёс нам смерць. Вось табе! Мы жывыя, мы будзем жыць! А ты згарыш, сатлееш, і нават маці твая, нават дзеці не будуць ведаць, дзе ты пахаваны, бо не будзе ў цябе магілы на чужой зямлі. Безумоўна, так я не думаў тады, так думаю цяпер, калі запісваю падзеі таго дня. Але помню, добра помню, што грудзі мае распірала, ажно цяжка было дыхаць, нейкае новае, нязвыклае і вельмі магутнае пачуццё.

Нехта крыкнуў «ура!». Мне не хацелася крычаць. Не было слоў, каб выказаць тое пачуццё, бо яно было мацней за любыя словы. Калі казаць проста, то гэта была радасць — радасць першай перамогі, радасць адчування сваёй сілы. Але

разам з тым было і яшчэ нешта: магчыма, канчатковая перамога над сваім страхам, магчыма, упэўненасць у сваіх камандзірскіх здольнасцях ці тое і другое адначасова, а можа, нешта зусім іншае.

Я не адразу ўспомніў настаўленне: збіў адну цэль — лаві другую. Хоць, відаць, маё любаванне збітым самалётам працягвалася нейкую секунду-дзве, не больш. Аднак калі я схамянуўся і пачаў шукаць новыя цэлі, то ўбачыў, што яны далёка за залівам. Там ішоў паветраны бой. Угары, як у каруселі, кружыліся знішчальнікі.

А ўнізе, над самай зямлёй, ужо не баявым строем, як ішлі сюды, а па адным, уроссып, як зладзеі, уцякалі бамбардзіроўшчыкі. Так, было такое ўражанне, што яны ўцякаюць, і ад гэтага таксама стала радасна.

Я ўсё яшчэ шукаў цэль, калі нехта схапіў мяне за плячо.

— Адбой, камандзір,— пачуў я голас Астахава.

Я азірнуўся і ўбачыў Муху. Ён сядзеў на зямлі, паміж скрынкамі, трымаўся за шчаку; твар яго, рукі былі выпацканы крывёй. Я кінуўся да свайго намесніка:

— Вы ранены?

У адказ ён загаласіў, зашыпеў, запырскаў слінай:

— Ранены? Вы... вы... забілі! Фельдфебель!.. Дзяржымορда!.. Гэта табе не фашысцкая армія! Вось пайду пакажу камбату!..

Я нічога не мог зразумець і стаяў разгублены, не ведаючы, што рабіць. Муха падхапіўся, яшчэ больш размазаў на твары кроў і хацеў быў выйсці з катлавана. Ды раптам, надзіва мне, Астахаў схапіў яго загрудкі і добра трасянуў.

— Ты, панчоха бабская! Ты на каго скардзіцца ідзеш? Ды я цябе распішу горш, як Бог чарапаху! Хоць ідзі! Ідзі! — Ён папіхнуў яго.— Скардзіся, сволач! Трус няшчасны! Ты ж трус. Ты ж не лавіў цэль, а хаваў пад оптыку галаву, як той заяц... Цябе ж па законах ваеннага часу пад расстрэл трэба... І я першы скажу... Ідзі!

Астахаў штурхнуў Муху яшчэ раз. Але ў таго знікла жаданне ісці скардзіцца, ён адступіў назад у катлаван, баязліва агрызаючыся:

— Не брашы! Я сумяшчаў... Можа, я не пачуў каманды, мяне аглушыла... А ён... ён паказаць сябе захацеў... Геро-ой!

Падскочыў маленькі Чарняк, бліснуўшы сваімі дзявочымі зубамі.

— Маніш, Муха! Камандзір тройчы паўтараў каманду! Усе чулі!

— Вытры яму соплі, Ваня,— насмешліва параіў Астахаў.— Няхай не размазвае па твары.

Нарэшце я здагадаўся, што здарылася: калі я шыбануў наводчыка з сядзення, ён ударыўся аб снарадную скрынку і разбіў шчаку. Я не меў на яго ні злосці, ні крыўды, бо добра помніў свой уласны страх. Але я ўбачыў, што разлік прызнаў мяне: байцам спадабаліся мая рашучасць і смеласць. Аказваецца, я магу быць смелым. Няхай жа жыве мая смеласць! Я зразумеў, тая акалічнасць, што ў «баі» паміж Мухам і Астахавым я стаю ўбаку, не на карысць мне. Трэба і тут праявіць рашучасць.

— Эй, на КП! Санінструктар там? Сюды яго!

— Не трэба,— спалохана запярэчыў Муха. Вось у гэты момант ён стаў мне брыдкі.

Перш чым адгукнуўся непаваротлівы «медык», з'явіўся сам камандзір батарэі.

— Што здарылася? Раненыя? — заклапочана спытаў ён.

— Дык вось... яфрэйтару Муху шчаку...— адказаў я, гатовы тлумачыць усё праўдзіва, калі спатрэбіцца.

— Чым? Асколкам? Каменем?

— Каменем,— схлусіў Муха.

Пераглянуліся паміж сабой байцы, хаваючы хітрыя ўсмешкі.

Сеўчанка дакрануўся да шчакі «параненага».

— О, па гэтым будзеш жыць, Муха. І дзіты будэш маты.

Камбат, задаволены, вясёлы, агледзеў усіх нас і не стрымаўся, каб не пахваліць:

— Добра стралялі. Малайцы!

— А гэта мы яго, таварыш старшы лейтэнант,— кіўнуў Астахаў у той бок, дзе дагараў збіты самалёт.

— Мы. Але не зазнавайцеся. Увогуле стралялі шчэ пагана.

— Наша гармата збіла,— стаяў на сваім каваль.

Мяне здзівіла і нават непрыемна ўразіла самаўпэўненасць і настойлівасць зараджаючага. Я дагэтуль і не паду-

маў, што магла збіць іменна наша гармата, бо вялі агонь усе, можа, нават караблі. Разбярыся — чый снарад пацэліў. Але Астахаў трымаўся іншай думкі.

— Па гэтым біла толькі наша і трэцяя. Другая і першая туды,— даказваў ён.

Камандзір батарэі нахмурыўся.

— Добра, разбяромся. Але бачылі? Нялёгка ім атакаваць батарэю, калі яна вядзе агонь. Вунь дзе бомбы паскідалі. Галоўнае — не баяцца.

Калі ён пайшоў, Астахаў сказаў мне:

— Дурань ты, камандзір, але чалавек добры. А за самалёт трэба змагацца. А то Шарун, камандзір трэцяга, ён з зубоў вырве... Пачнуць даказваць: ён — старшы сяржант, а ты — яфрэйтар, ён — стары камандзір, а ты — адзін дзень... Я гэтых майстроў ведаю. Больш горлам бяруць, чым работай.

Мне не спадабаліся такія разважанні. Непрыемна было думаць, што трэба змагацца, даказваць, хто збіў самалёт. Хіба гэта гульня, спаборніцтва, спорт? Вайна, смерць, гора... Хіба можна ў такі час думаць пра нейкую славу, узнагароду? Трэба біць, біць іх больш, ворагаў, што хочуць украсці маё... тваё... наша шчасце. Біць і не лічыць, не дзяліць, хто больш.

4 ліпеня

Учора выступаў па радыё Сталін. Камандзір і зампаліт чулі голас Сталіна. Мы чулі яго прамову, калі яе паўтаралі дыктары. Лазебны — радыёаматар, і ў хаціне, дзе яны жывуць з камандзірам, стаіць прыёмнік яго ўласнай канструкцыі. Надвор'е ў першай палавіне дня было хмурнае, амаль нялётнае, і нас па чарзе, па аднаму разліку, запрашалі да прыёмніка, калі перадавалася прамова. Стаіўшы дыханне, выслухалі мы словы суровай праўды. Цяпер мне стала зразумела, чаму з'явіліся Барысаўскі і Бабруйскі напрамкі. Але не магу, не магу пагадзіцца з думкай, што Мінск ужо ў іх руках. І Бабруйск... Я плыў... Я ішоў ад Бабруйска да Рэчыцы. Гэта ж рукой падаць: па правым беразе Бярэзіны, потым — Дняпра... А там — Саша, там — мая Саша...

Цішыня. Горад ахутаны едкім дымам. Кажуць, гараць склады рыбы.

Дзіўна я змяніўся за гэтыя дні: мне страшна ад цішыні і хочацца бою. Учора яшчэ адзін сцярвятнік знайшоў сваю магілу ў заліве. Другога збілі знішчальнікі над Колай.

Фрыд сядзіць у нішы, латае свае працёртыя снарадамі штаны і спявае да болю сумную песню — па-яўрэйску. І ўсе сур'ёзна слухаюць, спыніўшы работу.

— Пра што гэта, Ханон? — пытае Астахаў.

— Пра маці. Пра старую маці, яна адна...

— Сціхні,— просіць Муха нервова, роспачліва.

У Чарняка па яго смуглай шчацэ (ён сядзіць збоку ад мяне) коціцца буйная і цяжкая, як шарык ртуці, сляза.

20 ліпеня

Такой гарачыні тут не было семдзесят год. Паўмесяца на небе ніводнай хмурынкі, ніводнага воблачка, сонца пякло, як у нас, у Беларусі, падчас сенакосу. Нават уначы, калі сонца хавалася за паўночную гару, што закрывае ад нас аэрадром, у паветры не адчувалася прахалоды. А ўдзень можна было купацца. Унізе, пад сопкай, працякае ручай, і мы з зайздрасцю глядзелі на тых шчаслiўцаў, якія мелі магчымасць акунуцца ў халоднай вадзе. Часам там, за валунамі, раздзяваліся жанчыны. Там, у горадзе, ішло сваё жыццё, мы разумелі, нялёгкае, ваеннае і не менш небяспечнае, чым у нас. Але жыццё. А ў нас яго не было, у нас — толькі вайна. Нам было не да купання, не да адпачынку і нават не да размоў аб чым-небудзь іншым, акрамя вайны. Мы стралялі па некалькі разоў на дзень. Яны лётаюць амаль бесперапынку. Высока ў блакіце праходзяць разведчыкі. Шнырають, як сабакі, чорныя «месершміты», выклікаюць на бой нашы слабенькія «І-153» і збіваюць іх. О, як гэта балюча бачыць, як яны збіваюць нашы самалёты.

Дні два-тры бамбавозы ідуць невялікімі групамі, нават зрэдку па адным. Потым — масіраваны налёт. Бадай, нельга сказаць, у які дзень былі найбольшыя налёты, калі і як мы стралялі. Нас яны больш не атакавалі, і дні і баі падобны, як блізняты. Назаўсёды запомнілася толькі адно — жаданне спаць. Яны не давалі нам заснуць больш як гадзіну-дзве ў суткі. Дзіву даюся, як людзі трымаліся на нагах. Ёсць вя-

лікі рэзерв сілы ў чалавека. Мы лавілі кожную хвіліну перадышкі, каб прылегчы ці, калі не дазвалялася прылегчы, па чарзе падрамаць, абапёршыся на бруствер, на скрынкі, а Муха рабіў гэта проста на сядзенні, упёршыся лбом у гумавы казырок оптыкі. Многа клопатаў было з Габавым. Ён засынаў смяртэльным сном і не прачынаўся ні ад крыку «Трывога!», ні нават ад стрэлаў. Некалькі разоў мне прыйшлося самому чытаць трубку. Яго лаялі калектыўна, сарамацілі, пагражалі судом, але мала што памагала. Тады Астахаў вынайшаў спосаб: заўсёды трымаць побач вядро вады. Габаву на галаву вылівалі ваду, і тады ён даволі шпарка займаў сваё баявое месца. Я быў запярэчыў супроць такой жорсткасці, але сам «сын Поўначы» не крыўдзіўся.

— Вадзічка цёплая... Ах, карашо,— жартаваў ён.

— А як зімой будзе? Зробішся на ледзяша.

— Да зімы мой будзе канчаць спаць.

І ўсё-такі мне за гэта моцна папала ад камандзіра ўзвода — старшыны Малашкіна. Былы камандзір гэтай гарматы, ён любіў Габава, якога, між іншым, сам навучыў пісаць і чытаць. А ўвогуле гэта дзіўны і пакуль што незразумелы мне чалавек, Малашкін. Ён і цяпер ходзіць з падручнікам вышэйшай матэматыкі і кожную вольную хвіліну чытае яго з такой цікавасцю, як чытаюць прыгодніцкі раман. І ўсё робіць нейкія разлікі. Кажуць, удасканальвае ПУАЗО. Часам дакладваеш яму што-небудзь важнае, а ён як бы не чуе, не звяртае ўвагі, можа ісці міма і не ўбачыць беспарадку, парушэння дысцыпліны. А то раптам можа страшэнна расшумецца з-за дробязі. Тады пачынае крычаць тонкім пісклявым голасам, пакуль не сарвецца, не закашляецца. Пасля гэтага дзень ходзіць пануры, незадаволены, злуючыся, як відаць, на сябе больш, чым на таго, хто яго ўзлаваў. За ваду гэтую ён пагразіў мне трыбуналам. А Сеўчанка стаяў збоку, не ўмешваўся ў «праборку» ўзводнага і, я прыкмеціў, употай смяяўся. Сеўчанка — разумны і хітры хахол.

Другі раз Малашкін накрычаў на мяне ўвогуле з-за глупства. Я дзіўлюся, як разумны чалавек мог надаваць столькі ўвагі такой недарэчнасці.

Муха, пасля таго як я скінуў яго з сядзення, зрабіўся проста шаўковы, прыкладны ва ўсіх адносінах: ніякіх «ты», калі звяртаўся да мяне, ніякага панібрацтва, заўсёды — «ёсць»,

«слухаюся!». Ды і ўсе іншыя ставіліся з павагай. Адзін Астахаў і далей звяртаўся на ты. Я ўсё намерваўся зрабіць яму заўвагу, але так і не адважыўся. І добра зрабіў: афіцыйнасць з разумным чалавекам непатрэбна. Мы сталі сябрамі, і наша дружба хораша ўплывае на іншых. Разлік жыве, як дружная сям'я. У часе кароткіх перадышак паміж баямі, калі «прымаем харч» — снедаем ці абедаем,— сардэчна гутарым, жартуем. І вось у часе адной такой гутаркі я жартам спытаў свайго намесніка:

— Слухай, Муха, адкуль гэта ў цябе такое куслівае прозвішча?

Сказаў — і забыўся. А Муха абразіўся ці, можа, проста знайшоў прычыну паскардзіцца камандзіру ўзвода. Той як раскрычаўся, адвёўшы мяне ад дальнамера, далей ад маіх хлопцаў! Калі ўзважыць, дык ён мяне абражаў у дзесяць разоў горш, чым я гэтага дурня Муху. Ён чамусьці абвінаваціў мяне ў бескультурнасці, у несавецкіх адносінах да чалавека, нават у хуліганстве і тут жа — у «інтэлігенцкай мяккацеласці», у панібрацтве з падначаленымі, у няўменні падтрымліваць дысцыпліну. Я адказаў, што разлік страляе не горш за іншых.

Малашкін ажно падскочыў:

— Не ваша заслуга ў гэтым!

Значыцца, ён лічыць, што яго заслуга. «Няхай сабе лічыць»,— падумаў я і абяззброіў яго пакорлівым вінаватым маўчаннем. Праз хвіліну яму, відаць, стала сорамна і непрыемна за свой крык, і ён пачаў лагодна тлумачыць мне, якім павінен быць камандзір Чырвонай Арміі. Мне чамусьці зрабілася шкада яго: сам ён зусім не такі ідэальны камандзір, але чалавек шчыры, нягледзячы на ўсе свае слабасці, і я паважаю яго. А Муха прымусіў мяне насцеражыцца. Я расказаў пра ўсё Астахаву.

Той абурыўся:

— Вось падлюга! Жартаў не разумее. Ну, мы яго правучым!

Няўжо гэта было для мяне самым важным, што, дарваўшыся ўрэшце да магчымасці нешта запісаць, я прыгадваю ў першую чаргу такія звычайныя дробныя размовы,

сутычкі? А мае думкі, перажыванні з-за таго, што адбываецца там, на франтах?

Пасля прамовы Сталіна зрабілася неяк спакайней. Але боль... боль не сціхае, ён з новай сілай коле сэрца кожны раз, калі ў паведамленні Саўінфармбюро называецца новы напрамак. Часам узнікае надзея... Так яна ўзнікла, калі нашы зноў адбілі Жлобін і Рагачоў. Можа, гэта пералом, можа, далей на ўсход і ўніз па Дняпры яны не пасунуцца? Але з'явіўся Смаленскі напрамак — і зноў боль...

Узрадавала нас пагадненне паміж СССР і Англіяй. Зноў надзея. Каторы дзень толькі і гаворкі пра гэта пагадненне.

На кароткай нарадзе малодшых камандзіраў у камбата, нарады такія ён склікае пасля кожнага бою, Сеня Пясоцкі сказаў:

— Цяпер можна ўявіць, якое значэнне набывае наш Мурманск. Адзіны незамярзаючы порт з выхадам у адкрытае мора. Найкарацейшы шлях да Англіі.

Мабыць, камісар не паспеў яшчэ падумаць пра гэта, бо адразу падхапіў Сеневы словы, пачаў развіваць і нават загадаў у такім сэнсе растлумачыць байцам.

З Сенем мы сустракаемся па сутнасці толькі на гэтых кароткіх нарадах, хоць знаходзімся адзін ад аднаго за нейкія трыццаць крокаў. Можам перакрыквацца з катлаванаў, але сысціся і пагутарыць няма калі, ды і не дазваляецца — увесь час трывога. А мне так хочацца пагутарыць з ім, адвесці душу, успомніць наша Прыдняпроўе, дзе яго маці і мая Саша... Цяпер я часцей, чым да вайны, з большым смуткам, з большай любоўю і замілаваннем успамінаю гэтыя мясціны. Аднойчы мне нават прыснілася, што я стаю на высокім беразе Дняпра, там, у мястэчку, дзе ўсё знаёма: бальніца, школа, сцежка ў рове, па якім сцякае вясновая вада. Толькі Дняпро быў не той — разы ў тры шырэйшы, і вада бурліла і пенілася. І на тым беразе я ўбачыў не лес, як у сапраўднасці, а бяскрайні роўны-роўны луг. Удалечыні відаць былі белыя постаці, я да болю ў вачах узіраўся і ніяк не мог зразумець — ці то хусткі дзяўчат, ці буслы. Дзіўны сон! Хочацца хоць раз убачыць у сне Сашу. Але дарэмна — сню нейкія страхі, недарэчнасці. Хоць гэта натуральна, бо амаль забылася ўжо, што такое нармальны чалавечы сон, тое, што мы называем сном,— нейкая хваравітая дрымота, трызненне: спіш і ў сне страляеш.

З баёў асабліва запомніліся два — тыя, у якіх мы перамагалі, калі можна назваць перамогай збітыя самалёты. Хочацца так называць. Хочацца перамогі!

Іх было пяць. Яны ішлі баявым курсам на горад, не з захаду, а чамусьці з поўдня. Таму першай іх сустрэла былая вучэбная батарэя, на якой я пачынаў службу. Яна дала залп. І гэта быў залп класічны. Снарад, напэўна, пацэліў у бомбавы люк аднаго з самалётаў, бо ён узарваўся высока ў небе са страшэнным грукатам. Выбух пашкодзіў два іншыя «юнкерсы». Адзін упаў тут жа каменем, разам з рэшткамі таго, што ўзарваўся, другі, перакуліўшыся ў паветры, страціў вышыню, але выраўняўся і паспрабаваў ляцець, ды працягнуў недалёка — на тым баку заліва лётчыкі выскачылі з парашутамі. Два з тых, што ўцалелі, скінулі бомбы недзе паміж Колай і горадам і кінуліся наўцёкі. Але іх дагналі нашы знішчальнікі.

Вось гэта можна назваць перамогай!

Другі бой — паветраны. Нашага маленькага «І-16», які толькі што ўзняўся па трывозе з аэрадрома, прыціснулі чатыры «месершміты». Мы трымалі іх у прыцэлах, але не маглі страляць, яны круціліся, як вужы, на прыборы не было сумяшчэння, а весці агонь прамой наводкай — далёка. Сціснулася сэрца: яшчэ адзін наш чалавек, наш друг праз хвіліну будзе мёртвы. Чаму ён узняўся адзін? Чаму сябры не ляцяць на дапамогу? Але знішчальнік так спрытна, так умела выкручваўся ад атак фашыстаў, што на батарэі пачуліся воклічы захаплення. Не, ён не проста выкручваўся, ратаваўся, ён атакаваў, хітра, па-майстэрску. І праз нейкую хвіліну адзін «месершміт», пакідаючы за сабой палосу чорнага дыму, урэзаўся ў скалы. Хлопцы закрычалі «ўра!», «І-16», як бы адчуўшы сілу, пачаў атакаваць яшчэ больш настойліва. «Месеры» прыкрывалі адзін аднаго, стараліся зайсці смельчаку з хваста. Але ён неяк так лоўка манеўраваў, што ўвесь час навязваў ім лабавую атаку зверху. Іх перавагу ў хуткасці ён умела выкарыстоўваў. Калі і другі сцярвятнік грымнуўся аб зямлю, хлопцы раўлі ад захаплення. Спакойны Астахаў кінуў высока ўгору каску. Але раптам аднекуль з'явіліся яшчэ чатыры чорныя гады. Адзін супроць шасці! Сокал наш, відаць, улічыўшы сілы, зразумеў, што яму трэба ратавацца. Кінуўся да нас. Мы нават не адразу зразумелі

яго намер, калі ён на брыючым палёце пачаў кружыць вакол батарэі. Але калі фашысты наблізіліся да яго, Сеўчанка закамандаваў агонь прамой наводкай. Убачыўшы букеты разрываў, «месеры» адвалілі. Паспрабавалі хадзіць па шырокім крузе, падпільноўваючы смельчака, але іх абстралялі другія батарэі. Тады, раз'юшаныя, яны кінуліся на горад так нізка, што страляць было нельга, і пачалі страчыць з кулямётаў у вокны дамоў. Але гэта злачынства іх не прайшло беспакарана. Яны парушылі свой баявы парадак, і наш герой выкарыстаў гэта: калі яны рабілі разварот, ён кінуўся на апошняга і... збіў яго.

Маленькі Чарняк перакуліўся цераз галаву. Даўгі Фрыд пачаў скакаць цераз упоры, як заяц. Муха, не адрываючыся ад оптыкі, малаціў сябе кулаком у грудзі.

Якое гэта шчасце — перамога! Як яна ўздымае настрой людзей!

Фашысты мусілі ўцякаць, бо ў дадатак да ўсяго з порта па іх ударылі зенітныя кулямёты.

«I-16» пакружыў над батарэяй, прывітальна памахаў нам крылом і спакойна паляцеў на аэрадром.

Разлікі прасілі камандзіра батарэі:

— Таварыш старшы лейтэнант! Пазваніце — хто ён? Як яго прозвішча? І павіншуйце! Абавязкова павіншуйце! Гэта ж — герой!

Праз паўгадзіны Сеўчанка выйшаў з будкі сувязі і крыкнуў:

— Батарэя, слухай! Званіў пілот капітан Сафонаў і дзякаваў за падтрымку.

Паўмесяца ад свайго імя і ад жыхароў гэтага спакутаванага, скалечанага горада мы прасілі неба, каб яно паслала непагадзь, дождж, дало перадышку. Сёння яно злітавалася над намі. Уласна кажучы, не неба, а мора — адтуль прыплыў густы, як вата, туман. Адразу зрабілася холадна.

21 ліпеня

Пісьмо ад Сашы! Я нецярпліва і бестактоўна, забыўшыся на ўсялякую субардынацыю, выхапіў канверт з рук у камзвода, які прынёс яго, маё пісьмо. У мяне дрыжалі рукі,

відаць, я змяніўся з твару, бо Малашкін, зірнуўшы спачатку сурова, раптам апусціў вочы і моўчкі адышоў.

Страшна было чытаць у прысутнасці байцоў. Я выйшаў за катлаван, схаваўся за камень, разглядзеў штампы. «Рэчыца, 3. 7». Закалацілася сэрца: напісана амаль праз паўмесяца пасля пачатку вайны. Што там? Радасць, гора?

Нарэшце я набраўся мужнасці і асцярожна, як разраджаюць міну, разарваў канверт. Знаёмы аркуш з вучнёўскага сшытка. Жывая! Здаровая! Але дзіўна, дзіўна ты пішаш, Саша. Быццам і няма яе, вайны, быццам і не падступае яна да вас, хоць пісала ты 3 ліпеня, калі ўжо з'явіўся Бабруйскі напрамак. Няўжо, думаеш, мяне больш цікавіць, што ты памагала Ані ўбіраць канюшыну, паўдня працавала і вельмі змарылася, а Ленка ўвесь гэты час спала тут жа на полі? Што дачушка наша ўся ў мяне, нават радзімая плямка такая ж на мочцы вуха? Так, гэта цікавіць, гэта дорага мне. Але ж я ведаю, што не адным гэтым ты жывеш цяпер! Не! Я прачытаў крык тваёй душы ў канцы пісьма, дзе ты просіш, каб я быў асцярожны. Ты верыш, што я жывы? Ты не можаш не верыць — я разумею. Так, я жывы! Я буду жыць, бо я пераможу свой страх і навучыўся забіваць ворага. Я вярнуся да цябе! Вярнуся, Саша!

Колькі разоў за дзень я перачытваў дарагое пісьмо! Колькі вычытаў таго, чаго там не напісана! Але канюшына... Навошта ёй убіраць канюшыну? Можа, гэта намёк? Вось гэтага я не магу зразумець, хоць галава мая ад думак хутка разарвецца, як снарад,— на дробныя асколкі.

«Сёння паўдня я памагала Ані ўбіраць канюшыну. І Ленка была са мной на полі, гэта недалёка, за копанкай. Помніш, дзе мы сядзелі з табой аднойчы, каля старых вербаў? Ленка ўвесь час спала...»

Канюшына... копанка... вербы... І ніводнага слова пра вайну. Любая Саша! Упершыню я не разумею цябе. Праўда, ты кажаш, што пішаш мне амаль штодзень. Ты думаеш, што я палучаю іх, твае пісьмы? Не, іх дзесьці па дарозе глытае вайна гэтак жа, як і мае да цябе. Значыцца, яна сапраўды блізка ад цябе, вайна, бо Астахаву з Падольска і хлопцам з Масквы пісьмы прыходзяць акуратна.

22 ліпеня

Трэці дзень плыве туман. «Як у Лондане»,— кажуць хлопцы, хоць многія, мусіць, нічога раней не чулі пра туманы ў англійскай сталіцы. Цяпер нават малапісьменны Габаў можа прачытаць цэлую лекцыю пра Брытанскія астравы. Хочацца ведаць пра тых, хто ваюе разам з намі супроць фашызму.

Пасля спякоты — асенні холад. Ходзім у шынялях. Вось яна — Поўнач!

Сеўчанка дазволіў разлікам добра адаспацца. Ды на холадзе ў сырых нішах не надта спіцца. Па чарзе ходзім у зямлянкі, за агнявую пазіцыю. Цудоўныя мірныя зямлянкі! Яны здаюцца харомамі, хоць цяпер і там не вельмі ўтульна: ад стрэлаў і бомбаў палопаліся газеты, якімі былі абклеены сцены, патрэскаліся дошкі, сыплецца пясок. Усюды сляды разбурэння.

Пасля абеду да мяне прыйшоў Сеня:

— Хочаш, пойдзем да камбата?

— «Хочаш»! Так я і захацеў! Пакліча — пабягу. А без патрэбы...— Я з іроніяй паглядзеў на Сеню: друг камбатаў знайшоўся!..— А навошта мне ісці?

Сеня ўсміхнуўся:

— Сеўчанка вершы любіць, каб іх на памяць чыталі.

— Вершы? — здзівіўся я.

— Ён пачуў, як я сваім байцам Шаўчэнку чытаў. Ажно праслязіўся. Учора яму ўсё перачытаў, што ведаў...

— І свае?

Сеня зачырванеўся, схапіў мяне за руку:

— Слухай, пра мае — ні слова. Як друга прашу. Інакш нажывеш ворага.

— Добра. Буду маўчаць. Але скажы па сакрэту — пішаш?

— Пішу. Пішу,— прызнаўся ён таямнічым голасам.— Ну, пайшлі.

Я ішоў з нейкім незразумелым страхам. Мы пастукалі, атрымалі дазвол. Камбат быў у сваёй зямлянцы. Я пачаў быў дакладваць:

— Таварыш старшы лейтэнант...

Сеўчанка махнуў рукой: не трэба. І надзвычай проста і гасцінна запрасіў:

— Сядайце, хлопцы.

Ён, без рэменя, з расшпіленым каўняром, сядзеў на табурэце перад печкай і падкідваў дровы. У зямлянцы цёпла і прыемна пахла чалавечым жыллём. Увогуле тут было ўсё неяк па-хатняму ўтульна, не так, як у зямлянцы Купанава, хоць будаваліся яны ў адзін час. Але там было ўсё па-салдацку проста, а тут — як у добрай кватэры: панікеляваны ложак, мяккая канапка, на сцяне — украінскі дыван, карціны і партрэты. Мой позірк адразу спыніўся на вялікай фатаграфіі маладой жанчыны з дзіцем на руках. Якое гэта хараство — маці з дзіцем! Я падумаў пра Сашу. Колькі было б у яе цяпер шчасця, каб не гэтая праклятая вайна!

Сеўчанка, убачыўшы, як я гляджу на партрэт, растлумачыў:

— Жонка з сынам. Адаслаў іх у Іжэўск, сястра там у мяне замужам.

— У мяне таксама жонка і... дачка.

— Я ведаю. Мне казаў Пясоцкі.

О, як я ўдзячны за гэтыя простыя чалавечыя словы! Бо не было ў іх ні недарэчнай сідарэнкаўскай цікаўнасці і насмешлівасці, ні той спачувальнасці, якую часам выказваюць старэйшыя да малодшых — не трэба, маўляў, так рана жаніцца! — ні яшчэ чаго-небудзь такога, што магло б абразіць мае пачуцці. Гэта была шчырая і немнагаслоўная размова двух мужчын, двух бацькоў, якія добра разумелі адзін аднаго. Размаўлялі напаўголаса. Калі мы з Пясоцкім зайшлі, у зямлянцы апрача камбата былі палітрук Лазебны і камандзір прыбора Віктар Вальноў. Яны стаялі каля стала над картай і горача, як два вялікія стратэгі, абмяркоўвалі становішча на франтах. Я заўсёды зайздросціў гэтаму дасціпнаму масквічу — нашаму другу Віктару, яго ўменню ў любых абставінах, з любымі людзьмі трымацца проста, незалежна — з камандзірамі, з жанчынамі, са старэйшымі і малодшымі — і хутка ўключацца ў агульную размову, заваёўваць агульную ўвагу.

Цікавы чалавек наш палітрук. Ён бясконца ходзіць ад адной гарматы да другой, на прыбор, да сувязістаў і развед-

чыкаў і праводзіць гутаркі — расказвае эпізоды з гісторыі рускай ваеннай славы, пра гераізм Чырвонай Арміі, пра становішча на франтах. Цікава расказвае. Ён амаль ніколі не маўчыць. І, нягледзячы на гэта, складаецца такое ўражанне, што Лазебны самы ціхі, маўклівы і непрыкметны чалавек на батарэі. Чаму так — не магу зразумець. Можа, таму, што ён ніколі не крычыць, не павышае голасу? Да размовы палітрука з Віктарам адразу далучыўся Сеня. Яны разбіралі Жлобінска-Рагачоўскую аперацыю; складалі планы, як будзе развівацца контрнаступленне нашых войск далей.

— Вашы далёка адгэтуль? — спытаў мяне Сеўчанка, прыслухоўваючыся да іх размовы.

— Не, недалёка... Хоць усё-такі... На поўдзень ад Рэчыцы. Амаль на мяжы з Украінай...

— Палескія балоты не дазволілі ім развіваць наступленне ў гэтым напрамку,— сказаў Лазебны, пачуўшы мае словы.

Я радасна скалануўся. І праўда ж, там Палессе, балоты, там яны не змогуць прайсці. Як я забыўся на такую важную акалічнасць? Можа, таму і Саша піша так спакойна.

— Вось Жлобін, вось Рагачоў... Значыцца, наступленне развіваецца на Оршу. А на поўначы нашы ў раёне Полацка. А пасярод укліннліся яны, на Смаленск... Агалілі свае флангі. Вось тут іх можна і разануць! І ў мяшок! — горача выкладваў Віктар свой стратэгічны план.

— Тваё месца, Віця, у генштабе, а не на прыборы,— сказаў Сеня жартам, але з прыкметнай іроніяй — ён не любіў пустых размоў на такія тэмы.

Палітрук уздыхнуў:

— Але, на карце ўсё лёгка. А яны ўсю Еўропу кінулі на нас... І так нечакана...

— Учора пісьмо атрымаў,— даверліва прызнаўся я Сеўчанку.— Пісала трэцяга ліпеня — і ні слова пра тое, што ў іх там...

Ён усміхнуўся, паправіў палкай паленне ў печцы.

— Умеюць берагчы ваенную тайну і наш спакой... Мая вунь таксама піша...— Але што піша, так і не сказаў. Раптам прапанаваў мне папяросу. Я збянтэжыўся, быццам у тым, што не куру, ёсць нешта заганнае, што прыніжае маю сталасць і годнасць. Упершыню я пашкадаваў, што не куру.

Сеня пачаў курыць у першыя дні вайны — навучылі сябры ўсё пад тым жа лозунгам: «Куры, усё адно вайна».

Я павесялеў, калі ўбачыў, што палітрук таксама не курыць: за тры тыдні я нічога не ўведаў пра гэтага чалавека, хоць ён штодзень па некалькі разоў прыходзіў да гарматы.

Сеўчанка перасеў ад печкі на канапу, закінуў свае дужыя, мускулістыя рукі за галаву і сашчапіў пальцы на патыліцы.

— Давайце, браткі, хвіліну... адну хвіліну адпачнём ад вайны,— папрасіў ён «стратэгаў», якія ўсё яшчэ лазілі па карце.

У дзіўнай усмешцы скрывіліся вусны палітрука.

— Ты думаеш, Васіль Паўлавіч, гэта можна — адпачыць ад вайны?

— Паспрабуем,— незадаволена, нібы адчуваючы няёмкасць за сваё жаданне, адказаў Сеўчанка і звярнуўся да Сені: — Прачытайце, Пясоцкі, што-небудзь.

Сеня стаў пасярод зямлянкі, падумаў хвіліну і пачаў чытаць, без сарамлівасці, без позы — проста, як па кнізе, крыху нават манатонна:

По діброві вітер віе,
Гуляє по полі,
Край дороги гне тополю
До самого долу...

Я глядзеў на Сеўчанку. Ён заплюшчыў вочы, і вусны яго ледзь прыкметна варушыліся, мабыць, ён паўтараў словы ўслед за Сенем. Але калі той прачытаў аб тым, што «палюбила чорнобрива козака дівчина», а казак пайшоў на вайну і загінуў, Сеўчанка, відаць, успомніў верш, бо расплюшчыў вочы, вусны яго перасмыкнуліся, як ад болю, ён сказаў вінавата:

— Не трэба, Пясоцкі.

— А ты хацеў адпачыць ад вайны,— зноў крыва ўсміхнуўся палітрук.

Мне не спадабалася гэтая яго ўсмешка.

— Што-небудзь, не такое сумнае,— не адказваючы Лазебнаму, папрасіў камандзір.

Сеня задумаўся.

— З Шаўчэнкі? — не ведаў ён нічога вясёлага ў таго, хто быў песняром гора і смутку народнага.

Нехаця я ішоў сюды, на гэты нязвыклы збор, з хваляваннем, напружана чакаў сваёй чаргі, доўга і пакутліва думаючы, што прачытаць. Вырашыў прачытаць «Курган» Купалы; некалі ў тэхнікуме атрымаў за яго першы прыз. Але ж гэта таксама сумна. Што ж прачытаць не такое сумнае? Я ведаў многа лірычных вершаў — Труса, Уткіна, Галоднага. Але ў той час быццам скразняком выдзьмула іх з маёй галавы — ніводнага радка не мог успомніць.

— Вы ўкраінец, Пясоцкі? — спытаў Лазебны.

— Не, я жыў на Украіне. З мамай.

— Не перашкаджай яму, Мыкола,— папрасіў Сеўчанка.— Хай прыгадае.

— Давайце я вам прачытаю Блока і... Ясеніна. Хочаце? — сказаў Віктар, проста, па-свойску, быццам ён не ў афіцэрскай зямлянцы, ■ сярод сяброў-курсантаў, там, на вучэбнай батарэі.

Віктар адышоў да дзвярэй, прытуліўся плячамі да касяка, дастаючы стрыжанай галавой да самай столі, паглядзеў на закапцелую бэльку.

Ён пачаў чытаць вершы, якія я чуў упершыню. Наша пакаленне, асабліва людзі тэхнікі, розныя механікі і дарожнікі, як я, грэшны, слаба ведаюць Блока, крыху больш Ясеніна, да якога, мне здаецца, мы праяўлялі не зусім здаровую цікавасць, бо ў бібліятэцы яго ўзяць было нельга. Некалі я заплаціў аднаму спекулянту амаль сваю тыднёвую стыпендыю, каб ён даў на адну толькі ноч зашмальцаваны томік Ясеніна; усю ноч, да раніцы, я ўпотай перапісваў вершы ў сшытак, парушаючы ўмову.

Віктар чытаў Блока.

Гэта нешта незвычайнае!

Я не запамінаў слоў, бо яны здаваліся незямнымі, асаблівымі, хоць, калі ўдумацца, усе — вельмі простыя рускія словы, ніводнага незразумелага. Але я тады не думаў пра гэта. Вершы зачароўвалі. Яны то ўзнімалі некуды высока ў блакіт, дзе былі цішыня і спакой, то спускалі ў сутарэнне, у холад, сціскаючы сэрца смуткам. Яны прыносілі радасць, святло і адначасова трывогу і страх. Але ніхто не пярэчыў, ніхто не прасіў прачытаць што-небудзь вясёлае.

Я не бачыў, як слухалі іншыя, я забыўся на іх. Слухаў і, «окруженный сказками пчел», быў недзе там, дзе «море

клевера»... чуў голас: «Я памагала Ані ўбіраць канюшыну». Памагала і слухала казкі пчол? А мяне клікаў вецер з Поўначы... Вецер з Поўначы!

«Лениво и тяжело плывут облака...» Цяжкая дарога ў мяне. Але недзе далёка чуецца песня... І, каб не гэты голас — не твой голас! — я, напэўна, не здолеў бы дайсці. А так дайду! Я прыйду да цябе, я абавязкова прыйду да цябе, Саша! Потым нешта страшнае: плача дзіця, па полі ідзе гарбаты, над яго гарбом рагоча нехта, кашлаты, крывы і рагаты. Гэта — як дзіўны сон. Незразумелае, але і ў незразумелым ёсць цудадзейная сіла і хараство.

— О Божа, як гарна! — прастагнаў нехта.

Гэта — Сеўчанка. Ён сядзеў усё ў той жа паставе, закінуўшы рукі за галаву, заплюшчыўшы вочы. Шэптам паўтараў:

И приняла, и обласкала,
И обняла,
И в вешних далях им качала
Колокола.

Гэтыя радкі мне запомніліся.

Потым Віктар чытаў Ясеніна.

І раптам Лазебны, перапыніўшы яго, пачаў чытаць Маякоўскага — «Сяргею Ясеніну». Камісар, напэўна, успомніў свой абавязак палітработніка; хацеў засцерагчы нас ад шкоднага ўплыву ясенінскага песімізму. Я разумею: нельга спяваць паніхідную па «головушке», калі ідзе такое змаганне. Але як хвалююць іншыя вершы! Нараджаюць столькі думак, успамінаў! І мар, добрых, светлых мар, ад якіх праходзіць усякі сум і хочацца жыць, вельмі хочацца жыць!

Сеўчанка глянуў на палітрука з іранічнай усмешкай. Сеня паківаў галавой, ухваляючы,— ён любіць Маякоўскага, у яго ранцы ляжаць два томікі паэта, якія мы чыталі разам, калі былі курсантамі. Потым і Сеўчанка пачаў слухаць уважліва, сур'ёзна. Палітрук чытаў, бадай што, лепш за ўсіх, па-мастацку, выразна і прачула — адліваў кожнае слова.

Сеўчанка сказаў радасна, са шчырым дакорам:

— Мыкола, японскі бог! Жывём у адной зямлянцы, і ты хаваў такі талент! Ай-я-яй! Як табе не сорамна, дарагі! Ай-я-яй!..

— Які талент? Глупства! — засаромеўся і пачырванеў Лазебны.

— Слухайце, хлопцы! Камісар! А чаму нам не арганізаваць сваю самадзейнасць? — нечакана прапанаваў Сеўчанка.

Я сяджу пад замшэлым каменем, ахутаны густым туманам, такім густым, што працягні руку — і не відаць пальцаў, і думаю: дзіўная рэч жыццё! І людзі дзіўныя. Учора падалі бомбы, смерць вісела, лётала над галовамі. Заўтра будзе тое ж самае, калі не горш. І ўсё адно ў кароткую перадышку людзі чытаюць вершы і думаюць пра самадзейнасць.

Вяртаючыся ад камбата і не дайшоўшы колькі крокаў да гарматы, я пачуў галасы. Палова разліку адпачывала ў зямлянцы, тры чалавекі, на ўсякі выпадак, павінны былі дзяжурыць, і таму не было нічога дзіўнага ў тым, што байцы размаўлялі. Але мяне спыніў абураны голас Астахава:

— Калі ты, свіння гэткая, яшчэ раз палезеш у чужы ранец, я распішу твой пашпарт так, што родная маці не пазнае.

— А што я, красці палез? — агрызнуўся Муха.

— А хто ведае! Калі палез, то мог і ўкрасці,— гарачыўся Чарняк.

— Ды ну вас! Што там красці! — хіхікнуў Муха.— Самі цікавіліся, што ён увесь час піша. Вось я і хацеў зірнуць...

— Ах ты, сукін сын! — зноў загудзеў Астахаў.— Выходзіць, мы вінаваты? Мы на словах цікавіліся, але не палезлі ў ранец...

— Ды чытаць чужыя пісьмы — гэта горш, чым красці! — горача даводзіў Чарняк.

— А гэта не пісьмы.

— Не разумею я, Муха, ці ты дурань, ці хам...

— А ён сумяшчае і тое, і тое...

— Ну, ну...

— Не «нукай», я табе не конь... Складзі ранец і пакладзі на месца, пакуль камандзір не вярнуўся. А то будзеш чырванець перад строем...

На хвіліну стала ціха. Муха, відаць, выконваў загад Астахава. Потым пачуўся яго нязлосны, бурклівы голас:

— Падхалімы вы.

— Што ты сказаў? — зашыпеў Астахаў.— Паўтары!

— Пусці,— спалохана папрасіўся Муха.

— Калі ты не ведаеш, колькі важыць мой кавальскі кулак, то магу паказаць.

— Не чапай ты, Павел, яго — смярдзець будзе,— прымірэнча сказаў Чарняк.

Прызнацца, дагэтуль я крыху баяўся, што хто-небудзь прачытае мой дзённік. Праўда, ад гэтага засцерагалі неразборлівы почырк і беларуская мова, якую ведаў адзін Чарняк. Але засцярога гэта не такая ўжо надзейная. Цяпер я супакоіўся: на варце маёй тайны стаяць добрыя, шчырыя хлопцы. А намеснік мой — Муха — сапраўды нікчэмны чалавек. Ніякага аўтарытэту не мае. Трэба папрасіць, каб намеснікам зрабілі Астахава. Але Малашкін моцна падтрымлівае Муху. Зноў будзе крычаць, што я не ўмею выхоўваць людзей. Ды і не люблю я нагаворваць на сваіх. Няхай будзе Муха!

Нехта нячутна падышоў і горача дыхнуў мне ў вуха. Я спалохана адхіснуўся, але зірнуў і засмяяўся. Гэта — Лёша, наш батарэйны алень. Я ласкава абняў яго за шыю. Ён палізаў мае рукі, панюхаў сшытак і таксама хацеў лізнуць, пачухаў бок аб камень.

Цікавае стварэнне!

Ён прыблудзіўся на батарэю яшчэ зімой і, як расказваюць, быў пестуном гарматных разлікаў. Ішло нават своеасаблівае спаборніцтва паміж разлікамі — хто заваюе яго любоў. Мае хлопцы клянуцца, што яны трымалі першынство, што да іх у Лёшы была самая гарачая любоў, што ён нават начаваў у катлаване нашай гарматы. Гэтак жа, прыкладна, гаварылі і другія разлікі. Толькі прыборшчыкі не маглі пахваліцца — іх алень чамусьці не любіў. Але вайна ўсё змяніла. Першыя стрэлы моцна напалохалі няшчасную жывёліну: Лёша пачаў абыходзіць гарматы і пазбягаць сваіх старых сяброў.

Дзіўна ён паводзіць сябе цяпер. Цішыня — мірна пасецца дзе-небудзь за агнявой пазіцыяй, у нізінцы, паміж каменнямі; яго ўжо двойчы гараджане намерваліся ўкрасці, і ён, як бы ведаючы гэта, ніколі не адыходзіць далёка ад батарэі. Трывога — што ёсць сілы ляціць у цэнтр пазіцыі, да каманднага пункта, становіцца побач з камандзірам, магчы-

ма, яму здаецца, што гэта — самае бяспечнае месца, стаіць, насцярожана ўзняўшы свае цудоўныя рогі, і дрыжыць усім целам. Сеўчанка расказваў, што ў першыя дні гэтыя дрыготкі жывёлы выводзілі яго з раўнавагі, перашкаджалі камандаваць. Але потым усе звыкліся з такімі паводзінамі Лёшы. Цяпер алень памагае разведчыкам. Калі ён падымае галаву і пачынае насцярожана прыслухоўвацца, так і ведай, што недзе далёка-далёка ідуць самалёты.

Разведчыкі і прыборшчыкі выкарысталі яго страх перад гарматамі і пераманілі Лёшу да сябе.

«Несумленна,— злуюць хлопцы,— Лёша ж не разумее, што ў гэтых грымотах вінаваты фашысты, а не мы, ён — што дзіця, і пераманьваць яго подла».

Мне было смешна, калі я чуў такую крыўду, якую выказвалі зусім сур'ёзна і нават такія цвярозыя, сталыя людзі, як Астахаў і Фрыд.

Сёння алень парадаваў іх. Мабыць, супакоіўшыся за гэтыя ціхія туманныя дні, ён нясмела падышоў да нашай гарматы, стаў крокі за тры, вінавата апусціў галаву, як бы просячы прабачэння за свае паводзіны. Хлопцы аддалі яму рэшту свайго хлебнага пайка, а самі вячэралі без хлеба.

Цяпер ён падышоў да мяне. Стаіць, глядзіць, як я пішу, ківае галавой, зрэдку ўздыхае. Мне смешна ад яго ўздыхаў і наогул весела і ўтульна, цёпла побач з ім. А туман усё гусцее. Стынуць рукі.

2 жніўня

Раніцой прыйшоў да мяне Сеня з кіслым выглядам — не то засмучаны, не то нечым занепакоены. Сеў на лапу, закурыў.

— Не куры ў катлаване. Снарады. Гэта табе не дальнамер.

— Нічога тваім снарадам не зробіцца. Іх, каб хацеў, не падпаліш.— Але папяросу скамячыў, сунуў у карабок з-пад запалак.

Я працаваў. Каторы дзень, у перапынках паміж баямі, батарэя будуе новыя зямлянкі — кожны разлік каля сваёй гарматы ці прыбора, каб можна было па трывозе выбягаць

за якія секунды. Пакуль дзяўблі камень, працавалі нехаця, асабліва лайдачылі Муха і Фрыд. Але калі пачалі самую зямлянку — будаваць сцены, класці падлогу, столь, усіх ахапіў будаўнічы азарт. Людзі засумавалі па працы, якая не разбурае, а стварае. Выявілася, што Габаў — цясляр, Фрыд — абіўшчык, а Астахаў наогул майстар на ўсе рукі. У нас будзе найлепшая зямлянка — самая прасторная і прыгожая. Камандзіры іншых аддзяленняў прыходзілі да нас павучыцца. Мне здалося, што Сеня прыйшоў з такой жа мэтай. Мабыць, у яго не ладзіцца з будаўніцтвам. «Інтэлігентны разлік», усе там такія, як камандзір,— прыйшлі ў армію са школьнай парты. Трэба схадзіць памагчы ім.

— Бачыш, які палац будуем,— сказаў я, паказаўшы на зямлянку.

— А навошта? — зморшчыўся ён.— Усю вайну на адным месцы ваяваць хочаце, ці што?

— Ты чаму сёння такі?..

Ён дастаў папяросу.

— За нейкі месяц ты стаў заядлым курцом.

— Кідала прыязджае.— І Сеня зламаў папяросу.

— Сцяпан? Да нас?

— Камандзірам узвода кіравання.

— Фу, чорт! Але чаму ты спалохаўся?

— Я не спалохаўся. Але ведаеш... не люблю гэтага чалавека, і ў мяне стала неспакойна на душы. А я казаў табе... хачу, каб у душы ўсё было ясна: вораг ёсць вораг, свой — друг.

— А наліха табе дружба яго? Ты — агнявік, ён — разведчык. Няхай займаецца сваёй справай. У цябе — свой камандзір...

Гадзіны праз дзве з'явіўся Кідала. Я адразу ўбачыў яго на камандным пункце: высокі, плячысты, у новенькай гімнасцёрцы, у камандзірскай шапцы ён здаваўся генералам, асілкам побач з маленькім хударлявым Малашкіным.

Відаць, званне ім прысвоілі адначасова: Малашкін толькі ўчора ўвечары начапіў пятліцы малодшага лейтэнанта. Мы віншавалі яго. Ён бянтэжыўся, як дзяўчына, і чамусьці злаваўся: накрычаў на Муху за брудны каўнерык, на камандзіра трэцяй гарматы — за рыззё для чысткі, якога ў нас заўсёды не хапае цяпер.

Кідала яўна любаваўся сваім новым становішчам камандзіра ўзвода, выстаўляў сябе напаказ: казыраў адменна, на ўсю батарэю стукаў абцасамі і дакладваў камбату такім грамавым голасам, што, мусіць, было чуваць у горадзе.

— Што гэта за дыякан з'явіўся? — спытаў Астахаў.

Мне зрабілася смешна — дужа трапнае вызначэнне.

— Мой зямляк. Мы разам у тэхнікуме вучыліся.

— О-о! — шматзначна працягнуў Астахаў.

Гэты каваль хітры, як чорт, ён усё разумее і бачыць наперад.

Кідала не падышоў да гарматы, і я не пайшоў да яго, каб павітацца.

Але калі батарэя абедала, дзяжурны разведчык закрычаў:

— Камандзір чацвёртага — да камандзіра ўзвода кіравання!

— Зямляк у госці кліча,— пажартаваў Муха, як заўсёды, хмурна буркнуўшы, быццам сам сабе.

Кідала быў адзін у зямлянцы камандзіраў узводаў. Яшчэ за дзвярамі я набраў поўныя грудзі паветра і, пераступіўшы парог, выпаліў без запінкі, з'ядаючы яго вачамі:

— Таварыш малодшы лейтэнант! Па вашаму загаду сяржант Шапятовіч з'явіўся.

Ён выслухаў даклад да канца, стаўшы «смірна», сур'ёзна сцяўшы вусны. Але твар... які твар у яго быў у той момант! Не, твар яго не ззяў, ён пасінеў ад натугі стрымаць усмешку задавальнення, радасці, самалюбавання. Аднак стрымацца яму было цяжка — усмешка пырснула са сцятых вуснаў і распаўзлася па ўсім шырокім здаровым твары, ажно заблішчалі адтапыраныя вушы.

— Давай без фармальнасці,— працягнуў ён руку.— Мы з табой старыя сябры. Не адзін пуд солі з'елі разам. І, бачыш, зноў нам быць разам. Лёс! Сядай.

Ён сеў, і я прымасціўся насупраць, на табурэце.

Ён уздыхнуў:

— Застаўся я, Пеця, без дамоўкі. Занялі, відаць, фашысты мае Парычы. Ніводнага пісьма не палучыў, як вайна пачалася.

У мяне балюча ёкнула сэрца. Але ні спачуваць яму, ні выказваць свой боль не мог. І толькі апусціў галаву. Мы

памаўчалі. Мне стала шкада яго, і ў душы зацяплілася прыязнасць: у нас аднолькавы лёс.

— Ну, як ты жывеш тут? — спытаў ён.

— Нічога. Ваюем.

— Батарэя добрая. На КП хвалілі. Як камандзір?

— Сеўчанка? Залаты чалавек.

— У цябе ўсе залатыя. Я цябе ведаю. Помніш, ты ў тэхнікуме ўсё фізіка Бруя хваліў? А яго пасадзілі... Я заступіўся за цябе на камсамольскім сходзе, а то паказалі б табе кузькіну маць. Помніш?

Ад маёй прыязнасці да яго нічога не асталося.

— Дзіўныя ў цябе пераскокі — ад камбата да Бруя.

— Якія пераскокі? — спалохаўся ён.— Што ты! Я проста ўспомніў. А Сеўчанку я сам добра ведаю, не раз сустракаліся раней...

Ён паглядзеў на мяне недаверліва. Мы зноў памаўчалі.

— А нацьдземчык наш як тут ваюе?

— Хто? — не зразумеў я.

— Дружок твой.

Адразу ўспомнілася ўся гісторыя ў першы дзень вайны. Сенеў страх перад гэтым чалавекам, які ён выказаў сёння раніцой.

Я абурана падняўся:

— Які ён табе нацдэмчык?

— Ён усё вершыкі чытае. Нямецкім цікавіцца... І ўвогуле — чыстаплюйчык.

Я адпіхнуў нагой табурэт, на якім сядзеў, і наблізіўся да Кідалы.

— Слухай, Сцяпан, ніяк не разумею — хто ты?

Ён пагрозліва варухнуўся:

— Ну, ну...

— У тэхнікуме я лічыў цябе чалавекам... Што табе трэба ад Пясоцкага?

— Нічога мне не трэба. Да слова прыйшлося.

— Май на ўвазе... Калі ты зноў будзеш чапіцца да яго... Што ён зрабіў табе? Больш ведаў мае? «Нямецкую мову вывучае... вершыкі чытае... назвы лінкораў ведае...» Сорам! Ты ж культурны чалавек. Адным словам, я не буду маўчаць, калі ты... І Сеўчанка падтрымае мяне, гэта табе не Сідарэнка, перад якім ты падхалімнічаў...

Ён стаяў ужо, афіцыйна выцягнуўшыся, з надзьмутачырвоным тварам. Я чакаў, што вось-вось закамандуе: «Смірна!», «Кругом!» — ці што-небудзь накшталт гэтага; я не здзівіўся б, каб ён гэта зрабіў. Але ён сказаў яшчэ даволі мірна:

— Камандзіраў асуджаеш? Не забывай...

— Каго я асуджаю? Цябе? Ды калі ты мяне паклікаў як друга, як земляка, то давай так і гутарыць... Шчыра... А калі як старшы, камандзір, дык я вас слухаю, таварыш малодшы лейтэнант! — Я выцягнуўся таксама, стукнуў абцасамі.— І размова скончана!

Ён засмяяўся:

— Чаго ты кіпіш? Нічога да твайго Пясоцкага я не маю. У мяне цяпер без яго хопіць спраў... Сувязь, разведка, НП... Я жартам сказаў, а ты ўсхадзіўся, як... халодны самавар,— не надта дасціпна пажартаваў ён.— Сядай, пагутарым...

Але прыйшоў Малашкін з лагарыфмічнай лінейкай у руках, па-вучонаму ўглыблены ў нейкія падлікі. Перашкодзіў размове. І я не пашкадаваў, нават узрадаваўся. Не хочацца мне гутарыць з Кідалам па-сяброўску, хоць мы некалі два гады пражылі ў адным пакоі і сябравалі.

7 жніўня

Час ад часу я правальваюся ў чорную бездань, у якой, аднак, не сціхае кананада, але перастае існаваць навакольнае. Толькі страшнае крывавае месіва ўвесь час перад вачамі... Нічога не хочацца, толькі цішыні, адну хвіліну цішыні, такой, каб на ўсё забыцца. Сёння яны пакуль што не прылятаюць, але цішыні няма — у галаве гудзе і грукоча. Пазаўчора яны таксама прыляцелі ў другой палавіне дня, учора — крыху раней.

Кажуць, пазаўчора іх было шэсцьдзесят. Не веру. Іх было сотні. Магчыма, шэсцьдзесят прыляцелі адразу. Але хто падлічыў, колькі падыходзіла потым? Пасля першага масіраванага ўдару ўсёй армады з дыму, сажы і пылу, якія падняўся над горадам, яны доўга яшчэ выныралі па тры, па два, па адным, кідалі бомбы на Колу, на аэрадром, на голыя скалы.

Ствол гарматы зрабіўся чорны, і яна пад канец не страляла, а «пляваласяв»: снарады рваліся над нашымі галовамі, хоць трубкі ўстанаўлівалі на значныя дыстанцыі. Фашысты не атакавалі батарэі, яны проста кідалі бомбы, куды папалі, каб знішчыць усё жывое ў горадзе і навокал яго. Адна фугаска разарвалася каля трэцяй гарматы. У нас абвалілася зямлянка, у катлаван паляцелі пустыя скрынкі з-пад снарадаў, якія я выкідаў на бруствер. Скрынкамі збіла з ног Фрыда. Мяне аглушыла. Я не помню, ці было сумяшчэнне, ці лавіў цэль Муха, бо страціў не толькі слых, але і іншыя пачуцці. Але адно запомнілася — Астахаў. Шырока разявіўшы рот, ён нецярпліва хапаў снарады і... страляў, страляў бясконца. Твар у каваля быў страшны. Здавалася, яго немагчыма спыніць. І сапраўды, толькі тады, калі бледны Малашкін моцна штурхнуў яго ў плечы, паказваючы на ствол, дзе пухіркамі ўзнялася фарба, Астахаў знясілена апусціў рукі. Камузвода нешта закрычаў. Я паказаў на свае вушы. Ён паказаў рукой на трэцюю гармату. Я глянуў і ўбачыў, што яна перакулена набок.

— А людзі? Што з людзьмі? — Не помню, спытаў я гэта ці толькі падумаў.

Астахаў пайшоў за Малашкіным. Я механічна рушыў за імі.

Людзі, нашы сябры... трое ляжалі на вытаптанай сцежцы, там, дзе разлік звычайна строіўся па камандзе «За гармату!». Ляжалі ў рад, быццам перад гэтым пастроіліся, потым упалі на спіны, тварамі ў дымнае неба, дзе ўсё яшчэ гулі самалёты. Я пазнаў дваіх: Панкоў, Хамідаў. У трэцяга не было твару — крывавае страшнае месіва. Потым я даведаўся, што гэта быў чацвёрты нумар — Лісіцын, вясёлы і наіўны хлопец, які званчэй за ўсіх смяяўся. Мне зрабілася млосна, крывавая пляма паплыла перад вачамі. Нехта клікаў мяне, нехта стагнаў — санінструктар перавязваў раненых. Я не бачыў іх. Як у тумане, вярнуўся да сваёй гарматы і сеў на зямлю. Схамянуўся толькі тады, калі нехта закрычаў: «Вады!» Каму вады? Абапёршыся на бруствер, задыхаўся Астахаў, ірваў на сабе гімнасцёрку. Праўда, прыступ яго цягнуўся нядоўга — нейкую хвіліну. Ён злосна адкінуў карэц з вадой, што працягнуў яму Чарняк, выпрастаўся, папраявіў рэмень

і пачаў па-гаспадарску выціраць затвор. Але як счарнеў, змяніўся яго твар! І вось ужо двое сутак ён маўчыць. Мы ўсе маўчым. Я чую галасы, як праз шум блізкага вадаспаду. У вушах горача, а ў вачах — быццам пяску насыпана. Заплюшчу вочы — бачу вясёлы твар Лісіцына, а потым — гэтая жудасная крывавая калатуша. Пакутліва.

Учора Сеня Пясоцкі сказаў на нарадзе камандзіраў:

— Чаму нам не далі пахаваць нашых сяброў? Куды іх павезлі? Існуе вайсковая традыцыя: падраздзяленне само хавае загінуўшых...

Сеўчанка ўзлаваўся і накрычаў на Сеню, чаго ён умешваецца куды не трэба — камандаванне ведае, што рабіць...

А пасля нарады падышоў да дальнамера, сеў на бруствер, сказаў ціха, з болем:

— Пясоцкі, не развярэджвай ран у душы. Думай, што не ў аднаго цябе яны баляць. У мяне яны таксама баляць. Не чапай... Што адбылося, тое адбылося. Вайна. Раны трэба гаіць як мага хутчэй.

Сеня зразумеў яго душэўны стан і папрасіў прабачэння.

Сеўчанка махнуў рукой:

— Пры чым тут прабачэнне!

І доўга сядзеў моўчкі, углядаючыся перад сабой у прастору.

Здавалася, што пасля двухдзённай бамбардзіроўкі ў горадзе не асталося нічога жывога. Але ўначы прайшоў дождж, патушыў пажары, асадзіў пыл і дым... І вось ён, горад, зноў перад намі, скалечаны, але жывы. На станцыі манеўруе паравоз, перацягвае вагоны. У порце паварочвае свой доўгі хобат, быццам нешта вынюхвае, пад'ёмны кран. Па заліве шныраць катэры. На вуліцах, як мурашкі, бегаюць людзі. Многа людзей. Убачыў усё гэта — і лягчэй стала на душы. Адчулася стома. Упершыню за двое сутак захацелася легчы і паспаць, каб толькі яны сёння не прыляцелі!

14 жніўня

Жанчына на батарэі!

Голас яе, пявучы, зусім не вайсковы, нейкі хатні, мірны, даляцеў, быццам з іншага свету, быццам у сне. Байцы

пакінулі чысціць пушку і, як буслы, выцягнулі шыі, выглядаючы з катлавана — хто, адкуль?

— Ваенфельчар з санчасці,— растлумачыў Фрыд, які заўжды пра ўсё даведваўся першы.

— Голас прыемны,— адзначыў Астахаў.

— Вунь яна ідзе з камбатам.

— А косы, хлопцы, якія! — захапіўся Чарняк.— Глядзіце! Пілотка і косы!.. Прыгожа!

— І ў спадніцы! Не ў штанах,— заўважыў Муха.

Мне не спадабаліся такая іх цікаўнасць і рэплікі, асабліва Мухавы.

— Разгаворчыкі! Рыхтуйце снарады! І не вельмі распускайце языкі!

Хлопцы пераглянуліся здзіўлена, перасмыкнулі плячамі.

«Што мне да гэтай незнаёмай жанчыны! І ўвогуле ніводная жанчына ў свеце не можа цікавіць мяне!» Так я думаў у тую хвіліну. Але, здаецца, я хітрую сам з сабой, бо калі прызнацца шчыра, дык усё-такі дзяўчына зацікавіла мяне. Калі ўбачыў, што яна абходзіць з санінструктарам разлікі — пабылі на прыборы, на дальнамеры,— то адчуў, што чакаю яе, хвалююся, нават баюся, каб не мінула нашай гарматы. Думаў: «Што мне з таго, што яна наведаецца? Спытае пра здароўе, чаго добрага, пачне праверку на вашывасць, прычэпіцца да чаго-небудзь...» — і ўсё адно чакаў. Сачыў за ёй — куды яна пойдзе?

Здарылася так, што ад прыбора яна накіравалася да нас.

Я закамандаваў: «За гармату!»

Хлопцы выскачылі, як грэшнікі з пекла, пастроіліся, як ніколі, падцягнутыя, пукатагрудыя, з надзьмутымі ад затоеных усмешак тварамі.

— Кру-гом! Смірна! Таварыш...

Яна збянтэжылася, пачырванела, замахала рукамі:

— Не трэба! Што вы...

— Сам радавы,— пажартаваў санінструктар Алёша Спірын, якога мы перахрысцілі ў «Аспірын» і любім за грубаваты гумар і своеасаблівае лекарскае мастацтва — усіх лячыць аднымі лекамі, не зважаючы ні на якія назначэнні і ўказанні ваенурача.

— Добрай раніцы вам,— прывіталася яна зусім не па-вайсковаму.

Хлопцы не ведалі, як адказаць на такое прывітанне, і адказалі хто як мог. Я ўспомніў пра разлік, што людзі стаяць на «зважай», і, не даючы больш ніякіх каманд, бо перад гэтым мірным стварэннем знікла ўсё вайсковае, энергічна махнуў рукой: разыдзіся!

У катлаване яна ветліва запрасіла байцоў сесці. На шчоках у яе, і без таго ружовенькіх, загарэліся пятакі. Гэта зрабіла яе твар вельмі прывабным. Хоць увогуле яна не прыгажуня: востры носік, шэрыя маленькія вочкі, жывыя, як у звярка, ненатуральна белыя, як пятроўскі парык, валасы, заплеценыя ў дзве кароткія касы. Але чырвань на шчоках, бянтэжлівасць, сарамлівая ўсмешка — колькі ў гэтым жаночага!

З наіўнай, амаль дзіцячай цікаўнасцю яна агледзела нашу «гаспадарку», але ні пра што не спытала, што датычылася гарматы. Спытала пра здароўе — якія скаргі? Габаў сказаў, што ў яго баляць зубы. Сапраўды, у яго балелі зубы. Муха сказаў, што ў яго баліць жывот. Ніколі раней ён на свой жывот не скардзіўся, а даволі часта прасіўся збегаць на кухню, каб «перайграць» — выпрасіць у кухара дадаткова кацялок супу ці порцыю смажанага марскога акуня, якім нас кормяць штодзённа.

Мне зрабілася сорамна перад дзяўчынай, такой няўмелай і далікатнай, за Мухаву хлусню. Я бліснуў на яго вачамі, але той і брывом не павёў.

— Хлусіць, сукін сын,— прашаптаў я Спірыну.

— Няхай. Каму не хочацца, каб жаночая рука памацала твой жывоцік,— адказаў Аспірын такім шэптам, што пачулі ўсе, і ваенфельчар таксама, бо на шчоках яе зноў загарэліся пятакі.

Я адвярнуўся, каб не бачыць, як Муха раздзяваецца і як яна будзе мацаць яго худы жывот.

— Брудная бялізна, санінструктар,— заўважыла яна.

Мне і за бялізну стала сорамна, быццам я вінаваты ў тым, што яе не часта мяняюць.

— Многа копаці, таварыш ваенфельчар,— адказаў Аспірын.

«Якой копаці? Вось д'ябал, ён здзекуецца з яе нявопытнасці!» — узлаваўся я на санінструктара.

— Пакажы сваю ножку,— сказаў ён мне.

Дзён колькі назад у часе бою я абдзёр аб снарадную скрынку нагу. Ранка, на якую спачатку не звярнуў увагі, забрудзілася, пачала гнаіцца. Нага балела. Але скардзіцца на такі боль гэтаму незвычайнаму лекару ў мяне не было ніякага намеру, я нават не падумаў пра гэта. Пачаў аднеквацца.

— Не, пакажыце,— нечакана настойліва патрэбавала яна.

Я сеў на лапу, зняў бот. Ваенфельчар стала перада мной каленьмі на ўтаптаную, жорсткую зямлю, сама зняла павязку. Асцярожна пачала націскаць пальцам на калена. У яе была прыгожая рука, маленькая, пухлая, з ямачкамі над костачкамі пальцаў. Мне нясцерпна захацелася пагладзіць гэтую руку. Я не стрымаўся і асцярожна дакрануўся да яе.

— Баліць? — спытала дзяўчына.

— Не,— адказаў я і нечакана для сябе даверліва паведаміў: — У мяне жонка фельчар.

— Вы жанаты? — здзіўлена глянула яна на мяне.— Такі малады?

— І дачку маю,— адказаў я з гонарам.

Але гэта не зрабіла на яе большага ўражання, чым тое, што я жанаты. Яна сказала з тонкай іроніяй — дзяўчаты часта так гавораць:

— Шчаслівчык,— і пачала корпацца ў сваёй новенькай сумцы з чырвоным крыжам.— Трэба будзе яму кампрэс спіртавы на ноч пакласці. Чуеце, Спірын?

— Кароткія ночы, таварыш ваенфельчар,— зноў-такі здзекліва хмыкнуў той.

Чарняк, які стаяў побач і не зводзіў вачэй з дзяўчыны, бліснуў сваімі негрыцянскімі зубамі.

Шчокі ў яе зноў загарэліся. Як бы адчуваючы маю прыязнасць і падтрымку, яна даверліва ўзняла вочы.

— І дзе яна... ваша сям'я?

— Там... Відаць, ужо там... Пісьмы больш не прыходзяць...

— Там? — Вочы яе спалохана расшырыліся, з жалем і здзіўленнем глядзела яна на мяне. Упершыню ўбачыла чалавека, у якога родныя, блізкія асталіся там, за лініяй фронту,

у фашысцкай няволі. І я зноў адчуў усю глыбіню сваёй трагедыі. Каб яна пачала спачуваць, я, мабыць, расплакаўся б, бо слёзы былі блізка, комам стаялі ў горле, горкія, салёныя. Але яна моўчкі пачала бінтаваць нагу.

Аб'явілі трывогу. Ішоў разведчык. Бусоль і дальнамер давалі каардынаты. Паўз гармату, пачуўшы звон гільзы, прамчаўся наўскач Лёша.

— Глядзіце, алень! — па-дзіцячы закрычала ваенфельчар.

— Наш алень,— раўніва адказаў Габаў.

Другі Лёша — санінструктар — непрыкметна знік, забыўшыся на сваё начальства. Гэты мядзведзь баяўся гарматных стрэлаў, у яго «баліць ад іх галоўка».

— Будзеце страляць? — спытала.— Можна мне пабыць з вамі?

Больш не было ваенфельчара, асталася дзяўчына, якой хацелася пабыць у самым небяспечным месцы, дзе сапраўдная вайна, і якой, аднак, не ўдавалася перамагчы свой страх: абяскровіліся вусны і шчокі, нервова тарганулiся вейкі.

Усе мы зведалі гэты страх. І ўжо некаторыя забыліся на яго. Муха, баязлівец Муха, якога я некалі шыбануў з сядзення, глядзеў цяпер на дзяўчыну з насмешкай. Мне хацелася даць яму па мордзе.

Весці агонь па разведчыку для нас цяпер — што «семкі лускаць», як сказаў Чарняк. Хлопцы выконвалі свае абавязкі спакойна, нават весела.

Але дзяўчыну першы стрэл аглушыў. Паветраная хваля сарвала пілотку, ускудлаціла белыя валасы. Яна выпусціла сумку, заціснула рукамі вушы, твар скрывіўся ад жаху і зрабіўся непрыгожы, як у старой бабулі. Я ўзяў яе за руку і адвёў да Астахава, дзе хваля ад стрэлу не так біла. Але там яе спалохала гільза, якая вылецела пад ногі і дымілася.

— Ой! — ускрыкнула яна.

Я мацней сціснуў яе маленькую руку, адпіхнуў гільзу нагой. На яе шчасце, зрабілі ўсяго пяць залпаў. Разведчык развярнуўся і пайшоў назад, набіраючы вышыню.

Ваенфельчар глядзела на нас, як на герояў.

Забыўшыся на субардынацыю, я ціха спытаў:

— Як ваша імя?

— Антаніна Васільеўна... Тоня... Тоня!

Потым схамянулася — успомніла сваё становішча, свой страх, на які яна не мела права па статуту, і, невядома за што падзякаваўшы, хуценька пайшла.

Муха чамусьці хіхікнуў.

Чарняк сказаў:

— Прыгожая.

Астахаў, збіраючы гільзы, уздыхнуў і... нечакана прачытаў вядомы радок з Някрасава:

— Доля ты, русская долюшка женская!

22 жніўня

Боль. Боль у сэрцы. Я думаў, што людзі гавораць так, каб вобразна перадаць пачуццё гора, смутку... Баліць сэрца? Не, яно не баліць. Яно проста сціскаецца і робіцца ў два-тры, можа, у пяць разоў меншае, і яму цяжка — яно не прыносіць бадзёрасці, упэўненасці, радасці. Яно сціскаецца — і ў чалавеку ўсё замірае, насцярожваецца. Гэта страшней за любы фізічны боль...

Раніцой, як заўсёды, першы абышоў разлікі камісар.

— Якія навіны, таварыш палітрук?

Мы прывыклі да благіх навін і ўжо не баімся іх: верым, што будзе пералом. Я спытаў бадзёра, бо ноч была ціхая і доўгая. А што трэба, як жартуюць хлопцы, салдату: добры харч ды доўгі сон!

Лазебны неяк асабліва паглядзеў на мяне і адказаў не адразу:

— Пасля жорсткіх баёў нашы войскі пакінулі Гомель.— Ён сказаў так, быццам і для яго гэта быў самы дарагі горад.

Чаму яно сціснулася, дурное сэрца? Хіба я не чакаў гэтага? Не, гэтага нельга чакаць, як нельга чакаць смерці і думаць пра яе, бо тады не было б як жыць. Увесь час жыла надзея: а можа, пералом наступіць да таго, як гэта здарыцца? Можа, іх затрымаюць там, на Дняпры? Нават калі некалькі дзён назад паведамілі аб здачы Смаленска — дзе Смаленск! — яна ўсё яшчэ цяплілася, мая надзея. А цяпер?

Камісар гаварыў нешта пра стратэгію, пра неабходнасць выраўніваць лінію фронту — я не чуў. Я слухаў уласнае сэрца — як яно сціскалася.

Пайшоў да Сені. Ён сядзеў на скрынках з-пад дальнамера і курыў. Па выразу твару, па смутку ў вачах я ўбачыў, што ён ведае, таму я нічога не сказаў. Доўга сядзелі моўчкі. Ніколі мы так падоўгу не маўчалі, гэта не ўласціва нам. Ад маўчання зрабілася яшчэ цяжэй, і я паспрабаваў супешыць яго і сябе:

— Будзем спадзявацца, што яны эвакуіраваліся.

— Будзем спадзявацца,— коратка адказаў ён і запаліў другую папяросу.

26 жніўня

Два «Месершміты-110» доўга лазілі паміж навакольных сопак. Мы спрабавалі абстраляць, але яны хадзілі так нізка, што снарад пацэліў у вяршыню гары. А там маглі быць людзі. Невядома была мэта гэтых шакалаў. Што яны вынюхваюць?

— Яны дачакаюцца, пакуль падымецца Сафонаў,— гаварылі байцы.— Ён пакажа ім, чым пахнуць сопкі.

Кумір наш — Сафонаў — лётаў цяпер на новенькім вастраносым «мігу» і, хоць мы яго ні разу не бачылі, не забываў пра нас: час ад часу пралятаў над батарэяй, прывітальна махаў крыламі. Але цяпер знішчальнікі не падымаліся, і «месеры» паводзілі сябе ўсё больш нахабна.

Батарэя напружана сачыла за кожным іх манеўрам. На КП сабраліся ўсе афіцэры. Там жа стаяла і Рамашова, ваенфельчар. Яна трэці раз ужо на батарэі і ніколі не прамінае маёй гарматы. Сустракаемся мы цяпер, як добрыя знаёмыя, і гутарым проста, па-сяброўску. Адзін раз нават, «памыліўшыся», я назваў яе Тоняй. Яна зрабіла выгляд, што не заўважыла. Цяпер асмялела і ўвесь час пра нешта пыталася — чуўся яе пявучы галасок. Ёй адказваў Сцяпан Кідала, яго ёмкі бас гудзеў у цішыні, як звон, хоць гаварыў ён напаўголаса.

Побач з Сеўчанкам, які не спускаў вачэй з ворага, насцярожана стрыг вушамі Лёша, высока ўзняўшы свае маладыя прыгожыя рогі.

Гарматы ўвесь час паварочваліся па азімуту — наводчыкі не выпускалі цэляў. І вось самалёты, як акулы, разышліся,

сышліся, слізганулі ўніз, бліснуўшы крыламі, развярнуліся...

— Па самалёту!..

Міг, адзін усяго стрэл, «месеры» са звонам і свістам, так нізка, што тузанулася паветра, пранесліся над батарэяй. Муха што ёсць сілы пачаў круціць паваротны механізм, каб развярнуць гармату.

І раптам:

— Лажы-ся-а! — нязвыклая, незразумелая каманда, якой мы ніколі не чулі.

— Лажыся-а! — другі раз Сеўчанка закрычаў аднекуль з глыбіні, быццам з-пад зямлі.

Я высунуўся з катлавана. На КП, на прыборы, дальнамеры нікога не было відаць — усе ляжалі. Адзін Лёша стаяў па-ранейшаму і спалохана нюхаў паветра. Што здарылася? Чаму ўсе ляжаць? Ах! Я паваліўся ніц як падкошаны і таксама закрычаў дзікім голасам:

— Лажыся!

Паміж гарматай і КП, бліжэй да прыбора, ляжала бомба. Мне здалося, што яна варушыцца, сунецца.

Секунда... другая... Ціха.

— Што такое, камандзір? — спытаў Астахаў.

— За нашым брустверам — бомба.

— Бомба? — Фрыд падхапіўся, відаць, хацеў бегчы, уцякаць.

Астахаў стукнуў яго кулаком па шыі і прыціснуў да зямлі.

— Куды, вар'ят? Жыць абрыдла?

Праходзіць хвіліна. Калі ж яна, падла, узарвецца? Агіднае адчуванне.

Чарняк не вытрымаў (ён ляжаў з другога боку гарматы), выглянуў і паведаміў:

— Ляжыць.

Я вылаяўся:

— Я табе павыглядваю, цыганская твая душа!

І раптам — блізкі звонкі голас:

— Ды дапамажыце ж хто-небудзь, ліха на вас!

Я падхапіўся і пахаладзеў: каля бомбы, падняўшы яе на «папа», стаяў Сеня Пясоцкі. Ён думаў, што гэта «пяцідзе-

сятка», і хацеў, відаць, узваліць яе на плечы. Але чурка аказалася стокілаграмовай, такі цяжар яму быў не па сіле, і ён клікаў на дапамогу.

Пайсці? Страшэнна брыдкі холад кальнуў у пяты і аддаўся ў мозгу. Уявілася: цела, маё цела, жывое, маладое, разлятаецца крывавымі шматкамі. Брр... Ляснулі зубы.

«Баязлівец! — вылаяў я сябе.— Ідзі!»

Пакуль я гэтак змагаўся сам з сабою, побач з Сенем апынуўся... Кідала. Яны скрыжавалі рукі, паднялі смертаносны груз і панеслі за пазіцыю.

Уся батарэя адразу ўзнялася на ногі. Забыўшыся на небяспеку, байцы вылезлі на бруствэры і не зводзілі заварожаных позіркаў з двух смельчакоў. Але ніхто — ні гуку. Людзі нясуць смерць, ідуць, быццам па танюсенькай вяровачцы над безданню. Ні словам, ні ўздыхам, ні кашлем нельга перашкодзіць ім у такі момант!

Яны занеслі бомбу ў балоцістую нізіну, асцярожна паклалі на пажоўклы мох і гэтак жа павольна, не спяшаючыся, рушылі назад. Ішлі ў нагу, плячо ў плячо; адзін высокі, дзябёлы, другі — Сеня — на галаву ніжэйшы, можа, таму ён больш энергічна махаў рукамі.

Першы не вытрымаў Сеўчанка — закрычаў дзіўным голасам, хрыпла, зрываючыся:

— Бя-гом! Бісавы дзіты!

Пясоцкі і Кідала адскочылі адзін ад аднаго і, нахіліўшыся, пабеглі.

— Бягом! Японскі бог! Ходзіце, як па бульвары. Я вас навучу бегаць! — грымеў камбат, хоць, безумоўна, яму хацелася абняць і пацалаваць гэтых «бісавых дзітэй».

Бомба не ўзарвалася. Праз гадзіну яе разрадзілі сапёры, якіх выклікалі з горада.

Калі агульная ўзрушанасць і захапленне нарэшце ўтаймаваліся, я пайшоў да Сені і сказаў, што таксама хачу паціснуць яму руку.

— Без лішніх слоў. Як друг...

Ён схаваў свае рукі за спіну і злосна адказаў:

— Пайшоў ты!.. Абрыдла мне.— Але ўбачыў, што ашаламіў мяне, загаварыў больш лагодна: — Навошта з мяне рабіць героя? Гераізм — гэта свядомае і разумнае. А я не

свядома, ды і не вельмі разумна... Ты думаеш, я смелы такі? Глупства! Я баюся смерці, як ты, як усе. У мяне і цяпер дрыжаць калені. Чаму я падхапіўся? Проста парыў... Стала непрыемна, крыўдна, абразліва, што мы нюхаем зямлю з-за нейкай адной паршывай бомбы... Я глянуў — ляжыць, маленькая такая... Не помню... Мажа, захацелася паказаць сябе, вось які я, палюбуйцеся! — Ён крыва ўсміхнуўся.— Дзяўчына побач стаяла... Які ж тут гераізм?..

— Дарэмна ты,— запярэчыў я.— Гэта ўсё твой самааналіз... Ты абавязкова хочаш усё ўсвядоміць, знайсці вытокі і прычыны — чаму, навошта?.. Добра, гэта парыў. Але высакародны парыў. І я здымаю шапку... «Безумству храбрых поем мы славу! Безумство храбрых — вот мудрость жизни!» Так, здаецца, сказаў чалавек, якога мы з табой аднолькава любім?

— Так-то так, але ўсё адно на душы пагана чамусьці.

— Пагана! Вось у мяне сапраўды пагана,— прызнаўся я, адказваючы на шчырасць шчырасцю.— Я падхапіўся, калі ты клікаў на дапамогу. Я прымушаў сябе пайсці... І не здолеў — збаяўся... Дык ведай, што лепш адчуваць сябе героем, чым баязліўцам...

Ён паглядзеў на мяне крыху здзіўлена, задумаўся:

— Я не адчуваю сябе героем. І ты не лічы сябе баязліўцам. Смешна, каб усе кінуліся да гэтай праклятай бомбы.

— Але Сцяпан малайчына!

— Так, калі хочаш ведаць, дык у яго гэта бадай што гераізм, ён пайшоў свядома. А я, дурань, нават не падумаў, што не здолею падняць яе...

Мы доўга гутарылі на гэтую тэму, спрачаліся. Маё развярэджанае сумленне ён, здаецца, супакоіў.

Заўтра нас павінны прымаць кандыдатамі ў члены партыі. Я сказаў, што вось ён напярэдадні гэтай падзеі даказаў сваё права быць у радах партыі, а я, наадварот, пераканаўся, што не здольны на самаахвярны подзвіг, што я па сутнасці яшчэ баязлівец. Дык, можа, каб быць шчырым, варта сказаць пра свае сумненні таварышам? Сеня сказаў, што я дурань, што гэта мая выдумка, якая выходзіць з таго ж корпання ў душы, у якім я абвінавачваю яго, што мяне могуць нават узняць на смех. Падумаўшы, я згадзіўся з ім і крыху

супакоіўся. Але я яго не разумею, магчыма, упершыню не магу зразумець: чаму ён як бы незадаволены сваім учынкам? Я, безумоўна, ганарыўся б, каб аднёс з пазіцыі бомбу, і адчуваў бы сябе героем...

6 верасня

Нас перакінулі на той бок заліва, на заходні. Шкада было абжытых зямлянак, у якія нашы знаходлівыя сувязісты нават правялі з горада электрычнасць. Утульна нам жылося, цёпла. Муха бурчаў: якая розніца, дзе будзе стаяць батарэя, з якога боку страляць. З ім моўчкі згаджаліся. Але калі адразу ж пасля таго, як занялі баявы парадак, Сеўчанка пачаў трэніроўку — у гэты раз не па самалёту, а па... танках і пяхоце, змоўк нават Муха, і ўсе непазнавальна змяніліся: зрабіліся маўклівыя, засяроджаныя, пільныя.

У мінулую ноч, ясную, марозную (так, ужо мароз!), мы бачылі з нашай высокай сопкі далёкія зарніцы на паўночным захадзе. Гэта фронт. Дзе ён? Ніхто нічога пэўнага не кажа, ні камісар, ні камандзір. Па вузкай камяністай дарозе, што пятляе сярод сопак, сёння ішла пяхота. З цяжкімі ранцамі за плячамі, з вінтоўкамі. Яны глядзелі на батарэю і крычалі нешта насмешлівае, магчыма, абразлівае. Хлопцы балюча ўспрымаюць гэта. Лаюцца. Не на тых, безумоўна, што пайшлі туды, дзе бліскаюць зарніцы і адкуль многія з іх не вернуцца. Лаюцца наогул — у бога, у Гітлера. Цяжкімі ламамі мы трэці дзень дзяўбём скалу, граніт, капаем катлаваны і зямлянкі. На руках крывавыя мазалі. Кароткі адпачынак — трэніроўка па наземных цэлях. Батарэя трымае пад прыцэлам лагчыну, па якой адыходзіць удаль дарога. Пяхота можа абысці па лясістых сопках, але танкі могуць рухацца толькі па гэтай дарозе, іншых шляхоў тут няма. Няўжо яны прарвуцца і сюды? Тады мы павінны будзем стаяць насмерць. Кожны дзень, кожную гадзіну і хвіліну я рыхтую сябе да гэтага — памерці, але не збаяцца, не адступіць. Пры сваім росце я дрэнна зараджаю, калі нізкі вугал узвышэння — не дастаю. Упарта трэніруюся. Вучу іншыя нумары. Многае будзе залежаць ад трапнай наводкі і тэмпу агню. Я прапанаваў, каб прыборшчыкі таксама вучыліся наводзіць і страляць.

Страху няма. Таго страху, які быў у пачатку вайны. Але адчуваецца нейкі як бы цяжкі смутак расставання з нечым дарагім.

Сёння пайшоў снег. І ўсё навокал пакрылася ўрачыстай, некранута сарамлівай беллю. Усё, акрамя заліва, які стаў яшчэ чарнейшы, ажно блішчыць, як дзёгаць. Не люблю глядзець на гэтую чарнату. Дыхае магілай. Няўжо зіма? У пачатку верасня? Не было ж восені, не паспелі нават брусніцы, якіх тут, на сонцы, хоць граблямі зграбай. Чырвона-зялёныя ягады засыпае снег. Ад гэтага таксама робіцца сумна. І думаецца, у нас, дома, яшчэ, па сутнасці, лета; восень ледзь-ледзь кранае першай пазалотай лісце бяроз і асін. Дома! Што робіцца сёння там, дзе наша дамоўка?

11 верасня

Сёння Сеўчанка і камісар раптам вырашылі арганізаваць канцэрт батарэйнай самадзейнасці, які мы рыхтавалі. Гэта было неспадзявана і незразумела. Людзі смяртэльна змораны: тыдзень дзяўблі скалу, будавалі зямлянкі, трэніраваліся, вялі баі, бо налёты ў апошнія дні даволі частыя.

Муха бурчаў:

— Паспаць далі б, а не песнямі частаваць... Галоднаму не да песень.

У глыбіні душы нават я падтрымліваў яго, хоць канцэрт мяне цікавіў — у ім удзельнічала Тоня Рамашова. Можа, камбат знарок выбраў такі выпадак, каб упрыгожыць канцэрт адзінай жанчынай. Яна прыехала раніцой паклапаціцца аб нашым здароўі. Пасля налёту не прыйшоў катэр, і яна вымушана была астацца начаваць.

Было даволі холадна, хоць апошнія дні пацяплела і снег растаў. Байцы збіраліся марудна, незадаволеныя; Сеўчанка мусіў выклікаць усіх па камандзе: «Батарэя, строіцца!»

Размясціліся ў цэнтры пазіцыі. «Акцёры» выступалі з узвышэння, на якім звычайна стаяў і сачыў за небам разведчык. Рана змерклася, бо пад вечар з мора прыплылі цяжкія хмары, надвор'е тут мяняецца ўвосень кожную гадзіну. Было дазволена курыць, і слухачы, якія сядзелі паўкругам хто на чым, большасць — на пустых снарадных скрынках, курылі, і ўспышкі цыгарак асвятлялі іх твары.

Першых выканаўцаў сустрэлі стрымана. Я цешыў сябе думкай, што здзіўлю батарэйцаў «Песняй аб Сокале» і — асабліва — «Дарогамі Смаленшчыны»; верш гэты моцна крануў мяне, я запомніў яго, прачытаўшы два-тры разы, і схаваў у ранец адзіны экзэмпляр газеты, каб ніхто больш не чытаў да майго выступлення.

«Песні...» вяла папляскалі, і зноў пры зямлі, пад нахіленымі постацямі, успыхнулі запалкі.

— Мне прыкурыць, Сухараў!

— Муха, не тушы!

— Дакурыць, Павел!..

Адна за адной загараліся цыгаркі. Я стаяў і ў думках лаяў сваіх сяброў, якіх дагэтуль любіў: чэрствыя людзі! Ім бы толькі курыць ды мацюкацца, ніякага адчування прыгожага. Паважалі б хоць Горкага!

«Дарогі...» чытаў, і самому хацелася плакаць, голас дрыжаў, перарываўся. «Дарогам... не апладзіравалі зусім, толькі чамусьці згаслі цыгаркі і зрабілася ціха-ціха. Ці не ляцяць самалёты? Не, Лёша фыркнуў у цемры бестурботна, спакойна, а ў яго самы тонкі слых, ён чуе шум матораў першы.

Я сеў за «сцэнай», на зямлянцы разведчыкаў, і, ашаломлены няўдачай, пакрыўджаны і ўсхваляваны, задумаўся і не вельмі слухаў іншых. І раптам выбух апладысментаў. Каму? Завошта? Віктар Вальноў спяваў пад акампанемент гітары.

Яму крычалі:

— Біс!

— Паўтарыць!

— Давай яшчэ!

Мне зрабілася сорамна: няшчасны эгаіст, я не чуў нават, што спяваў сябра, а сам патрабую нейкай асаблівай увагі і прызнання!

Ён паўтарыў «Воротился ночью мельник».

«Хітры масквіч ведае, чым можна зацікавіць людзей у такі момант — жартам, гумарам. Смутку, цяжкага роздуму хапае і так»,— падумаў я. І зноў памыліўся.

Выйшлі Сеня Пясоцкі і сувязіст Лабада. Заспявалі:

Ой, там, за лісом, за дубиною,
Сидів голубко з голубиною...

Голуба забілі, а галубку завезлі за Дунай, у палон. Сыплюць ёй пшанічку, прапануюць любога з дваццаці галубоў, але ніхто ёй не любы, бо няма такога, як яе быў мілы. Гэта пра нашых каханак, жонак, што засталіся там, у фашысцкім палоне. Пра Сашу. Я адчуваў слёзы на вачах, слухаючы песню.

Заапладзіравалі не адразу, быццам чакалі працягу — што ж далей? А потым пляскалі доўга, дружна, горача, без крыкаў, без просьбы паўтарыць, але з удзячнасцю, якая адчувалася ў саміх воплесках.

Узрушаны, я зноў апынуўся там, у родным краі, і зноў не слухаў нашых выканаўцаў. Вярнула мяне назад, на батарэю, у фантастычны паўкруг агеньчыкаў, Антаніна. Яна заспявала песню, якую кожны з нас тысячу разоў чуў і спяваў сам:

Дан приказ: ему на запад...

Нічога асаблівага не было ў яе спеве — танклявы, слабы, «бясколерны», як сказаў адзін музыка, голас. Але батарэя раўла ад захаплення. Біс крычалі так гучна, што чуваць, напэўна, было далёка. Бо раптам, бліснуўшы ў хмарах, на нас, як шабля, упаў прамень пражэктара. Дзіўна выглядала ўся гэтая карціна — слухачы і спявачка — у белым, яркім святле. Асабліва спявачка. Я апынуўся ў цені, па-за праменем, і лепш, чым іншыя, бачыў яе — у ботах, кароткім шынялі, без шапкі, шапку яна трымала ў руцэ... Дзівосныя былі яе валасы: ненатуральна белыя ўдзень, яны ў святле пражэктара сталі блакітныя і, здавалася, ззялі.

Свяціў ваенны карабель. Свяціў доўга — секунд сорак, відаць, і там пражэктарысты любаваліся ёй. І ўвесь гэты час не сціхалі апладысменты. Яна бянтэжылася, жмурылася, закрывала твар рукой, хацела збегчы з пляцоўкі, але камісар утрымаў яе за руку.

Калі пражэктар згас, яна спявала валагодскія прыпеўкі.

Колькі гарачых размоў было пасля канцэрта! Хлопцы мае ап'янелі: забыліся на стомленасць, вочы блішчалі, гаварылі голасна, перапынялі адзін аднаго, смяяліся.

— Адна жанчына, а колькі шуму! — сказаў Астахаў з усмешкай дарослага, які апынуўся сярод дзяцей, і пажартаваў: — Недарма Сталін гаворыць: жанчына — вялікая сіла.

— О жанчыны! — як бы ў роспачы прастагнаў Фрыд. У добрым настроі ён заўсёды крыху тэатральны.

— У мяне, хлопцы, пяць сясцёр, а я адзін,— раптам паведаміў Муха, пра гэта ён раней маўчаў. У любы іншы час Чарняк, востры на слова, не прамінуў бы, каб не пакпіць з Мухі, якога недалюбліваў. Але тут папаўся сам: раптам, без дай прычыны, прызнаўся:

— Скончыцца вайна, вярнуся дадому — адразу ж ажанюся.

З яго пасмяяліся.

Я маўчаў.

Байцы радаваліся, а мне рабілася чамусьці сумна.

Астахаў сказаў:

— Чаму, камандзір, нахмурыўся? Калі і ў такія хвіліны хмурыцца, цяжка будзе ваяваць...

Ужо многія гавораць так: замест жыць — ваяваць. Быццам нам наканавана ваяваць усё жыццё.

Вячэралі з большым, чым звычайна, апетытам, хоць меню тое ж — аўсяная каша і салёная траска, якая страшэнна абрыдла. А пасля вячэры ў зямлянку нечакана зайшла яна, ваенфельчар. Хто з хлопцаў прылёг — адразу ўсхапіліся; спім мы, не раздзеючыся, і нават разувацца мае права толькі палавіна разліку.

Яна крыху збянтэжылася і як бы пачала апраўдвацца:

— Ішла з кухні, вырашыла паглядзець, як у вас тут, на новым месцы.— Агледзелася навакол.— Што ж, прасторна, чыста. Можна жыць...

Фрыд прыбавіў агню ў «маланцы», зробленай са снарада МЗА[1].

Астахаў ветліва запрасіў, падставіўшы табурэцік, які сам змайстраваў:

— Сядайце, таварыш ваенфельчар!

Яна села і спытала, як спадабаўся канцэрт.

— О, о! Цуд!

— Вы нам падаравалі столькі прыемных хвілін...— надзіва красамоўна пачаў хваліць яе Муха — гэткі галантны кавалер.

---

[1] МЗА — малакаліберная зенітная артылерыя.

— А вам, Шапятовіч, не спадабалася? — звярнулася яна да мяне.

— Мне? Я сам удзельнічаў у канцэрце і, як няўдалы акцёр, цяпер перажываю...

— Што вы, камандзір! Вы добра чыталі! — пачалі суцяшаць мяне хлопцы.

Яна засмяялася і раптам прапанавала:

— Давайце разам праспяваем што-небудзь. Я люблю спяваць.

Заспявалі «Там, вдали за рекой». Але большасці з нас, як кажуць, «мядзведзь наступіў на вуха». Выходзіла не надта складна, хоць словы ўсе ведалі. Я прапанаваў паклікаць Сеню Пясоцкага і Віктара Вальнова з гітарай. Яны прыйшлі, і ўсё пайшло на лад. Што-што, а весялосць гэтыя хлопцы ўмеюць арганізаваць. Сабралася дружная кампанія добрых сяброў, звязаных цяпер нечым большым, чым звычайная дружба, вясёлая дзяўчына прынесла з сабой тое, чаго не хапала нам многія месяцы, — паэзію ў спевах, высакародства ў жартах. Мы спявалі ўсе разам і па чарзе, хто што ўмеў. Разам — рускія песні; я, Сеня і Чарняк — беларускія, Фрыд праспяваў яўрэйскую — у яго тонкі слых і добры голас. Віктар зноў чытаў Ясеніна. Антаніне спадабалася; яна прызналася, што раней не любіла вершаў.

У зямлянцы зрабілася душна. Мы адчынілі дзверы.

І раптам у праёме іх, унізе, куды падала святло, з'явіліся наглянцаваныя хромавыя боты. Злосны бас з вышыні кінуў словы-загад:

— Што тут за вечарынка? Дэмаскіравалі ўсю пазіцыю! Спаць! Сяржант Шапятовіч!

— Слухаюся, таварыш малодшы лейтэнант!

Гэта Сцяпан Кідала, дзяжурны камандзір. Ён знік, не заглянуўшы, не паказаўшы твару.

Груба абарвалі нашу весялосць. Мне зрабілася да слёз крыўдна. Ды і ўсім іншым было няёмка перад дзяўчынай. Усе маўчалі.

Яна сказала, апранаючы шынель:

— Жыццё ваеннае...

Я ўзяў ліхтарык для начной установкі трубак і выйшаў, каб правесці яе да камандзірскай зямлянкі, дзе камісар уступіў ёй свой ложак.

Чорная зямля, чорнае неба, ніводнай прасветліны. Толькі на тым баку заліва, у порце, гойдаецца маленькі агеньчык, магчыма, нехта гэтак жа, як мы, асвятляе сцежку. Аклікаюць адзін за адным вартавыя: «Хто ідзе?», хоць пасля першага нашага адказу ўсе чулі, хто ідзе.

— Не люблю я гэтага чалавека,— сказала Антаніна, калі Сеня і Віктар развіталіся каля сваёй зямлянкі.

Я зразумеў — каго. Не адказаў. Спаткнуўшыся аб камень, яна ўзяла мяне за рукаў.

— Ён мне любоўнае пісьмо напісаў.

— Кідала? — здзівіўся я, і мне стала надзвычай весела, хацелася зарагатаць.

— О, каб вы ведалі, колькі мне пішуць пісем! Усе маладыя камандзіры прызнаюцца ў каханні.

Весялосць мая адразу знікла. Я адчуў, як адразу сцьмеў, стаў зямным, нецікавым яе незвычайны вобраз, створаны маёй фантазіяй. З'явілася такое адчуванне, што як бы падманулі мяне ў нечым, злосна пажартавалі з маёй даверлівасці і юнацкай узнёсласці.

«А ты і рада гэтаму, дурная авечка? Табе хочацца, каб усе прызнаваліся табе ў каханні. Ну і вешайся на шыі сваім камандзірам!»

Мне не хацелася, каб яна расказвала пра гэта далей, адкрывала свае сардэчныя тайны. Навошта мне слухаць іх?

Спыніліся каля камандзірскай зямлянкі.

На паўночным захадзе палыхнула далёкая зарніца.

Антаніна неяк баязліва прытулілася да майго пляча.

— Страляюць? Страшна.

— Страшна, што страляюць за дзесяткі кіламетраў? — з іроніяй спытаў я.

— Я не за сябе баюся. За вас.

— За мяне?

— За цябе... І за ўсіх... Калі яны прарвуцца, вам не будзе куды адступаць. Заліў не пераплывеш.

Да гэтага мы былі гатовы, не адзін раз гутарылі паміж сабой. Іншае паласнула мяне па сэрцы, балюча і адначасова прыемна,— гэтае яе першае «ты», «за цябе», якое яна сказала шчыра, як мог бы сказаць блізкі чалавек, добры друг. Заўсёды робіцца цяплей на душы, калі ведаеш, што нехта

побач трывожыцца за цябе. Гэта зноў зблізіла нас. Я дараваў ёй пісьмы. «Хіба яна вінавата, што пішуць! Яна адна, прыгожая... Ды ўрэшце, што мне да яе асабістых сардэчных спраў?»

Каб больш нішто не парушала таго пачуцця, што было адноўлена, набыло ранейшую раўнавагу, я паспяшаўся развітацца. Моцна паціснуў яе маленькую гарачую руку.

— Добрай ночы вам, Антаніна Васільеўна.

— Добрай ночы... Пятро...

У цэнтры пазіцыі мяне спыніў Кідала — кінуў у твар святло ліхтарчыка.

— Выключы батарэйку! Разрадзіш,— загадаў ён.

Я моўчкі выканаў яго загад. У густой цемры мы не бачылі адзін аднаго, але я чуў яго дыханне, ён стаяў крокі за два. Успомніўшы пісьмо да Антаніны, я з цікавасцю чакаў, да чаго ён можа прычапіцца яшчэ. А што прычэпіцца — не сумняваўся.

— Што ж гэта ты?.. Так перажываў па жонцы, пакутаваў і ўжо заводзіш шуры-муры...

— Якія шуры-муры?

— Хэ! — непрыемна рагатнуў ён.— Уся батарэя гаворыць.

Я чакаў усяго, але толькі не гэтага. Дзікае абвінавачанне! Дзікія словы! У любых іншых умовах, абражаны за Сашу, за сябе, я, відаць, кінуўся б на гэтага тупагаловага цыніка з кулакамі. Але субардынацыя... І пісьмо... Я ўяўляў, як прызнаваўся ў каханні Сцяпан Кідала, «высокаправільны» чалавек, і мне рабілася чамусьці весела. Не трэба кулакоў. Але да д'ябла і пачцівую субардынацыю! Як ён, так і яму...

— Табе што — зайздросна? — са здзекам спытаў я.

Ён разгубіўся, бо замармытаў нешта незразумелае, ікнуў. Потым пагразіў:

— Я жонцы тваёй напішу.

Ён напіша маёй жонцы? Куды? Калі? Балюча мне стала ад думкі, што напісаць няма куды. Каб я ведаў, куды напісаць, дзе яна цяпер!.. Не трэба было б пісаць табе, Сцяпан Кідала! Я напісаў бы сам. Усё-ўсё, што запісваю ў гэты дзённік, і, можа, нават яшчэ больш падрабязна. Табе не зразумець, што я ніколі не таіў і нічога не стаю ад Сашы. Яна ўсё будзе ведаць: мае ўчынкі, думкі, абы вярнулася наша шчасце.

Але словы яго не выходзяць у мяне з галавы, хоць я ўжо трэці дзень запісваю падзеі таго вечара. «Шуры-муры...» Агіднае, абразлівае слова. «Уся батарэя гаворыць». Уся — хлусня; мае хлопцы нічога не гавораць, а адносіны ў нас простыя, сяброўскія, і яны, пэўна ж, не пасаромеліся б пакпіць з гэтай прычыны. Але, магчыма, некаму кінулася ў вочы, што Антаніна не прамінае маёй гарматы, калі бывае на батарэі. А я даўно, яшчэ ў тэхнікуме, заўважыў, што людзі не прызнаюць простай дружбы паміж жанчынай і мужчынам, заўсёды схільныя думаць чорт ведае што і пусціць плётку. Мне напляваць, што думае Кідала. Але яго недарэчныя падазрэнні абражаюць Сашу. А гэта мне балюча, я не хачу, каб ён нават успамінаў яе імя.

«Шуры-муры...» Дурань! Нічога ў мяне няма ні ў сэрцы, ні ў галаве, акрамя той цеплыні, якую заўсёды прыносіць жанчына, і ўдзячнасці за яе ўвагу. Яна адзіная прасветліна ў нашым аднастайным і небяспечным жыцці. Але калі людзі не разумеюць звычайнай чалавечай дружбы, няхай не будзе яе...

12 кастрычніка

Снег і агонь... Агонь і снег... Агонь на зямлі ад выбухаў бомбаў, бясконцых залпаў гармат. Калі яны на нейкі час сціхаюць, снег усё адно гарыць — свеціцца блакітным водбліскам ад пажараў, што шугаюць у горадзе. А калі і пажараў няма, агонь астаецца ў стомленых запалёных вачах. Неба, дай адпачынак! Але і там агонь. У нязмернай вышыні гулліва калышуцца, плывуць, то ўзнімаюцца, то апускаюцца, пераліваюцца д'ябальскі прыгожыя рознакаляровыя сцягі паўночнага ззяння. У мінулую зіму я любіў гэтае дзівоснае відовішча прыроды, якому няма роўных па прыгажосці. Цяпер не люблю. Мне здаецца, калі я гляджу на гэтыя пералівы святла, то неба смяецца з таго, што робіцца на зямлі. А хутчэй за ўсё не люблю таму, што ззянне — лепшае надвор'е для налётаў. У немцаў новая тактыка. Яны рэдка прылятаюць удзень, але затое лётаюць усю доўгую ноч. Лётаюць па адным, так, што ў небе, недзе там, у яснай бездані, дзе калышацца ззянне, — бясконцы шум матораў, то з аднаго, то з

другога боку. Страляем не па самалётах, страляем па шуму. Зрэдку драпежнік трапляе ў прамені пражэктараў, што паласуюць неба; тады пачынаецца агонь прыцэльны. Калі яны вешаюць над залівам і горадам «лампады» — б'ём па іх, каб пагасіць. А так увесь час вядзём загараджальны агонь. Я не веру, што можна «загарадзіць» неба. «Б'ём у белы свет, як у капеечку». Ад гэтага цяжка на душы.

Я думаю, што фашысты знарок выбралі такую тактыку, каб выматаць нашы сілы. Мы валімся з ног.

Фрыд учора крыкнуў:

— О неба, дай адпачынак! — І гэта не ў жарт.

За ноч выпальваем увесь боезапас. Узвод забеспячэння не ўпраўляецца падвозіць снарады. Трактар не ўзбіраецца на абледзянелую гару, і ў час кароткіх перадышак, калі не чуваць шуму матораў, цягаем чатырохпудовыя скрынкі, а прыборшчыкі робяць гэта амаль усю ноч. Ад скрынак распаўзаюцца кажухі, а спіны байцам абвугліліся — чорныя-чорныя сталі.

Учора, калі расход дасягнуў рэкорднай лічбы — каля шасцісот снарадаў за ноч, Астахаў пачаў разважаць:

— Кажуць, кожны наш стрэл каштуе каля трохсот рублёў. Праўда, камандзір? Дык гэта ж адна наша батарэя «выплюнула» за ноч добрых паўтараста тысяч рублікаў!

Мяне здзівіў такі падлік.

— На вайне рублі не лічаць, Астахаў. Мільярды гінуць.

— А дарэмна. Грошы народныя. Усё трэба лічыць.

Муха абурыўся:

— Ды што ты! Людзі гінуць, а ты рублі лічыш!

— Каб я быў упэўнены, што мы сваёй «загародай» ратавалі хаця б аднаго чалавека, то не шкадаваў бы... А так шкадую... Колькі людзі ўклалі ў гэтыя штукі працы,— паказаў Астахаў на снарады,— а мы іх у неба.

Між іншым, у спрэчках, якія ўзнікаюць у хвіліны зацішша, адзін Муха горача абараняе загараджальны агонь. Я хачу зразумець — чаму?

На нарадзе камандзіраў я расказаў пра падлікі Астахава — вось прыклад руплівай гаспадарлівасці байца! Гэтага чамусьці не зразумелі. Хворы Сеўчанка (камбат каторы дзень тэмпературыць, але не пакідае пазіцыі) стомлена сказаў:

— Менш лічыце, а лепш страляйце. «Не сыпце гарох». Залпы!

А Малашкін нечакана зрабіў вывад:

— Вы, Шапятовіч, развялі гнілую дэмакратыю ў аддзяленні. У вас кожны разважае за камандуючага. Палітыкі! Каб я не чуў гэтых размоў!

Крыўдна. За хлопцаў крыўдна. Без сну, на марозе яны не выказалі ніводнай скаргі. І размовы іх шчырыя, патрыятычныя. Як кажуць, баявы дух высокі. Асабліва ён узняўся пасля таго, калі камісар паведаміў, што фашысты добра атрымалі па зубах на подступах да Мурманска і адкінуты за Заходнюю Ліцу. Праз гэта яны шалеюць і так люта бамбяць горад і порт. А тут яшчэ, на злосць ім, у заліў увайшоў караван англійскіх суднаў — першая дапамога саюзнікаў.

Мацнее мароз. Сярэдзіна кастрычніка — і такі мароз. А там, у нас, гараць золатам лясы і, безумоўна, яшчэ цёпла. Роўна год назад я ішоў у армію. Саша праводзіла мяне далёка ў поле, па дарозе на Рэчыцу. Ранак быў ясны, сонечны, плыла павуціна бабінага лета, і ляцелі жураўлі. Усяго адзін год! А здаецца, мінула вечнасць. Колькі месяцаў яшчэ можа працягнуцца вайна? Астахаў неяк сказаў — два гады. Вар'ят!

19 кастрычніка

З падбітага намі «Ю-87» выкінуўся з парашутам лётчык. Прызямліўся кіламетры за два ад батарэі, на схіле голай гары.

Сеўчанка загадаў:

— Малодшы лейтэнант Кідала! Вазьміце разведчыка Бурава...— камбат на момант задумаўся, мяркуючы, даволі двух чалавек для такой аперацыі ці замала,— сяржанта Шапятовіча... Затрымаць немца!

Але калі мы ўжо сталі на лыжы, даў новую каманду:

— Адставіць Бурава! Сяржант Пясоцкі! Пойдзеце вы!

Відаць, камбату падказаў камісар (я бачыў, як яны ціха перакінуліся словамі), што трэба чалавек, які ведае нямецкую мову. А ведае яе адзін Сеня.

Мы шпарка пайшлі па свежым снезе, усе аднолькава задаволеныя такім заданнем — узяць жывога фашыста, які

толькі што скінуў бомбы на горад. На лыжах нас у мінулую зіму навучылі хадзіць добра, мы рабілі пераходы па сто кіламетраў. Але паспець за Кідалам нам з Сенем было нялёгка. Высокі, дужы, ён адразу вырваўся наперад.

Немец, вызваліўшыся ад парашута, адыходзіў на захад — узнімаўся на гару, каб пераваліць цераз грэбень і схавацца ў лесе; ён, безумоўна, бачыў яшчэ раней, з самалёта, што заходні схіл гары лясісты. Над ім пакружыў наш знішчальнік, даючы зразумець, што калі фашыст будзе ўцякаць, то яго лёгка могуць прышыць да скалы кулямётнай чаргой. І ўсё роўна ён упарта лез на гару.

— Вось гад! Куды ён лезе? На што спадзяецца?..

— Горы, тундра, снег... Уцячэ ад нас — па яго слядах пойдзе штурмавік-самалёт. Яму хочуць захаваць жыццё, а ён лезе на смерць,— абураўся я, ідучы побач з Пясоцкім.

— Ты не ведаеш, якія яны фанатыкі. Фашызм — гэта страшэнны фанатызм... Я не магу зразумець, як з такой працавітай цвярозай нацыі, як немцы, маглі выхаваць гэтулькі фанатыкаў-забойцаў,— разважаў Сеня. Яму хацелася пагутарыць, але было цяжка: беглі мы надзвычай шпарка, а вецер біў у твар, і Сеня задыхаўся.

Каля падножжа гары мы ўзялі лыжы на плечы. Немец ужо быў амаль на самай вяршыні.

— Дай папераджальны стрэл,— сказаў мне Кідала.

Я ўзлёг грудзьмі на камень, нацэліўся, але вышэй галавы, каб часам не забіць. Стрэліў. Немец азірнуўся і... раптам знік, відаць, скочыў у нейкую яму.

— Вось жа падлюга! — вылаяўся Кідала і выхапіў з кабуры пісталет, нібы намерыўся весці ў атаку цэлы полк.— За мной!

І зноў мы не паспявалі за ім. Ён быў лягчэй апрануты — у шынялі, мы — у кажухах. Ногі то слізгалі па голым абледзянелым камені, то, у горных упадзінах, угрузалі па калена ў снезе. Непамерна цяжкія зрабіліся вінтоўкі і лыжы. Пот заліваў твар, перад вачамі зіхацелі вясёлкі, сэрца стукала, здавалася, не ў грудзях, а ў горле. Я хапаў на хаду снег.

— Не еш, прастудзішся,— папярэдзіў Сеня.

— Калі ён ідзе гэтак жа, як мы, нам не дагнаць яго да ночы,— прахрыпеў я.

— Дагонім раніцой,— спакойна адказаў Сеня.

— Хіба Сеўчанка даў такую каманду?

— Была каманда ўзяць яго жывым.

Сказаўшы гэта, Сеня раптам ціха войкнуў, схапіўся за жывот.

— Што?

— Кальнула ў жывот. Боль... Вось тут.

Твар яго, дагэтуль расчырванелы, збялеў.

Я разгублена схіліўся над ім:

— Што ж рабіць? Можа, астанешся, пасядзіш, адпачнеш?..

Ён падняўся, абапіраючыся на маё плячо, усміхнуўся праз боль:

— Ну што ты! Кідала скажа, што я збаяўся.

— Скажа на цябе, пасля бомбы?

Дні тры назад генерал уручыў ім узнагароды за подзвіг з бомбай: медалі «За адвагу»; яны першыя ўзнагароджаныя на батарэі.

— Вунь, чуеш! — паказаў Сеня наперад.

Кідала, які апярэдзіў нас метраў на трыста, махаў пісталетам і крычаў, каб мы ішлі хутчэй.

— Пайшлі.— І Сеня першы рушыў далей. Я ішоў побач і бачыў, якія пакуты прыносіць яму хада.

— Заставайся,— настойліва раіў я.— Адгэтуль цябе ўбачаць з батарэі, зразумеюць, што нешта здарылася, прышлюць дапамогу.

Ён узлаваўся:

— Адчапіся, Пятро!

А праз хвіліну з палёгкай уздыхнуў, прыслухаўся і радасна, як дзіця, засмяяўся:

— Ну, вось і ўсё!

Мы пайшлі шпарчэй.

Кідала правільна разлічыў: мы дасягнулі перавала больш лёгкім шляхам — цераз седлавіну. А там у нас была перавага над ворагам — мы зноў сталі на лыжы. Лес пачынаўся ніжэй, і мы, павольна зніжаючыся, беглі па адкрытым месцы ўздоўж грэбеня, пакуль не выйшлі на след. Але ў лесе лыжы прыйшлося скінуць зноў: спуск быў залішне круты, камяністы. Немец, быццам знарок, лез праз самы гушчар, падлазіў пад кашлатыя заснежаныя елкі, скакаў з абрываў.

Не, ён проста бег, не выбіраючы дарогі, імкнучыся адысці як мага далей на захад. На што ён разлічваў, зразумець немагчыма.

Камандзір наш зноў паспрабаваў вырвацца наперад, але я астудзіў яго:

— Сцяпан, ён можа адстрэльвацца. Асцярожна.

Маё папярэджанне спадабалася яму, ён пайшоў побач з намі і гаварыў па-сяброўску проста. Мы ў адзін голас клялі фашыста, які прымушае нас траціць гэтулькі сіл на яго аднаго, паганца. І раптам... ціўкнула куля. Я першы нырнуў галавой у снег, крыкнуў:

— Лажыся!

Прыслухаўся да самога сябе, ці не паранены. На маё шчасце, куля трапіла ў лыжы! Вось жа фашысцкая брыдота! Траха не адаслаў на той свет. Моцна закалацілася сэрца. Наперадзе ляснуў яшчэ адзін пісталетны стрэл. Трэба падняць галаву, адпляваць снег, што набіўся ў рот, нос, працерці вочы, агледзецца, дзе ляжу і дзе вораг. Але падняць галаву было нялёгка: вельмі ж ужо моцна ў такіх выпадках зямелька прытуляе да сябе, нават і такая непрыветлівая, камяністая.

Збоку грымнуў вінтовачны стрэл. Гэта Сеня. Падбадзёраны, я нарэшце падняў галаву і адразу вызначыў месцазнаходжанне ворага: ён быў метраў за сорак наперадзе, за вялікім валуном, паабапал якога стаялі дзве каржакаватыя сасны. У яго была зручная пазіцыя, але ён рана пачаў страляць — не вытрымалі нервы. Угледзеўшы, што ляжу на адкрытым месцы, я адпоўз за бліжэйшы камень і адтуль паслаў кулю ў нябачнага ворага. Куля высекла іскру на валуне і са свістам зрыкашэціла.

— Пясоцкі! Не давай яму высунуцца! А мы з Пятром — у абход! Ты справа, я злева! — закамандаваў Кідала.

Я перапоўз да другога каменя, потым зрабіў перабежку, схаваўся за дрэвамі. У гэты момант Сеня крыкнуў па-нямецку.

Такая фраза ёсць у вайсковым «разгаворніку», і я зразумеў яе сэнс: здавайся — гарантуем жыццё і ўсё іншае.

Я чакаў, што немец адкажа. Стрэліць — няхай не спадзяецца на нашу літасць. Не, над валуном узняліся дзве рукі, у адной — рэвальвер, у другой — белая насавая хустачка.

— Комэн зі гір![1]

Ён выйшаў.

— Ласен зі дзі пістоле! Унд хэндэ хох![2]

Ён кінуў пісталет у снег і стаяў з узнятымі рукамі.

Першы падбег малодшы лейтэнант і даў яму па вуху. Немец упаў. Кідала пхнуў яго нагой. Я не асудзіў Сцяпана. За маю зямлю, якую яны захапілі, за шчасце, якое растапталі, за толькі што пераҗытыя напружанне і страх я, напэўна, зрабіў бы тое самае, каб апынуўся каля яго першы: злосці ў мяне было даволі. Але ляжачага я не мог бы ўдарыць. Акрамя таго, я адразу ўбачыў яго вочы: прыгожыя, блакітныя, яны былі напоўнены такім смяртэльным страхам, што мне зрабілася шкада яго. Гэта быў малады хлопец, бадай што наш равеснік, высокі, дужы, з даўгаватым тварам, вялікім ілбом — «тыповы арыец». Але без якіх-небудзь прыкмет ці рыс садыста, забойцы, якім стаў за апошні час у нашым уяўленні вобраз кожнага фашыста. Ад гэтага нават патыхала нечым мірным: не крывёй, не гарам пажараў і нават не бензінам, а... тонкімі прыемнымі духамі. Праўда, калі мы загадалі яму падняцца і павялі назад, страх у яго вачах знік, блснулі такія іскры, што прымусілі мяне насцеражыцца. Пачалі раздражняць яго шырокая спіна, лёгкая хада, элегантная футравая куртка, прыгожыя унты — уся яго постаць чужынца, ворага.

Сеня спытаў, каторы раз ён налятае на Мурманск.

— Цум эрстэнмаль[3].

— Хлусіць, падлюга. Баіцца адказнасці,— не паверыў я.

— А можа, з новай часці,— выказаў меркаванне Кідала.— Спытай, дзе ён быў дагэтуль. Адкуль прыляцеў?

— Аўс Берлін,— адказаў ён з хітрасцю і нават, як мне здалося, са здзекам.

— Як яго прозвішча?

— Фрыц Кронкер.

— Усё-такі Фрыц,— засмяяўся Кідала.

— Спытай, Сеня, на што ён спадзяваўся, калі так упарта ўцякаў. Да Фінляндыі сто кіламетраў. Вар'ятам трэба быць, каб мець надзею дайсці.

---

[1] — Ідзіце сюды! *(ням.)*
[2] — Кіньце пісталет! І рукі ўгору! *(ням.)*
[3] — Першы раз *(ням.)*.

Фрыц выслухаў пытанне, спыніўся, павярнуўся да нас тварам і пачаў адказваць горача, перакананa, нават злосна.

Сеня збялеў. Кінуўся да яго, схапіў за каўнер курткі, трасануў і закрычаў яму ў твар, глытаючы ад хвалявання і абурэння словы. Некалькі разоў паўтарыў — Масква і Берлін. Потым з агідай штурхнуў немца ад сябе:

— Фашысцкі вырадак!

— Што ён сказаў?

Сеня не адразу здолеў перадаць нам.

— Нахабная морда! Ён яшчэ пагражае! Гаворыць, каб мы не радаваліся, што збілі яго і ўзялі ў палон. Бачыш, выходзіць, палонны не ён, палонныя — мы. Кажа, што тры дні назад вялікая армія фюрэра пачала сваё рашаючае наступленне і ўжо штурмуе Маскву. Што нам тут усім хутка капут. Мы вымушаны будзем скласці зброю... Вось жа гад! Я адказаў, што яго смярдзючаму фюрэру не бачыць Масквы, як сваіх вушэй... Не на тых напалі! А вось мы... Мы прыйдзем у яго Берлін... Вір комен нах Берлін! — крыкнуў Сеня па-нямецку.— Чуеш, сволач гітлераўская?

Фрыц панурыў галаву, згорбіўся, як бы чакаючы ўдару. Пад'ём быў круты, цяжкі, мы адчувалі стомленасць, і было не да размоў. На перавале на хвіліну спыніліся, каб адпачыць. Цяпер можна не спяшацца, хаця і вечарэла ўжо; сонца даўно схавалася за гарамі (яно выглядвае яшчэ ўдзень гадзіны на дзве), неба на паўднёвым захадзе гарэла барвова-фіялетавым агнём, а на паўночным усходзе было цёмна-сіняе: адтуль, з мора, наступала ноч.

Мы бачылі сваю батарэю, адчувалі, што нашы сябры глядзяць на нас, бачаць чатыры постаці на фоне неба і радуюцца, што мы затрымалі фашыста.

За светлым ад водбліску снегу залівам жыў, дыхаў горад — дымам паравозаў, komінаў, параходаў каля прычалаў. Палонны доўга не зводзіў з яго вачэй. Напэўна, яго ўразіла, што горад жыве; можа, яму здавалася, што іх бомбамі ён знішчаны ўшчэнт. Ва ўсякім разе, нешта прымусіла яго сур'ёзна задумацца, бо ён раптам цяжка ўздыхнуў і як бы падумаў услых.

Сеня зняважліва хмыкнуў:

— Дайшло. Гаворыць, што гэта будзе сусветная трагедыя, калі, не дай Божа, мы прыйдзем калі-небудзь у Берлін.

Не, хлусіш! Будзе сусветная радасць!.. Ді ганцэ вэльт вірд фро зайн...[1] Калі мы збавім людзей ад карычневай чумы.

Немец глянуў на Сеню з нянавісцю: у задуменні ён, мабыць, забыўся, што адзін з нас ведае яго мову.

Калі мы пачалі спускацца, то збоку, прыкладна за кіламетр, убачылі трох чалавек. Яны ішлі напярэймы нам і махалі рукамі.

— З войск НКВД, па палоннага,— здагадаўся Кідала. Ён дастаў з кішэні новенькі бліскучы пісталет лётчыка, з жалем агледзеў яго.— Забяруць мой трафей. Гэтыя дружкі сваю справу ведаюць. На гару нябось не кінуліся. У першую чаргу да парашута пайшлі.

У гэты момант, як на тое, немец расшпіліў спражку на рукаве сваёй курткі і зірнуў на гадзіннік. Гадзіннік быў цудоўны: вялікі, з чорным цыферблатам, белымі стрэлкамі. Я ўбачыў, як у Сцяпана прагна бліснулі вочы, сквапная думка вылезла на шырокі самазадаволены твар.

— Пясоцкі, скажы гэтаму тыпу, каб аддаў мне гадзіннік.

— Навошта? — здзівіўся наіўны Сеня.

— На памяць. Дарэмна хіба мы яму жыццё ратавалі? — цынічна ўсміхнуўся Кідала.

Сеня зразумеў, сумеўся, ажно пацямнеў з твару, але сказаў з верай, што можна пераканаць гэтага несвядомага чалавека:

— Т-таварыш малодшы лейтэнант! Але ж гэта... м-марадзёрства...

— Ну... ты мяне не вучы. Яны паўсвету абрабавалі, можа, маці тваю забілі, а ты мне — марадзё-ёрства!.. Рабі, што загадваю! Твая справа цялячая.

— Я... я не магу гэта перакласці... Хочаце — забярыце самі. Ён зразумее без слоў...

Кідала натапырыўся, прыпыніўся, апусціў доўгія рукі, перайшоў на той афіцыйны тон, які любяць не вельмі разумныя камандзіры, ветлівы і ў той жа час пагрозлівы і здзеклівы:

— Вы што, Пясоцкі? Не выконваць загаду? У баявых абставінах? Так-так-так... Фашыста пашкадавалі? Сваячка знайшлі? Так...

---

[1] Увесь свет узрадуецца... *(ням.)*

Чатыры гады вучобы ў тэхнікуме, жыццё ў адным пакоі давалі мне права сказаць яму з абурэннем:

— Пасаромейся, Сцяпан! Ты камандзір Чырвонай Арміі! Паважай самога сябе!..

Але гэта ўзарвала яго зусім. Ён закрычаў на ўвесь Кольскі паўвостраў:

— Які я вам Сцяпан, сяржант Шапятовіч! Я быў для вас Сцяпанам калісь, але ніколі больш не буду! Ніколі! Зарубіце сабе на носе! Зразумелі?

Я ведаў, як яго ўлагодзіць: шчоўкнуў абцасамі, выцягнуўся, казырнуў:

— Так точна, таварыш малодшы лейтэнант! Усё разумею!

Ды раптам позірк мой упаў на палоннага. Ён стаяў, глядзеў на нас і, здалося мне, усміхаўся, зняважліва і зларадна. Я пахаладзеў ад думкі: «А што, калі ён разумее па-руску?» Зрабілася так сорамна за Кідалу, так страшэнна сорамна, што хацелася праваліцца скрозь гару. Гэтак паказаць сябе перад ворагам!

— Глядзіце, ён разумее...— паказаў я на немца.

Дайшло нават да Кідалы. Ён схамянуўся, штурхнуў палоннага ў плячо.

— Пайшоў, сволач! Хутчэй! — І шырока закрочыў побач з ім...

— Ён мне зноў быццам у душу напляваў,— сказаў Сеня, сумны, разгублены, схудзелы ад стомленасці, калі мы сустрэліся з чэкістамі, здалі ім абавязкі канвою і, крыху адстаўшы, маглі пагутарыць паміж сабой.

— А ты на яго плюй! Не прымай да сэрца. Ён будзе маўчаць, як вады ў рот набраўшы.

— Хіба мне ад гэтага лягчэй? Я зноў страціў да яго павагу, якая была з'явілася пасля бомбы. А гэта цяжка, Пеця... Я казаў табе... Няўжо ён не разумее? Абрабаваць палоннага — што абрабаваць забітага. Агідна!..

Ніколі ў жыцці я не даносіў ні на кога і люта ненавіджу людзей, якія гэта робяць, ходзяць скардзіцца начальству, пускаюць плёткі, нагаворваюць адзін на аднаго. Але я доўга думаў пра сённяшні выпадак. І ўвесь час мне ўспаміналіся словы Кідалы: «Фашыста пашкадавалі?.. Сваячка

знайшлі?..» Словы гэтыя вельмі абуралі мяне, бо нагадвалі тыя недарэчныя абвінавачанні, якія ён кінуў Сеню ў першы дзень вайны. Я не вытрымаў. Пайшоў да камандзіра і камісара. Расказаў ім.

Камісар слухаў з затоенай, але добрай усмешкай на твары. Я думаю, ён радаваўся за нас з Сенем, што камсамол, школа, лад наш выхавалі нас такімі. Камісар — найвялікшы гуманіст і, безумоўна, разумее нас.

Сеўчанка хмурыўся і, выслухаўшы, вылаяўся:

— Гора мне з вамі.

Я спалохаўся: няўжо ён асуджае нас? Не.

— Дурань ён, ваш Кідала. Але я зраблю з яго чалавека! — І папрасіў, каб мы нікому больш пра гэта не расказвалі.

14 лістапада

Каторы дзень раскрываю свой сшытак і... нічога не магу запісаць. Мне сорамна перад самім сабой, перад тымі, каму трапіць мой дзённік... Перад Сашай... О, лепш не ўспамінаць, не запісваць! Можа, спаліць, знішчыць, каб нішто не вымушала мяне на прызнанне? Каб ніякіх дзённікаў і ніякіх слядоў. Але хіба лягчэй будзе ад усведамлення таго, што ніводзін чалавек ніколі ні аб чым не даведаецца? Я даваў слова, што буду да канца сумленны; нічога не буду таіць — ні падзей, ні думак; не схлушу, каб зрабіць сябе лепшым, прыгажэйшым. Не, я мушу ўсё запісаць шчыра!

Мяне лёгка раніла асколкам у плячо. Завезлі ў санчасць, якая размешчана ў бараку цагельнага завода; там, у гліняных кар'ерах, схаваны ўсе тылы дывізіёна — цагельню ні разу не бамбілі. Мяне паклалі ў вялікім светлым пакоі. Хоць гэта спачатку так здалося, пасля зямлянкі. На самай справе пакойчык невялічкі — шчыльна стаялі чатыры бальнічныя ложкі. З іх толькі адзін быў заняты, ляжаў абмарожаны сувязіст з НП.

Упершыню за многа месяцаў я адпачываў у поўным сэнсе слова: і целам і душой. Мне ўсё было прыемна, прыносіла асалоду — чыстая бялізна, знаёмы пах лекаў, адчуванне

ўласнага цела, нават лёгкі боль раны, дотык мяккіх Антаніных рук, калі яна перавязвала, размовы, якія мы вялі з ёй. А потым кнігі, якія яна пачала прыносіць. Я накінуўся на іх з прагнасцю галоднага і глытаў адну за адной, па дзве-тры ў дзень. Я нічога не чытаў з пачатку вайны, акрамя газет, бо кароткія перадышкі ў нялётныя дні аддаваў дзённіку. Я так захапіўся чытаннем, што нават Антаніна мяне раздражняла, калі заходзіла і пачынала гаворку, а гаманлівага суседа проста ўзненавідзеў за тое, што пустой балбатнёй ён перашкаджаў мне ўглыбіцца ў кнігу.

— Пачытай ты што-небудзь лепш,— прасіў я, каб ён змоўк.

— Я ў добры час не чытаў, а ты хочаш, каб я цяпер затуманьваў галаву. Наліха мне гэта! — адказваў ён.

Вось жа ёсць людзі!

У той дзень сувязіст выпісаўся, і я застаўся адзін, вельмі задаволены гэтым. Нарэшце ніхто не будзе перашкаджаць мне. Раніцой заглянула Антаніна, зрабіла перавязку, сказала, што едзе на нашу батарэю. Я і гэтай акалічнасці ўзрадаваўся, бо толькі што пачаў «Запіскі з мёртвага дома». А ваенурач і другі фельчар заходзілі рэдка.

Антаніна вярнулася пад вечар, заглянула ў палату, пасяброўску спытала:

— Не сумуеш? — і паведаміла: — Я сёння буду дзяжурыць.

«Узрадавала! Прыйдзеш і будзеш ад няма чаго рабіць балбатаць. Не дасі пачытаць»,— падумаў я. Але яна не прыходзіла. А я, праглынуўшы за дзень «Запіскі...», пачаў «Угрум-раку». Маленькая лямпачка пад столлю свяціла цьмяна, але я не зважаў на гэта — вочы мае могуць чытаць і пры месячыку.

Рыпнулі дзверы.

— Усё чытаеш? — з дакорам спытала Антаніна.— Папсуеш вочы — самалёта не ўбачыш, камандзір,— і выключыла святло.

Я прыціх, не адказваў, чакаючы, калі яна выйдзе, каб падняцца, уключыць святло зноў і чытаць далей. І раптам я адчуў яе гарачае дыханне. Яна схілілася нада мной, рука яе дакранулася маёй галавы, валасы ўпалі на твар, ад іх асаблі-

вага, непаўторнага паху закружылася ў галаве. Нейкая дзіўная непераможная сіла прымусіла мяне абхапіць рукамі яе шыю, прыцягнуць да сябе. І вось ужо зліліся нашы вусны... І яе грудзі, тугія, гарачыя, пад якімі часта і моцна грукала сэрца, прыціснуліся да маіх грудзей... Тады ўсё паплыло, завіравала, зазвінела дзівоснай музыкай, знікла ўсё зямное, рэальнае, быццам узляцеў некуды туды, дзе калыхаўся, пераліваўся вясёлкамі, вабіў хараством сваім гэты падманлівы цуд — паўночнае ззянне...

А потым я ляжаў, душэўна і фізічна спустошаны... Пустата была ў сэрцы, у мозгу, ніводнай думкі і ніякага адчування, адна чарната, як у бездані. Потым яна пачала запаўняцца нечым брыдкім, здалося, штосьці жывое і слізкае паўзло ў душу, забруджвала цела. Я доўга не разумеў, што гэта такое, толькі адчуваў, што няма сілы супраціўляцца, і бязвольна чакаў, калі яно выявіць сябе, гэтае слізкае і агіднае. Што ж яно такое? І раптам яно прыйшло, гэтае вызначэнне, вырысавалася найагіднейшым у свеце словам — **здрада**.

Але, здрада! Я здрадзіў самаму дарагому і светламу, што было ў маім жыцці. Калі гэта дайшло да свядомасці, я, відаць, застагнаў. Яна, Антаніна, хацела абняць мяне.

— Не трэба! — у роспачы крыкнуў я.

— Фу, дурань які! А яшчэ жанаты! — пакрыўджана фыркнула яна, саскочыла з ложка і выбегла з палаты.

Раніцой я так настойліва патрабаваў, каб мяне выпісалі, што ваенурач не стаў затрымліваць. Я не хацеў бачыць яе, гэтую кошку, хітрую прытворшчыцу, якая выдавала сябе за ўвасабленне чысціні, шчырай дружбы, а на самай справе... Безумоўна, я не першы ў яе... Успомніліся пісьмы, пра якія яна казала... Ад гэтай думкі рабілася яшчэ горш.

Але што з таго!.. Я... я сам — бязвольны, нікчэмны чалавек, анучa... Я здрадзіў Сашы! У такі час!

А няма большай душэўнай пакуты, як адчуваць сябе здраднікам. Я ўзненавідзеў сам сябе. Не знаходзіў месца, занятку. Мяне раздражнялі байцы, асабліва іх размовы пра дзяўчат, пра жанчын. А калі яны аднойчы прыгадалі Антаніну, я накрычаў на іх. А потым мне здалося, што яны пра ўсё здагадваюцца, і я пачаў баяцца іх, сваіх падначаленых. Мне хацелася, каб бясконца налятaлі немцы, каб смерць увесь

час вісела над галавой — можа, тады я знайшоў бы хоць які-небудзь спакой. Але, як на злосць, дні былі хмарныя, падаў снег, і мы больш сядзелі ў зямлянках, займаліся тэорыяй, палітвучобай. Свайго настрою я не мог схаваць ад пільных вачэй камісара і камбата.

Сеўчанка неяк сказаў:

— Па-мойму, цябе не далячылі, Шапятовіч. Можа, табе варта вярнуцца назад у санчасць?

Я спалохаўся. Вярнуцца туды? Бачыць гэтую жанчыну, гутарыць з ёю?

— Што вы, таварыш старшы лейтэнант! Я зусім здаровы. Плячо загаілася... А настрой — гэта так... Сям'ю ўспамінаю.

— Ну, глядзі... Не вешай носа...

Сям'ю ўспамінаю... Ох, успамінаю! Але як?

Здрада... Яна варушыцца ў сэрцы, як нейкая ліпучая, агідная істота. Але гэтая пакута здаецца нязначнай у параўнанні з тым, што яна нарадзіла. Раптам я пачаў прыкмячаць, што думаю пра Сашу не так, як думаў дагэтуль.

Яна, гэтая праклятая Тоня, пахіснула маю веру ў шчырасць, у чысціню адносін, у каханне, якое мацней за смерць. У галаву назойліва лезуць розныя недарэчныя гісторыі аб жаночай нявернасці, здрадлівасці. Я чуў іх сотні ад сваіх сяброў у тэхнікуме і тут, у арміі. Тады я пярэчыў, лаяўся, ледзь не кулакамі даказваў, што гэта выдумкі цынікаў, паэтызаваў жанчыну. А цяпер сам апынуўся ў палоне гэтага бруду. Думаючы пра Сашу, я адчуваю рэўнасць, горшую за тую, якую некалі адчуў, пайшоўшы ад яе, калі яна не была яшчэ маёй жонкай. Я разумею, як гэта нізка, пошла, пачварна! Я сам нягоднік, здраднік і... раўную яе. Да каго? Чаму? У такі час! Яна ў няшчасці, у няволі, у палоне... А я... О Божа! Здаецца, я трачу рэшткі цвярозага розуму. Але што рабіць? Як вярнуць ранейшую душэўную раўнавагу? Тады я думаў толькі пра адно, адчуваў толькі адзін боль. Цяпер — чорт ведае што робіцца ў маёй дурной галаве! Ні разу за год не ўспомніў я таго маладога настаўніка, здаецца, Лялькевіч яго прозвішча. А цяпер ён увесь час стаіць у маіх вачах, я бачу яго пераможную зняважлівую ўсмешку, такую, як тады, на

валейбольнай пляцоўцы. А мінулую ноч сасніў, што ён абнімае, цалуе Сашу, а я стаю як здранцвелы, не магу зрушыцца з месца і... толькі плачу. Чарняк раніцой казаў, што я плакаў у сне.

Я пачынаю ненавідзець яго, Лялькевіча, малазнаёмага мне чалавека, разумеючы ўсю дзікасць і недарэчнасць свайго пачуцця. Можа, ён недзе на фронце, ранены, можа, забіты ўжо даўно, а я... Не, са мной робіцца нешта нядобрае! І пакуты мае мацнеюць ад таго, што я не магу расказаць пра ўсё гэта нікому, нават Сеню. Ледзь набраўся сілы і смеласці, каб запісаць у дзённік. Запісаў — і спалохаўся. Баюся пакінуць сшытак у зямлянцы, хоць раней пакідаў смела, упэўнены, што пасля таго выпадку з Мухам ніхто з байцоў не палезе ў мой ранец.

Можа, лепш вырваць гэтыя аркушы?

23 лістапада

— Скажы мне, Пеця, чаму ў цябе такі настрой? Чаму ты такі невясёлы?

— А чаго радавацца? Немцы пад Масквой. Усё можа здарыцца. Тады мы апынёмся ў пастцы... У ледзяной пастцы.

— Ну, ведаеш, не падабаюцца мне твае думкі. Ты кандыдат партыі, камандзір. Такі настрой у нашых умовах перастае быць прыватнай справай, май на ўвазе.

— Ідзі, скажы камісару.

— А што ты думаеш, і скажу.

Я здзіўлена паглядзеў на Сеню: сур'ёзна ці жартуе? Не, ён глядзеў на мяне сваімі разумнымі чорнымі вачамі пранікліва, быццам хацеў зазірнуць у самую душу ці, як варажбітчарадзей, прачытаць усё на твары.

«А можа, адкрыць табе душу? Навошта, каб ты, мой лепшы друг, думаў, нібы я спалохаўся становішча на фронце? Не, я не баязлівец і ў перамогу веру гэтак жа, як і ты. Ад іншага няма спакою маёй душы. Але ці зразумееш ты? Нічога падобнага ты яшчэ не перажываў. Думаеш усё аб сусветных праблемах, высокіх матэрыях. Мае перажыванні, пакуты могуць здацца табе нікчэмнымі, вартымі смеху. І тады мне будзе яшчэ цяжэй!» — думаў я.

— Праўда, я не веру, што ты стаў такі панікёр і песіміст. Занадта многа ў цябе любві, каб ты мог страціць веру ў будучыню.

— Любві? — здзівіўся я.— Да чаго?

— Да ўсяго. Да жыцця. Радзімы... Да блізкіх... Да жонкі...

Я ледзь не застагнаў: знянацку ён дакрануўся да самага балючага месца.

— Таму і цяжка, што люблю. Хто не любіць, таму што... таму ўсё роўна...

— Мне ўвесь час здаецца, што зусім іншае прыгнятае цябе. Так паводзіць сябе чалавек, які зрабіў нешта благое, у каго нячыстае сумленне.

«О, гэты хлопчык можа ўсё зразумець, але прызнацца яму я ўсё роўна не магу!»

Мы сядзелі ў зямлянцы. Сеневы падначаленыя — разлік дальнамера — працавалі на кухні. Скупое святло палярнага дня цадзілася праз шыбачку ў дзвярах і падала на твар гаспадара. У яго дзіўны твар у апошнія дні — залішне шчаслівы для такога часу. Можа, таму я і не мог расказаць яму свае таямніцы, як расказваў раней,— мяне раздражняў яго твар, незразумелая адзнака шчасця на ім. Чаго радавацца? Калі нават быць самым вялікім аптымістам, то ўсё роўна радавацца няма чаго.

— Слухай, Сеня, чаму ты такі?..

— Які?

— Чорт цябе ведае — які... Быццам адзін ты ведаеш, што заўтра канец вайне. Твар блішчыць, як намаслены блінец.

Ён засмяяўся і перасеў да мяне на нары, абняў за плечы.

— Ты добры друг, Пеця. Я радуюся, што ў мяне ёсць такі друг. Аднаму табе я магу сказаць, чаму я такі... Але дай слова, што ты — нікому...

— Я быў калі-небудзь балбатуном?

— І ў дзённік свой дурацкі не пішы. Я хачу, каб гэта было толькі маёй тайнай.

Мне цяжка было даць слова, што я не запішу нашай размовы. Акрамя таго, мяне крыху пакрыўдзіла, што ён назваў мой дзённік дурацкім, і я змоўчаў.

Ён таксама доўга маўчаў: ці то чакаў майго клятвеннага слова, ці думаў — можна мне даверыць тайну ці не?

Потым трасануў мяне за плечы.

— Я скажу табе дзіўную рэч, у якую ты, напэўна, не паверыш… Я закахаўся.

— Закахаўся?

«Паўгода ён не бачыў у вочы ніводнай дзяўчыны,— бліснула думка.— Ніводнай, акрамя… Няўжо? Што ж гэта такое робіцца! З кожным днём мне не лягчэй!»

Сапраўды, я адчуў сябе гэтак жа кепска, як адразу пасля той недарэчнай гісторыі, якая прынесла мне такія пакуты… Прайшло паўмесяца, і перажыванні мае нібы пачалі прытупляцца. І вось табе на!

— Ты здагадваешся, у каго?

— Няцяжка здагадацца. Антаніна?

— Але…

Я рэзка падняўся, скінуўшы яго руку з пляча.

— Яна не варта твайго кахання!

Ён схапіў мяне за каўнер кажуха, быццам спалохаўся, што я выйду і пакіну яго аднаго, нічога не растлумачыўшы.

— Не варта? Чаму не варта? Хоць не! Не трэба! Нічога не кажы! — Ён адштурхнуў мяне.— Я не жадаю нічога слухаць! Я кахаю, і мне хораша, і я нічога не хачу ведаць. Ты, магчыма, пачуў там нейкія плёткі. Калі адна жанчына і гэтулькі мужчын навокал, заўсёды будуць плёткі. Але я не хачу іх чуць… Я, магчыма, ніколі не скажу ёй пра сваё каханне, не прызнаюся… Яна, відаць, кахае каго іншага, выйдзе замуж… Што ж, я пажадаю ёй шчасця і калі-небудзь вызвалюся ад свайго пачуцця… А можа здарыцца… усё здараецца ў жыцці… што мы прыйдзем адно да аднаго, што раптам абое адчуем… Але цяпер я не думаю пра гэта… Мне хораша ад майго кахання, яно напаўняе, упрыгожвае маё жыццё, і я не жадаю, каб яго разбурылі раней чым трэба. Я прашу цябе як друга…

Ён гаварыў горача, доўга, і ўсё, што сказаў, немагчыма было запомніць. Я, уражаны, утрапёна стаяў з другога боку халоднай чыгуннай печкі і думаў пра сваё… Не, цяпер гэта не толькі маё. Мая тайна, але яна закранае іншых людзей, дарагіх мне людзей. Гэтая жанчына, як прывід, стала не толькі паміж мной і Сашай, але таксама вось паміж мной і лепшым другам маім. Па сутнасці, яна разбурыла нашу дружбу, бо

цяпер мы ўжо ніколі не будзем такія шчырыя адзін перад адным, якія былі дагэтуль. Я са страхам думаю, што магло б здарыцца, каб я ўсё расказаў яму. Як бы ён паставіўся да гэтага? А мяне так цягнула расказаць. Але кожны раз мяне стрымліваў яго вясёлы, узнёслы настрой, яго шчаслівы твар. Што ж, няхай астаецца са сваім уяўным шчасцем! Праўда, я крыху затуманіў гэтае шчасце. Ён нічога не хацеў чуць пра Антаніну, але на сэрцы, безумоўна, стала трывожна, і пасля гарачых слоў ён не стрымаўся, каб не спытаць:

— А што ты чуў? Чаму яна не варта майго кахання?

— Кажуць, яе кахае начальнік боезабеспячэння.

Я знарок назваў самага прыгожага і цікавага афіцэра.

Сеня засмяяўся:

— Кахае! Ды яе, можа, дзесяткі чалавек кахаюць. І што з таго? Хіба праз тое, што яе кахае нехта іншы, не магу кахаць я? Я ж нічога не патрабую за сваё каханне. Мяне здзіўляе твая логіка, Пятро. Не варта... Не, я разумею, ты чуў нешта бруднае. Цынікі ёсць, сам ты некалі казаў. І зайздроснікі! Але для мяне яна самая прыгожая, добрая, чыстая, і я нічога не хачу ведаць, а калі пачую што — усё адно не паверу!

Наіўны хлопчык! Некалі і я быў такі. І мне зрабілася крыўдна і горка ад таго, што цяпер я адчуваю сябе горшым, чым быў яшчэ зусім нядаўна.

1 снежня

Майстры рамантавалі гармату, і Сеўчанка паслаў мяне з пакетам на КП дывізіёна. Здаўшы пакет, я ішоў назад не спяшаючыся. З цікаўнасцю аглядаў горад. Ён даўно вабіў мяне, хацелася зазірнуць ва ўсе яго куткі, каб даведацца, як жывуць людзі ў вайну, пры амаль штодзённых бамбёжках. Усюды сляды разбурэнняў, руіны дамоў, папялішчы, засыпаныя снегам. Але горад жыве поўным жыццём. Прыкметы гэтага жыцця я бачыў на кожным кроку, і яны прыемна ўражваюць, нараджаюць упэўненасць і спакой.

Са здзіўленнем спыніўся я перад трохпавярховым домам, адна палавіна якога была разбурана, а ў другой жылі людзі. Гардзіны на вокнах, вазоны. У аконным праёме лес-

вічнай клеткі, дзе тырчалі рэшткі паламанай рамы, паказалася жанчына, павесіла на падаконнік дывановую дарожку, пачала выбіваць пыл. Мне здалося гэта дзівам. Паўдома знесена вайной, сёння, заўтра сюды можа пацэліць другая бомба, а людзі выбіваюць пыл са сваіх рэчаў, наводзяць чысціню.

Тры дзяўчыны, расчырванелыя ад марозу, прайшлі міма. Адна штурхнула мяне плячом:

— Варону зловіш, сяржант!

Зарагаталі.

А потым школа. Я не адразу нават зразумеў, што за гоман, пакуль у будыніне на другім баку вуліцы не адчыніліся дзверы і вялікая чарада дзяцей, пераважна хлапчукоў, не высыпала на двор. Звычайныя вучні, такія ж, якім колькі год назад быў я сам. Адзін выехаў з дзвярэй на плячах у свайго сябра. Другі піхнуў дзяўчынку ў снег. Трэці падбег да мяне, смела спытаў:

— Сяржант, гільза аўтаматная ёсць?

Не, гільзы ў мяне не было.

— А вінтовачныя? — дапытваўся хлапчук.— Няма? А з чаго ты страляеш?

— З пушкі.

— З якой?

— З зенітнай.

— А-а,— расчаравана працягнуў ён, махнуў рукой і пабег даганяць сяброў.

Я пашкадаваў, што не мог даць яму якой-небудзь гільзы. Можна было б завесці гаворку і распытаць, як ён жыве тут.

На другой вуліцы я сустрэў групу англійскіх маракоў. Паважныя, амаль усе высокія, у берэтах, з люлькамі, яны нагадвалі герояў з кніжак пра марскія падарожжы, якія я любіў чытаць у маленстве. Я ўпершыню ўбачыў жывых англічан і не ўтрымаўся, каб не прайсці крыху следам за імі, услухоўваючыся ў чужую мову. Яны звярнулі на мяне ўвагу, і адзін з прыязнай усмешкай працягнуў вялікую сігару.

Чырвонаармеец з тэрмасам у руках шпарка прабег міма, абыякава прывітаўся, потым спыніўся, паклікаў мяне, даверліва паведаміў:

— Піва хочаш? У сталоўцы камбіната піва даюць.

Я пайшоў за ім. У вялікай і халоднай зале, дзе большасць вокнаў забіта дошкамі (ад бамбёжак павылятаді шыбы), за півам стаяла чалавек трыццаць мужчын і жанчын. Набраць піва ў тэрмас «другу» майму не далі, але дазволілі нам, вайскоўцам, без чаргі атрымаць па кубку гэтай гаркаватай вадкасці, якую я выпіў з вялікай асалодай, хоць раней не любіў.

Я затрымаўся ў сталоўцы, каб паслухаць, пра што размаўляюць людзі цывільныя — рабочыя, жанчыны, які ў іх настрой. Але нейкі стары нядобразычліва спытаў:

— Што, яшчэ хочаш? Не дамо! Нябось сто грамаў кожны дзень маеш? А я забыўся ўжо, як яна пахне, дарагая. Хоць піўка панюхаю.

Мне стала сорамна, і я хуценька выкаціўся на вуліцу. Сапраўды, дзён пяць назад нам пачалі выдаваць па сто грамаў гарэлкі — ад цынгі, як тлумачыць Спірын.

Заставалася больш за гадзіну да адыходу катэра на той бераг, і я зноў пайшоў у горад. І тут, у самым цэнтры, каля Пяці Вуглоў, мяне захапіў налёт. Раптоўна і непрыемна зараўлі з усіх бакоў сірэны паветранай трывогі. Я падумаў, што яны больш наганяюць жудасці, чым бомбы. Спачатку на пустых вуліцах зрабілася мнагалюдна. Людзі беглі, клікалі адзін аднаго. Старая жанчына крыкнула мне:

— Бяжы за мной! Сховішча там, у двары.

Але я не думаў хавацца. Мне здавалася, што зенітчыку сорамна лезці ў нейкую шчыліну. Страху перад самалётамі я даўно ўжо не адчуваў. І таму па прывычцы пачаў шукаць іх у небе, каб адначасова паглядзець збоку, як страляюць нашы. Выбухі снарадаў убачыў адразу, а самалётаў угледзець не мог.

«Няўжо разрывы так далёка ад цэляў? Вось жа партачы!» — лаяў я ў думках сваіх сяброў.

Першая бомба ўпала недзе ў канцы вуліцы Сталіна, у раёне таго дома, дзе жанчына выбівала дарожку, і, напэўна, трапіла ў будынак, бо высока ўгору шугануў слуп чорнага і белага дыму. Калі бомбы падаюць на голае месца, на скалы, такога дыму не бывае. Потым выбухі пачалі грымець з

усіх бакоў. Я стаяў каля газетнага кіёска, пад карнізам яго фанернага даху, і назіраў. Раптам дом насупроць мяне цераз плошчу дзіўна падскочыў, нібы хацеў узляцець, але не здолеў і цяжка грымнуўся на зямлю, так, што яна аж уздрыгнула пад маімі нагамі, і сцены павольна пачалі асядаць, распадацца ў розныя бакі. Мяне загіпнатызавала гэтая магутная сіла разбурэння, асабліва калі я ўбачыў, як разам са сцяной пачалі падаць рэчы чалавечага ўжытку — шафа, стол, ложкі...

«А можа, і людзі там?» — падумаў я, і мне зрабілася страшна, успомніліся тыя дзеці, якіх я бачыў гадзіну назад, хлапчук, якому вельмі ж спатрэбілася аўтаматная гільза. У гэты момант я ўбачыў маленькага чалавечка, які бег цераз плошчу. Не, гэта не хлапчук, гэта стары, ён нахіліўся і смешна махае рукамі, у адной з іх вялікі партфель, ён быццам заграбае ім паветра, каб хутчэй бегчы. І раптам за яго спіной бліснула кароткая ўспышка агню. Узвіхрыўся снежны пыл, побач са мной пасыпалася каменне, забарабаніла па даху кіёска. Калі пыл і дым аселі, чалавека на плошчы не было.

Нехта схапіў мяне за плечы, моцна трасануў.

— Пеця! Вар'ят! Чаму ты стаіш тут? Бяжым! Хутчэй бяжым!

Я агледзеўся, убачыў Антаніну, вельмі здзівіўся, ніяк не мог уцяміць, адкуль яна ўзялася, і, аглушаны выбухам, ашаломлены толькі што ўбачаным, паслухмяна пабег за ёй; яна цягнула мяне за руку. Не помню, як мы апынуліся за руінамі дома, на заснежаным колішнім двары, і ўскочылі ў глыбокую яму.

— О Божа! — прастагнала Антаніна.— Ледзь сэрца не выскачыла. Што ты, як слуп, застыў там, пасярод плошчы? Я ўбачыла цябе яшчэ да трывогі. Ішла за табой, хацела спыніць, ды раптам трывога. Я забегла вунь там, на тым баку, у сховішча... Склеп нейкі. Там яшчэ чалавек пяць сядзела. Адна жанчына загаласіла, што іх дом разбамбілі. Я выглянула і, верыш, ледзь не самлела: стаіш ты адзін пасярод пустой плошчы. І перад табой бомба разарвалася... Здалося, зусім блізка ад цябе...

Я не адказваў.

— І цяпер, глядзі, як сэрца калоціцца.— Яна расшпіліла верхнія гузікі свайго элегантнага, беленькага, як снег, кажушка.

Я адвярнуўся, паглядзеў у неба. Там, высока ў блакіце, прайшоў «Ю-88», акружаны чорнымі букетамі разрываў.

«Кучна хлопцы б'юць! Малайцы!» — пахваліў я на гэты раз сяброў.

Бомбы глуха бухалі недзе ў заліве. Радзелі залпы батарэй. Але я ўсё яшчэ глядзеў у неба, хоць з ямы яго было відаць няшмнога,— абы не сустрэцца з яе позіркам. Яна дакранулася да маёй рукі і спытала зусім іншым голасам, чым гаварыла дагэтуль,— нясмелым, дрыготкім:

— Ты пагарджаеш мной?

«Я ненавіджу цябе»,— хацеў быў адказаць я, але чамусьці не мог вымавіць гэтыя бязлітасныя словы. Змоўчаў зноў.

І яна раптам заплакала. Я разгубіўся.

— Вядома, вы ўсе такія... Калі дзяўчына прыходзіць сама, вы пачынаеце пагарджаць ёю,— праз слёзы гаварыла яна.— Вы думаеце чорт ведае што... А я таму, што люблю... цябе люблю..., Аднаго цябе, дурань ты гэтакі... Мне многія пішуць пісьмы, клянуцца ў каханні... Дамагаюцца маёй узаемнасці... А я не магу... Не магу! Я хачу шчасця з табой. Што я — подлая з-за гэтага, разбэшчаная?..

— Ты зрабіла нягоднікам мяне. Ты ж ведала: у мяне жонка... Мы звязаны да смерці...

— Ах, гаротненькі! — раптам ад плачу перайшла яна на здзеклівы тон.— Яго спакусілі!.. Чысцюлька. Каб цябе сёння разнесла бомбай, твая жонка...

— Сціхні, Тоня! — закрычаў я такім голасам, што яна на паўслове прыкусіла язык, спалохана адхіснулася ад мяне.

— Мы доўга будзем сядзець тут? — спытаў я пасля хвіліны маўчання.

— Падсадзі мяне, я вылезу.

Я нахіліўся. Яна спрытна ўскочыла мне на плечы і вылезла з ямы. Потым падала руку, памагла выбрацца мне.

Навокал было ціха. Па вуліцы ішлі людзі, хоць адбою яшчэ не давалі.

Мы таксама выйшлі на вуліцу. Я раптам адчуў, што ў душы маёй няма той злосці на яе, якая была дагэтуль. Я сказаў прыязна:

— Цябе кахае цудоўны чалавек. Сеня Пясоцкі... Ты не ўяўляеш...

У адказ яна прашыпела з лютай злосцю, ажно перакасіўся ўвесь яе твар:

— Пайшоў ты к чорту са сваім Пясоцкім! Я вас ненавіджу! Усіх ненавіджу! — і шпарка пайшла ў другі бок, пакінуўшы мяне, аслупянелага, пасярод вуліцы.

Цяпер я думаю: што яна за чалавек? Адзін Сеня, магчыма, мог бы растлумачыць яе дзіўныя ўчынкі і словы. Але нельга пра гэта расказаць яму.

13 снежня

— Камандзір! Да камісара! — крыкнуў дзяжурны, адчыніўшы дзверы зямлянкі. Быў позні вечар, і я ўжо спаў. Падхапіўся. Апранаў кажушок, зашпільваўся і падпяразваўся на хаду. На сцежцы да афіцэрскай зямлянкі дагнаў амаль усіх сваіх калег — камандзіраў аддзяленняў.

— Што здарылася, хлопцы?

— Можа, зноў перадыслакацыя?

— Хопім гора ў такую сцюжу, калі так. Да металу дакрануцца нельга.

Мароз трашчаў. Але з заліва ўзнімаўся густы туман і ахутваў усё наваколле. Гэты туманны мароз — самы зябкі і непрыемны. Вартавы ў двух кажухах, ватніках і валёнках не можа пастаяць больш за паўгадзіны.

— Выклікае камісар, значыцца, нейкая палітыка.

На здзіўленне ўсім нам, дзверы зямлянкі адчыніў сам Сеўчанка і весела закамандаваў:

— Залятайце куляй! А то холаду напусціце.

Ускочыўшы разам з клубамі марознай пары ў зямлянку, нехта пачаў дакладваць:

— Таварыш палітрук! Па вашаму загаду...

— Ша,— адказаў аднекуль з цёмнага кутка камісар.— Слухайце!

Ціха гаварыла радыё. Але голас дыктара, незвычайны, урачысты, прымусіў усіх нас адразу застыць на месцы, стаіць дыханне.

«...у папярэдніх баях, перайшлі ў наступленне супроць яго ўдарных флангавых групіровак. У выніку пачатку наступлення абедзве гэтыя групіроўкі разбіты і хутка адыходзяць, кідаючы тэхніку, узбраенне і несучы вялізныя страты...»

«Перамога! Перамога!» — застукала маё сэрца так моцна, што ажно балюча аддало ў скроні. Хацелася крыкнуць гэтае найлепшае слова ў свеце.

Дыктар скончыў.

Камісар дрыжачым ад хвалявання голасам спытаў:

— Зразумелі ўсё, таварышы камандзіры?

Я выгукнуў у адказ:

— Перамога! Таварышы! Сябры мае дарагія! Перамога!

І абняў Сеню, які стаяў побач, пацалаваў у шчаку. Ніхто не засмяяўся з такога выяўлення пачуццяў.

Камісар абышоў нас і кожнаму паціснуў руку:

— Віншую вас! З поўным разгромам гітлераўскіх армій пад Масквой!

А Сеўчанка сядзеў на ложку, расчырванелы, у расшпіленай гімнасцёрцы, і выказваў сваё захапленне з большым, чым звычайна, украінскім акцэнтам:

— О цэ показалы Гітлеру Маскву! А шчо, з'іў, гад паўзучы? Маскву захацеў? Не на тых напаў, смярдзючы пёс! Мы табе не таку шчэ кузькіну маты пакажэмо! Нэба табе здасца ў аўчынку. А нашы якія малайцы! А? Ей жа богу, шкадую, шчо я не там сьогодні!..

— Кожны на сваім месцы памог гэтай перамозе!..

Потым па радыё заспявалі «Свяшчэнную вайну». Віктар Вальноў падхапіў песню, і мы ўсе разам праспявалі яе, як гімн.

— А цяпер ідзіце і раскажыце байцам!..

Ужо з парога сваёй зямлянкі я весела закрычаў:

— Пад'ём!

Ад каманды такой адвыклі, бо паўгода нас падымае слова «Трывога!».

Муха, самы нервовы і чулы ў сне, узняў галаву і незадаволена прабурчаў:

— Што там такое?

— Перамога, хлопцы!

Адразу ўзляцелі пад столь зямлянкі кажухі, падхапіліся ўсе, нават Габаў, якога часта па трывозе мы выносілі і кідалі ў снег, каб прачнуўся.

— Якая? Дзе?..

Да позняй ночы не маглі ўціхамірыцца байцы. Выслухаўшы гэтую радасную навіну ад мяне, расказвалі яе адзін аднаму. Прыйшоў з паста Астахаў — усе разам расказвалі яму. Змяніўся Чарняк — зноў пачалі спачатку, уважліва разглядалі карту, хоць на ёй, акрамя Кліна, не было ніводнага з вызваленых гарадоў.

Пачаўся новы дзень. І хоць ён палярны, вельмі кароткі, сонца, ведаем, не пакажацца да студзеня, усё роўна здаваўся святлей за ўсе папярэднія: яго асвятляла перамога пад Масквой. Мы віталі яго...

І ў такі дзень было горка і балюча бачыць, як прыляцелі «месеры» і ў паветраным баі збілі два нашыя самалёты. Праўда, самалёты не нашы — англійскія «харыкейны», але лётчыкі на іх нашы. Адзін выскачыў з парашутам, але — перадалі нам з НП — прызямліўся мёртвы: фашысцкі звяруга застрэліў яго ў паветры. Ух, каты! Мы радаваліся, калі паўмесяца назад над горадам пачалі баражыраваць «харыкейны» — падмога! Але радасць наша тухне. Часта іх збіваюць. Хто-ніхто спрабуе гэта вытлумачыць тым, што нашы лётчыкі не ўправіліся асвоіць чужую тэхніку. А па-мойму, глупства! Не падабаюцца ўсім нам гэтыя машыны з доўгімі і чорнымі, як дамавіны, фюзеляжамі. Вельмі ж яны нейкія нязграбныя, непаваротлівыя і цяжкія, асабліва калі бачыш іх побач з нашымі срэбракрылымі «мігамі», з якімі фашысты нават баяцца ўступаць у бой.

Сёння ўзнялася тройка іх на дапамогу «харыкейнам», і адразу нашы сувязісты пачулі па радыё:

— Ахтунг! Ахтунг! Сафоноф ін дэр люфт!..[1]

І «месеры» зніклі. Вось нагнаў ім страху Сафонаў!

---

[1] — Увага! Увага! У паветры Сафонаў!.. *(ням.)*

12 студзеня

Снежная пустыня... Цішыня. Такая цішыня, што робіцца жудасна; мімаволі часам пачынаеш гаварыць шэптам, а то раптам хочацца закрычаць так, каб пачулі за сотні, за тысячы кіламетраў — там, дзе людзі, дзе вайна і жыццё.

Я ўглядаюся ў гэтую снежную роўнядзь, белую-белую, ажно балюча вачам. Не, не заўсёды яна белая, часта здаецца мне крывава-барвовай, быццам на ёй застылі ўспышкі тых агнёў, якіх так многа было там, у Мурманску. Можа, гэта ад неба: тут ужо на якую гадзіну паказваецца сонца, і калі яно ўсходзіць ці заходзіць, неба гарыць рознакаляровымі агнямі. Мне належыць глядзець у неба, ці не ляцяць варожыя самалёты. А я не магу адарваць вачэй ад снежнай гладзі возера, напружана ўзіраюся ў далёкі-далёкі, зацягнуты блакітнай смугой супрацьлеглы бераг...

Мае новыя падначаленыя глядзяць на мяне як на хворага, псіхічна ненармальнага. Не дакучаюць лішнімі размовамі і стараюцца, каб я як мага радзей станавіўся на варту. А мне хочацца стаяць аднаму, каб ніхто не перашкаджаў думаць, перажываць, уяўляць... Часта я забываю, дзе я, што са мной, і бачу Сеню... Ён ляжыцца сярод снежнага поля адзін, курчыцца ад болю, ад холаду, кліча на дапамогу... А навокал пуста. Не, ён сядзіць, заплюшчыўшы вочы, засынае... А снег пачынае варушыцца, узнімацца хвалямі, як мора ў буру, і залівае, засыпае яго, набіваецца ў вушы, у рот, за каўнер, у рукавы... Я кідаюся яму на дапамогу... І адзін раз кінуўся так, што ледзь не зваліўся з абрывістай скалы ў возера. А тут метраў дзесяць вышыні. Гэта, відаць, бачыў нехта з маіх байцоў.

А то часам са снежнай пены выплывае нахабная морда Кідалы. Ён усміхаецца. Ён можа спакойна мыліцца і ўсміхацца пасля таго, як забіў... забіў (у мяне няма іншага слова) Сеню! Я таўку яго морду кулакамі, прыкладам вінтоўкі, таўку ў думках... А можа, і не толькі ў думках. Здаецца, аднойчы я сапраўды замахнуўся прыкладам на прывід яго.

Магчыма, і гэта бачыў нехта з маіх падначаленых ці чуў, як я кагосьці страшэнна лаю...

Цяжка мяне ўразіла смерць Сені Пясоцкага. Вельмі цяжка. Каб ён загінуў у баі, ад бомбы, ад кулі, а то такая недарэчная, пакутлівая смерць!

Толькі ўчора я здолеў расказаць больш-менш падрабязна гэтую сумную гісторыю сваім паважным дзядзькам. Тады яны зразумелі дзівоты свайго камандзіра і пачалі глядзець на мяне іншымі вачамі. Можа, ад таго, што я выліў усё з сябе, а можа, ад спагады гэтых сталых людзей зрабілася неяк лягчэй на душы. Я нават спаў мінулую ноч без кашмарных сноў. І, здаецца, магу нарэшце паслядоўна і параўнаўча спакойна запісаць усе падзеі ў свой дзённік.

Камандзір узвода кіравання Сцяпан Кідала сабраўся праверыць НП. Метэаслужба прадказвала нялётнае надвор'е, і камісар вырашыў пасляць з узводным Сеню Пясоцкага. Яго нядаўна выбралі камсоргам, і Лазебнаму хацелася, каб ён, новы камсорг, асабіста наведаў камсамольцаў на назіральных пунктах, расказаў ім пра разгром немцаў пад Масквой, сабраў членскія ўзносы, з лепшымі пагутарыў аб прыёме ў партыю,— такую важную справу ён мог даверыць толькі Сеню.

Раніцой, яшчэ прыцемкам, яны выйшлі: да бліжэйшага НП было кіламетраў пятнаццаць нялёгкага горнага пераходу. А пасля абеду вярнуўся са свайго звычайнага абходу па другіх зямлянках Ханон Фрыд і сумна паведаміў:

— Камандзір, замёрз сяржант Пясоцкі.

— Што значыцца — замёрз? — спытаў, здаецца, Муха, не я.

— Зусім. Насмерць.

Я ўскочыў з нараў, схапіў пранырлівага яўрэя загрудкі.

— Ты што вярзеш? Калі? Дзе?

— Толькі што пазванілі з НП.

Я кінуўся ў зямлянку камісара і камбата, але там іх не было. Я знайшоў іх у будцы сувязі, каля тэлефонаў. Забыўся на ўсялякую субардынацыю, з дзвярэй крыкнуў:

— Што з Пясоцкім?

Сеўчанка выплюнуў пад ногі недакурак, цяжка ўздыхнуў:

— Эх, Пясоцкі, Пясоцкі!..

Тады я зразумеў — тое, што сказаў Фрыд, праўда. Хвіліну стаяў, аглушаны горам, потым упёрся лбом у драўляную сцяну і... заплакаў.

Сеня! Дарагі Сеня! Мой друг! Разумная, светлая галава!.. Як жа я буду жыць і ваяваць без цябе?

Як з глыбіні нейкай дайшлі да мяне словы камбата. Не ведаю, расказваў ён мне ці каму іншаму, можа, камісару:

— Яны мала што не дайшлі да НП. Кідала кажа, кіламетры тры-чатыры. Але Пясоцкі зусім выбіўся з сіл і не мог далей ісці. Кідала прапанаваў яму пасядзець, адпачыць... а сам пабег на НП, каб вярнуцца ўдвух ці ўтрох і забраць яго. Кажа, вярнуўся праз гадзіну, не больш... І знайшоў яго мёртвым...

— Хлусіць ён! Хлусіць, сволач, Кідала гэты! — раптам вырвалася ў мяне.— Ён знарок... знарок пакінуў Сеню!.. Ён не любіў яго... Помсціў... Не веру я, што ён вярнуўся праз гадзіну! Не можа чалавек за гадзіну замерзнуць. Не такі мароз.

— Супакойся, Шапятовіч! — сказаў камісар.— Усё высветлім, і калі хто вінаваты...

Лёгка сказаць — супакойся, калі так недарэчна і страшна загінуў твой лепшы друг, дарагі чалавек. Я хадзіў сам не свой. Плакаў, не саромеючыся перад байцамі сваіх слёз. Не мог заснуць уначы — заплюшчваў вочы і бачыў адну і тую ж карціну: Сеня адзін на схіле голай заснежанай сопкі, вецер узнімае пазёмку, снег засыпае вочы, мацнее мароз, забіраецца пад кажух, я бачу яго, мароз, як жывую істоту, пачварную і бязлітасную. Не, вінаваты не мароз! Я ведаю, хто вінаваты! Я перакананы... Фрыд расказаў: сувязісты шэпчуцца паміж сабой, што камандзір узвода спачатку паабедаў на НП, потым пайшоў з разведчыкамі па Пясоцкага.

«Усё высветлім, і калі хто вінаваты...» Як яго пакараюць? Разжалуюць, пашлюць у штрафны батальён? А Сені няма. Залатога чалавека. Няўжо няма? Няўжо ніколі не загучыць больш яго ціхі, заўсёды далікатны смех, не заіскрацца розумам яго ясныя вочы? І маці, яго гаротная маці, ніколі не дачакаецца свайго адзінага сына?.. Ён не

паспеў нават сказаць ніводнага ласкавага слова той, якую пакахаў сваім шчырым юначым сэрцам, хоць яна і не варта яго кахання...

Часам мне здавалася, што ўсё гэта толькі сон, жудасны сон. Я ўсхопліваўся бегчы ў зямлянку дальнамершчыкаў, разбудзіць яго, Сеню, і расказаць пра ўвесь гэты кашмар. Свіст ветру за дзвярамі, хлопанне чахла на гармаце вярталі мяне да рэчаіснасці.

На другі дзень вярнуўся Кідала. Як толькі я даведаўся пра гэта, адразу пайшоў да яго. Без стуку адчыніў дзверы зямлянкі, у якой жылі камандзіры ўзводаў і старшына батарэі, і застыў на парозе, уражаны да неймавернасці. Чалавек, на сумленні якога смерць Сені, сядзеў у адной споднян кашулі за сталом і намыльваў сваю фізіяномію; рабіў гэта ён спакойна і старанна, быццам у цэлым свеце не было нічога важней за яго бараду.

— Дзвярэй чаму не зачыняеш? — кінуў ён мне, не адрываючы вачэй ад люстэрка.

Я прычыніў дзверы, але ўсё яшчэ стаяў анямелы, не ведаючы, што яму сказаць.

Кладучы памазок і беручы брытву, ён глянуў на мяне, уздыхнуў:

— Але, брат, слабец аказаўся твой друг. Мамчын сынок. Не мог дайсці да НП, астаўся гадзіну на марозе і гатовы... Вайна, брат...

Такі цынізм — гэта занадта. Я рвануўся да стала.

— Ты... ты яшчэ абражаеш?.. Гад! Забойца! Гэта ты... ты забіў яго!

Ён павольна падняўся, распрастаў плечы, у прарэзе кашулі былі відаць магутныя валасатыя грудзі, па якіх сплываў шматок мыльнай пены.

— Ты чаму крычыш! На каго крычыш! Кру-гом! Шагам...

— Шагам!.. Ты яшчэ хочаш камандаваць! Хіба ты камандзір?! Ты — забойца! Ты запляміў гонар камандзіра Чырвонай Арміі! Ты знарок кінуў Сеню!.. Ты помсціў!.. За гадзіннік, за ўсё... І я ўсё гэта дакажу... На любым трыбунале!

— Сяржант Шапятовіч, я загадваю вам выйсці прэч адгэтуль,— прашаптаў ён, і лоб яго стаў белы, як пена на шчоках.

— Загадваеш? А якое права ты маеш загадваць? Хто ты? Забойца ты! На тваіх руках кроў чалавека. Сапраўднага чалавека. А ты!..

— Выйдзі прэч! — закрычаў ён не сваім голасам, кінуўся ўбок, да ложка, і... раптам у руцэ яго бліснуў пісталет. Ён накіраваў яго на мяне.

— Кру-гом!

— Страляй! Страляй, калі табе мала адной смерці! Страляй жа! — закрычаў я, наступаючы на яго. І раптам пад ногі мне трапіла табурэтка, што стаяла каля стала. Міг — і з усяго размаху стукнуў я табурэткай па руцэ, якая трымала зброю. Пісталет адляцеў, ляпнуўся аб падлогу. Другі ўдар — па ненавісным намыленым твары... Ён перакуліў на мяне столік, балюча ўдарыў па каленях, але сам, калі нахіліўся, атрымаў трэці ўдар табурэткай па галаве.

Немаведама чым бы ўсё гэта скончылася, каб раптам нехта ззаду не схапіў мяне за рукі. Малашкін — ён пачуў крык — ускочыў і кагосьці з нас ратаваў ад смерці, відаць, мяне, бо, калі камандзір узвода выпіхваў мяне за дзверы, я ўбачыў, што той гад, які ўпаў быў на падлогу, але, напэўна, не ад удару, а наўмысна, зноў трымаў пісталет. З рота і носа яго ляцела шмаццё крывавай пены, як у шалёнага паранянага быка, падала на разбітае люстэрка. Але стрэліць ён не паспеў. Паміж намі стаў Малашкін і даволі спрытна выкінуў мяне з зямлянкі.

Гадзіну ці больш я бяздумна сядзеў каля сваёй гарматы, і ніхто мяне не чапаў. Я не адчуваў ні марозу, ні страху, ні нават тых болю і гора, якія павялі мяне да Кідалы, кіравалі маімі ўчынкамі. Я не раскайваўся ў тым, што зрабіў. Але неасэнсаванае ўсведамленне, што зрабіў нешта не так ці, магчыма, не адпомсціў да канца за смерць Сені і цяпер як бы адрэзаў сабе шлях, прычыніла іншы боль. Хацелася плакаць ад бяссільнай злосці і крыўды. Байцы праходзілі паўз мяне, спачувальна ўздыхалі, даведаўшыся, што адбылося. Адзін Астахаў сказаў:

— Дарэмна ты, камандзір, чапаў гэтае г... Цяпер яны ЧП зробяць. Сяржант падняў руку на малодшага лейтэнанта! Ведаеш, як могуць раздзьмуць?

— Чорт з ім, няхай робяць што хочуць. Мне ўсё роўна,— адмахнуўся я. Не хацелася ні з кім гаварыць, нават з гэтым добрым і разумным Астахавым.

Падышоў Малашкін, а я ўсё сядзеў. Ён пастаяў каля мяне, можа, хвіліну, як бы не адважваючыся выказаць тое, што яму загадалі. Сказаў ціха:

— Устаньце!

Я падняўся. Ён сам, пазбягаючы глядзець мне ў твар, у вочы, расперазаў мой рэмень. Я зразумеў — бяруць пад арышт. Каля катлавана стаяў разведчык з вінтоўкай.

— Завядзіце на КП дывізіёна і здайце начальніку каравула,— сказаў яму малодшы лейтэнант.

Выйшлі з зямлянкі мае байцы.

— Бывайце, хлопцы,— паспрабаваў я бадзёра ўсміхнуцца, але ўсмешка, відаць, не ўдалася.

У Чарняка ў вачах бліснулі слёзы. Ад гэтых слёз і ў мяне ў горле стала горка-салёна.

— Пайшлі,— сказаў я канвойнаму і хутка закрочыў па пазіцыі. І тут убачыў, што не толькі мой разлік, але і ўсе іншыя, уся батарэя праводзіць мяне спачувальнымі позіркамі. І мне захацелася таксама неяк развітацца з батарэйцамі, сказаць нешта, каб яны зразумелі, што я не адчуваю сябе вінаватым.

Каля бусоля на сваім звыклым месцы стаяў Лёша, панурыўшы галаву, перажоўваючы ягель. Я падышоў, абняў яго за цёплую шыю, пацалаваў у халодныя ноздры. Сказаў голасна:

— Будзь здароў, друг Лёша! Не гаруй! Нічога, не прападзём! А буду жывы, няхай гэты падлюга не трапляе на маім шляху. Так і перадайце яму!

Алень кіўнуў галавой і фыркнуў.

— Шапятовіч! Што гэта за камедыя? — пачуўся голас камандзіра батарэі. Я павярнуўся. Ён ішоў ад дальнамера. Я апусціў рукі і адказаў сур'ёзна:

— Гэта не камедыя, таварыш старшы лейтэнант, а трагедыя. Калі свой забівае свайго...

Ён падышоў на два крокі, пільна зазірнуў мне ў вочы, уздыхнуў:

— Эх, Шапятовіч, Шапятовіч,— і махнуў рукой, кінуўшы злосліва: — Анархіст ты і... дурань!

Я зразумеў, што ён таксама перажывае, і, можа, таму мне стала крышку лягчэй. Але ненадоўга. На траўлеры перапраўлялася многа народу — ваенныя і цывільныя. І я прыкмеціў, што многія глядзяць на мяне, як на злачынца — дэзерціра якога-небудзь ці здрадніка... Нават абыходзяць бокам, быццам я заразны. О, як гэта было крыўдна і балюча! Я ледзь трымаўся, каб не крыкнуць, што я не злачынца і няхай яны не глядзяць на мяне гэтак. Выручыў нейкі матрос — дзякуй яму! — спытаў:

— Завошта, братуха, уліп?

Я не мог адказаць, бо адчуваў — скажу адно слова — і пырснуць слёзы.

Адказаў мой канваір:

— Малодшага лейтэнанта ўдарыў.

— А-а!.. Відаць, было за што. Сярод іх розныя ёсць...— пачаў разважаць гаманкі матрос, але ўгледзеў непадалёк капітан-лейтэнанта і адразу знік.

Аднак пасля гэтай кароткай размовы на мяне перасталі глядзець як на злачынца. А ў позірку адной немаладой жанчыны я злавіў нават спачуванне. Але яна, гэтая жанчына, раптам чамусьці напомніла мне... пра дзённік. Я забыўся свой дзённік! І цяпер, безумоўна, яго возьмуць, будуць чытаць, ён пойдзе па руках... Мяне ажно кінула ў гарачку ад гэтай думкі. Асабліва здалося ганебным, што ўсе могуць даведацца пра мае адносіны з Антанінай, пра яе ўчынак. Было адчуванне, што ў такі час, калі хацелася захаваць душэўную чысціню, я раблю подласць. А можа, Тоня сапраўды пакахала? А калі і не, усё роўна я не маю права — не маю! — крычаць пра гэта на ўвесь дывізіён, бо гэта подла, нізка, не па-мужчынску. А даць дзённік у чужыя рукі — значыцца, закрычаць менавіта так, на ўвесь голас, бессаромна, цынічна, даць падставу для самых брудных плётак... Навошта я пісаў гэты дурацкі дзённік? «Дурацкі»? Хто сказаў так? Сеня, друг... Разумны, слаўны, прадбачлівы чалавек. Няўжо праўда, што цябе няма жывога, што я ніколі не ўбачу цябе?

Гора, прыступ шалёнай злосці пры ўспаміне аб тым, хто вінаваты ў яго смерці, і зноў трывога за дзённік. Яна расла з кожным крокам да штаба. Сто разоў я намерваўся папрасіць канваіра: няхай перадасць Астахаву, каб той схаваў мой сшытак (ён ведае, які сшытак) і нікому ні ў якім разе не аддаваў яго. Астахаву я верыў. Але канваір — чалавек з узвода Кідалы,— перш чым сказаць Астахаву, можа расказаць каму не трэба, і тады ўжо напэўна дзённік трапіць у чужыя рукі, чаго добрага, яшчэ самому гаду таму.

Усе гэтыя перажыванні давялі мяне да ліхаманкавага стану. І калі я апынуўся на гаўптвахце — у камеры-сушылцы, дзе пахла цэглай, вугалем і дымам, які ўеўся ў кожную пору закурадымленых сцен,— мае «сябры па няшчасці» хутка заўважылі, што мяне калоціць.

— Ды ты, сяржант, хворы. Трэба ўрача паклікаць.

Я схапіўся за гэтую думку: можа здарыцца, што прыйдзе Антаніна, і я скажу ёй пра дзённік, няхай уратуе яго, бо там яе жаночы гонар.

Сапраўды прыйшла яна. Убачыла мяне — здзівілася і засмуцілася нават.

— Як ты трапіў сюды?

— О, ваенфельчар не ведае, як трапляюць сюды! — выскаліў зубы адзін з арыштаваных.

— Божа мой, і ўвесь гарыш! Табе ў санчасці трэба быць, а не тут! Што здарылася?

Паставіла градуснік. Я нахіліўся да яе, даверліва прашаптаў:

— Тоня, я набіў морду Кідалу. За смерць Пясоцкага. Мяне могуць судзіць. А там астаўся мой дзённік. У ім шмат што запісана. Ты разумееш? Перадай як-небудзь Астахаву, каб ён схаваў і нікому не аддаваў... Астахаву можна давэрыць.

Тэрмометр паказваў трыццаць дзевяць градусаў, і Тоня дамаглася, каб мяне перавялі ў санчасць, у тую ж палату, дзе я ляжаў раней. Мне здалося, што яна зрабіла гэта знарок. Непрыемна было ў такі час, побач з думкамі пра Сеню, прыгадваць тое, што здарылася тады. Але ранейшай непрымірымасці не было, бо само сабой атрымлівалася неяк так, што цяпер, калі не стала Сені, яна, па сутнасці, адзіны

чалавек, якому можна даверыць шмат што з таго, чаго нельга даверыць іншым.

На другі дзень Антаніна прынесла мой дзённік.

— Вось. Астахаў перадаў яго мне. Сказаў, што яму цяжка хаваць — вельмі цікуе Муха, раззваніў на ўсю батарэю...

Яна села побач на табурэце, закрыўшы мяне ад суседзяў па палаце, правярала пульс, мерала тэмпературу і гаварыла шэптам. Выгляд у яе быў стомлены і засмучаны.

— Начальнік штаба патрабуе аддаць цябе пад суд. Кажа, нельга дараваць, калі малодшы чын падымае руку на старэйшага...

— А калі праз гэтага старэйшага чына гіне чалавек, гэта можна дараваць? Так? — абурыўся я.

— А чаму ты крычыш на мяне? Людзі кажуць, што ты дурань. Знайшоў спосаб. І я згодна... Сеўчанка і Лазебны лаюць цябе, але — я адчула — будуць абараняць. Ім шкада цябе.

Я змоўк, расчулены яе словамі. Мне таксама зрабілася шкада сябе. Я папрасіў, каб яна пакуль што схавала дзённік і, калі што здарыцца, паслала па адрасе, які напісаны на многіх старонках сшытка.

— Толькі не чапай нічога.

Яна паглядзела на мяне са здзіўленнем, відаць, не зразумеўшы, што там можна чапаць. Я растлумачыў:

— Там дрэнна напісана пра цябе.

Яна ўспыхнула ўся, сарамліва апусціла вочы:

— Я ведаю.

— Ты чытала?

— Не. Я ведаю, што ты не мог напісаць пра мяне добра. Ты ўсё яшчэ ненавідзіш мяне?

Я не адказаў. Нянавісці ў сваім сэрцы я не адчуваў больш, але не мог прызнацца ў гэтым ёй і нават баяўся прызнацца сам сабе. Мне здавалася, што прыязнае стаўленне да яе — абраза для Сашы. І ў той жа час абставіны, бязлітасныя абставіны вымушалі мне даверыць ёй самае запаветнае, што давяраюць толькі добраму другу.

Дні праз два, калі я адчуў сябе лепш, мяне выклікаў камандзір дывізіёна — капітан Купанаў, былы камандзір нашай вучэбнай батарэі. Мяне ўсцешыла, што далі рэмень. І я

ішоў на КП адзін, без канваіра, вольны і пры поўнай форме. Але ўсё роўна недалёкая дарога гэтая была для мяне нялёгкай. Чым бліжэй падыходзіў да КП, тым больш цяжэлі ногі, і, урэшце, мая хада стала нагадваць той кашмарны сон, калі хочаш ісці, энергічна падымаеш ногі, робіш крокі і заўважаеш, што не можаш скрануцца з месца. Апанаваў страх. Што скажа мне гэты маленькі чалавек, якога мы празвалі Напалеонам? Што я адкажу яму? У галаве ніводнай думкі. Здавалася, лягчэй было б стаць перад дзесяццю самымі суровымі суддзямі, чым перад адным капітанам. Я паважаў яго і баяўся. Просты, гаваркі Сеўчанка ніколі не выклікаў у мяне такіх пачуццяў: я паважаў яго не менш, але не баяўся нават тады, калі ён злаваўся і моцна «прапясочваў» за штонебудзь. Да яго я пайшоў бы з радасцю, гатовы выслухаць самы суровы прысуд.

Купанаў, усё такі ж стройны, перацягнуты партупеяй, хутка падняўся, калі я, атрымаўшы дазвол, зайшоў і пачаў дакладваць. Ён выслухаў, што з'явіўся па яго загаду, і... маўчаў. Стаяў насупраць за планшэтным сталом, пільна ўглядаўся ў мой твар, быццам хацеў пазнаць ці, наадварот, убачыў упершыню і хацеў назаўсёды запомніць. Натуральна, што я не вытрымаў яго позірку, апусціў вочы і адчуў, што мне душна, на лбе, на шыі, на спіне выступае пот, ды такі едкі, што засвярбела ўсё цела. Але я не мог паварушыцца. Скоўвала думка — адзіная, якая свідравала мозг: калі ён паглядзіць гэтак моўчкі яшчэ хвіліну, я не вытрымаю, мне стане млосна.

Але ўрэшце капітан сказаў:

— Я вас слухаю, сяржант Шапятовіч.

І тады я ўстрапянууся, «прарваўся», як кажуць: ступіў крок бліжэй, загаварыў так шпарка, быццам баяўся, што не здолею выказаць усяго за той час, які мне адпушчаны лёсам і камандзірам:

— Таварыш капітан! Я быў упэўнены і цяпер упэўнены, што ён... ён, Кідала... знарок кінуў Сеню... Пясоцкага. Я ведаю гэтага чалавека, я вучыўся з ім... У тэхнікуме і тут, у арміі. Ён ненавідзеў Пясоцкага. Завошта — я не ведаю... Помніце, у пачатку вайны?.. Кідала выдумаў тады, што

Пясоцкі паражэнец. А потым гэтая гісторыя з гадзіннікам... Калі мы затрымалі нямецкага лётчыка, ён хацеў забраць у яго гадзіннік. А Сеня сказаў, што гэта марадзёрства! І вось ён адпомсціў яму. Як адпомсціў! Забойца!

— Гаварыце спакойна! — кінуў Купанаў.

Але мне сапраўды ўжо было ўсё роўна, што зробяць са мной.

— А я не магу гаварыць спакойна! Вы можаце паслаць мяне ў штрафную, куды хочаце. Але калі я зноў сустрэну гэтага тыпа, няхай ён хоць генералам стане, я не толькі расквашу яму морду, я...

— Даволі! — перапыніў капітан, ляпнуўшы далонямі па стале.

Я змоўк — яму нельга было не падпарадкавацца. Зноў з'явілася трывога: што ён вырашыць, чаму так доўга думае? І раптам ён сказаў, як заўсёды, коратка, афіцыйна, па-вайсковаму:

— Пойдзеце ў батальён ВНОС[1]! Сёння ж адбыць! Дакументы вазьміце ў памначштаба лейтэнанта Мураўёва. Можаце ісці!

Замест таго каб адказаць, што патрэбна па статуту, я зноў «сарваўся»:

— А ён... ён не панясе ніякай кары? Кідала?..

Я ўбачыў, як уздрыгнулі, узляцелі на лоб белыя бровы камандзіра дывізіёна. Здзівіўся ён, расчараваўся ці ўгневаўся? Я асекся.

— Можаце ісці! — паўтарыў ён ціха, але з такім націскам, з такой сілай, што мне адразу ўспомнілася ўсё, чаму ён некалі вучыў нас. Я выскачыў з душнай зямлянкі, прагна глытнуў марознае паветра. І тут асэнсаваў яго словы: «Пойдзеце ў батальён ВНОС». Чаму ў гэты батальён, не разумею і цяпер. Але тады я зразумеў, што ўратаваны ад нечага страшнага і ганебнага, што знайшліся людзі, якія зразумелі мой душэўны стан, калі я схапіў табурэтку. Упершыню за тыя чорныя дні я ўбачыў дзень, палярны, хмурны, але ён здаўся мне цудоўным. Я ўбачыў белы снег, без водбліскаў агню, сіні заліў, нескораны горад — і ўзрадаваўся жыццю. Толькі вы-

[1] ВНОС — служба паветранага назірання, паведамлення, сувязі.

лаяў сябе, што не падзякаваў Купанаву і нават не развітаўся па-людску. Свінтус!

Атрымаўшы належныя дакументы і свой ранец з небагатым салдацкім набыткам, я пайшоў у санчасць, каб забраць у Антаніны дзённік. Помню, ідучы, я пашкадаваў, што аддаў яго. Панікёр! Але няхай яна зразумее, што я ратаваў яе гонар.

Яна не выявіла асаблівых пачуццяў, даведаўшыся, што я ад'язджаю,— ні смутку, нічога іншага. І нічога асаблівага мы не сказалі адно аднаму, словы былі нязначныя. Па дзённік яна некуды хадзіла, прынесла яго, акуратна загорнуты ў марлю і цыратку. Выйшла з барака ў адным халаце, каб правесці мяне. І на двары сказала:

— Мне перадалі яго пісьмы. Тры пісьмы. Ён пісаў мне і насіў з сабой у кішэні...

— Сеня? Дай мне.

Яна пакруціла галавой.

— Не. Я нікому не дам іх. Я прачытала, і нешта быццам парвалася ў мяне тут,— яна паказала на грудзі.— Я хаджу сама не свая...

— Дай мне гэтыя пісьмы,— зноў папрасіў я.— Навошта яны табе? Ты не кахала яго...

— Не кахала,— сумна паўтарыла яна.— Але пісем я табе не дам... А можа... можа, я стану лепшай, калі яны будуць пры мне?..

Яна сказала гэта такім голасам, што я пашкадаваў яе і адчуў: хвіліна развітання для мяне робіцца сумнай. Больш не было слоў, якія я мог сказаць. Папрасіў, каб яна перадала прывітанне «маім хлопцам».

— Асабліва Астахаву і Чарняку. А Сеўчанку і Лазебнаму скажы дзякуй. Ніколі не забуду іх.

Яна спытала:

— Ты напішаш мне?

— Не ведаю,— адказаў я шчыра, бо сапраўды не ведаў, ці будзе ў мяне жаданне пісаць ёй.

Развіталіся кароткім поціскам рук.

Я не стаўлю нават даты. Дні так падобныя адзін на адзін, што адрозніваюцца хіба толькі тым, што бываюць ясныя, калі з-за далёкай грады лясістых сопак вылазіць ненатуральна жоўтае халоднае сонца — гадзіны на дзве-тры, а ўначы калышуцца ў небе дзіўныя палотнішчы палярнага ззяння, і бываюць дні завірушныя. Апошніх у гэтым месяцы больш. Снег пачынае падаць зверху, узнімаецца знізу, і ўвесь свет засцілае снежная каламуць. Сціраецца мяжа паміж днём і ноччу, паміж сапраўдным і ўяўным. Снег і снег. Павярнуўшыся, не ведаеш, куды ісці, дзе ўсход, дзе захад, дзе зямлянка, дзе абрыў у возера. Становячыся на варту, абвязваем сябе доўгай вяроўкай, другі канец якой моцна прывязаны за жалезную скабу, забітую ў сцяну нашай бярвенчатай будыніны. І вартавому ў такія ночы прыходзіцца час ад часу падымаць усіх, каб прачысціць тунелепадобны праход ад дзвярэй на пляцоўку і скінуць снег з даху, з коміна, бо прапусці гадзіну-другую — і мы будзем пахаваны жывымі, не здолеем ні адчыніць дзвярэй, ні выбрацца праз акно.

Хаціна, у якой мы жывём, пабудавана ў дзіўным месцы — у цясніне паміж скаламі. Цясніна, расшыраючыся, паката спускаецца да берага азёрнай бухты. Гэта адзіны выхад на шырокі прастор, «вароты ў свет». Праўда, цяпер, калі намяло гурбы снегу, з даху можна ўзабрацца па левай круцізне ўверх і адтуль лёгка спусціцца ў лясную даліну, што ляжыць на ўсходзе ад нас. На правы выступ скалы ўзысці лягчэй — прырода як бы збудавала штучныя ўсходцы, якія мы таксама акуратна чысцім, бо там, на вяршыні гэтай скалы, наш назіральны пункт. Там стаіць вартавы і сочыць за небам. З іншых трох бакоў скала строма абрываецца ў возера. Вузкае і даўгое, як амаль усе азёры Поўначы, яно цягнецца на паўночны захад так далёка, што супрацьлеглы бераг яго вырысоўваецца толькі ў ясныя раніцы. Калі ўсходзіць сонца, возера слепіць сваёй белізной. Не, не белізной — блакітнай іскрыстасцю. Цяпер я ніколі не бачу снег белым, такім, як бачыў у роднай Беларусі. Цяпер ён заўсёды то ружовы, то блакітны, то сіні, то нават жоўты.

Пост наш — самы далёкі. Ад Кандалакшы, дзе знаходзіцца штаб батальёна, трэба ехаць цягніком на захад,

да маленькагаляснога паўстанка, каля якога размешчаны нейкія прыфрантавыя тылы. Ад гэтага паўстанка, з якім мы маем тэлефонную сувязь, трэба ісці на лыжах кіламетраў пятнаццаць на поўнач.

Успамінаю размову з камандзірам батальёна. Я прыехаў не адзін, нас было пяцёра з дывізіёна, але астатнія разведчыкі. Яны ведалі, што едуць на пасаду камандзіраў пастоў, бо батальён толькі фарміраваўся. Я не разумеў, калі даведаўся пра ўсё гэта (ды і дагэтуль не разумею!), чаму Купанаў паслаў сюды мяне, агневіка. Хацеў схаваць ад трыбунала? Ці баяўся, што, калі астануся ў дывізіёне, няхай і на іншай батарэі, непазбежна сустрэнуся з Кідалам, і тады можа быць яшчэ большае ЧП. А магло здарыцца! Нам лепш не сустракацца, бо я ніколі не дарую яму смерці Сені.

Маёр Жураўлёў, худы і стомлены (потым [redacted] даведаўся, што ён прыехаў з блакаднага Ленінграда), няўважліва разглядаў нашы дакументы. Але калі чарга дайшла да мяне, зацікаўлена ўзняў вочы.

— А-а, гэта ты? Купанаў расказваў мне... Што ж ты сваіх б'еш?

— Сярод сваіх таксама трапляюць...— Я не мог знайсці ёмкага і трапнага вызначэння і запнуўся.

— Якіх варта біць? — усміхнуўся маёр і тут жа цяжка ўздыхнуў: — Бывае.

Я адразу адчуў сімпатыю да гэтага чалавека — люблю людзей разумных і простых, не фармалістаў.

— Пойдзеш камандзірам дзевятага,— сказаў мне тады маёр Жураўлёў.— Але май на ўвазе — самы адказны пост. Самы далёкі і самы блізкі ад фронту. Там трэба вуха трымаць востра. Глядзець не толькі за небам, але і за зямлёй. Часам праз лінію фронту прарываюцца лыжнікі. А фіны, ведаеш, якія лыжнікі? А лінія фронту тут — чорт яе судзельную ўтрымае на гэтай забытай Богам зямлі. Тут улетку ні прайсці ні праехаць... Людзей у вас будзе мала, пакуль што ўсяго тры чалавекі там, вы чацвёрты. Несці дзяжурства прыйдзецца ўсім. Людзі своеасаблівыя. Да кожнага трэба падабраць ключык.

І вось, калі я пражыў паўтара месяца з гэтымі «своеасаблівымі людзьмі», ключыкі знайшліся самі сабой. Ці больш

правільна сказаць, ніякія ключыкі не спатрэбіліся. Можа, я дрэнны камандзір, «ліберал», як лаяў мяне Малашкін, але і з новымі сваімі падначаленымі, калі крыху апомніўся і пра ўсё расказаў ім, хутка здружыўся. І служба ў нас ідзе без усялякіх непаразуменняў: кожны ведае сваё месца, свае абавязкі і ўсе дакладна, без спрэчак, выконваюць мае няхітрыя загады.

А людзі сапраўды своеасаблівыя. Двое з іх старэйшыя за майго бацьку — Фядос Яфрэмавіч Сушылаў і Аляміі Мармакавіч Самародаў. Апошні мне здаўся зусім старым чалавекам (пасля я даведаўся, што ён гады на тры маладзей за Сушылава), і неяк мімаволі з першых дзён я пачаў называць яго «дзядзька Алампі». Так гэта і замацавалася за ім. І стары Сушылаў і малады насмешнік Платон Чуб звяртаюцца да яго цяпер толькі гэтак. Дзядзька Алампі — калгаснік з нейкага глухога раёна Кіраўскай вобласці, чалавек малапісьменны, ціхі, і дзіўна: селянін, бацька вялікай сям'і, а нейкі няўмелы, як дзіця, не прыстасаваны да розных жыццёвых умоў. У яго сямёра дзяцей, два старэйшыя сыны на фронце. І, здаецца, няма ў яго ніякіх іншых думак, акрамя думкі пра сваіх дзяцей.

Садзімся абедаць — ён употай хрысціцца, уздыхае:

— Дзе там мае сыночкі-галубочкі?..

Есць ён ашчадна, заўсёды так, быццам яму сорамна, што можа з'есці многа і смачна. Аднойчы ён выказаў гэта:

— А што там мае дзеткі ядуць? Не густа ў іх...

А то я прыкмеціў, што ён не спажывае свае порцыі цукру, а складае драбкі ў рэчавы мяшок.

— Навошта гэта вы, дзядзька Алампі?

Збянтэжыўся, замаргаў вачамі, укінуў адзін драбочак у рот, пачаў тлумачыць наіўна, як малы:

— Дачушка мая, Танечка, вельмі любіць цукар. Бывала, іду ў краму — заўсёды просіць...

— Але калі гэта вы прыедзеце да яе!

Напамінак пра тое, што не скора ён пабачыць сваіх дзяцей, вельмі ўсхваляваў старога, доўга ён не мог супакоіцца. Дарэчы, пра цукар, які ён адкладваў. Дні чатыры гуляла завіруха, і мы не маглі выбрацца па прадукты. Скончыўся хлеб, цукар, елі адно мяса. Абрыдла. Платон Чуб не прасіў — запатрабаваў:

— Дзядзька Аляпі, выкладай свой цукар! На які чорны дзень ты збіраеш яго? Адсырэе.

Самародаў не пярэчыў. Але я бачыў, як цяжка яму апустошваць свой мяшок.

Чуб рагатаў:

— Вось кулак! Бачыў ты, камандзір, кулака? Мы ж табе аддамо, калі атрымаем. Не жылься.

Думаю, што шкада цукру яму было не ад прагнасці, ён не мог сумнявацца, што цукар яму вернем. Магчыма, кладучы кожны дзень драбкі ў мяшок, ён уяўляў, што аддае іх дзецям, таму і цяжка было забіраць назад.

Часта, калі я стаю на варце, асабліва ўначы, ён ідзе з хаты, узыходзіць на скалу, вінавата неяк просіць:

— Не спіцца мне, таварыш камандзір. Давай я пастаю. Пра дзетак сваіх падумаю.

Дзяжурыць ён любіць, але я заўсёды баюся, што ён будзе думаць пра дзяцей сваіх і нічога не пачуе і не ўбачыць.

Чуб недалюблівае Аляпія. Здзекліва кпіць. У самым пачатку майго з'яўлення на пост расказаў адзін на адзін:

— Гэты «хоца»,— у Самародава вяткаўскі дыялект, у многіх словах замест «ч» вымаўляе «ц»,— да прыходу ў батальён доўга ляжаў у шпіталі. Экзема ў яго на нагах ніяк не гаілася. А сюды прыйшоў — без лекаў гоіцца. А я ведаю, што ён там рабіў: соллю пасыпаў сваю экзему, каб на фронт не паслалі.

Непрыемна мне было слухаць гэта. Не спадабаўся Чуб за тое, што адразу нагаворвае на таварыша, што выдумаў на старога чалавека такую абразлівую мянушку — «хоца»; я заўсёды не любіў людзей, якія смяюцца з мовы іншага народа ці з дэфектаў вымаўлення асобных людзей. Я сказаў пра гэта Чубу, ён, відаць, не зразумеў і колькі дзён трымаўся афіцыйна.

Але мяне ўразіла іншае: соль гэтая, якой пасыпаюць раны, каб надаўжэй затрымацца ў шпіталі. Няўжо сапраўды ёсць такія людзі? Я ведаў, што ёсць дэзерціры, самастрэлы (нам чыталі загады), усе мы на батарэі з нянавісцю гаварылі пра гэтых здраднікаў, можа, з большай нянавісцю, чым нават пра фашыстаў. Але пасыпаць соллю ўласныя раны — проста не змяшчаецца ў маёй свядомасці, здаецца неверагодным.

Некаторы час пасля гэтага я адносіўся насцярожана і да Самародава і да Чуба.

Толькі да Сушылава я адчуў павагу з першых дзён. Ён з архангельскіх памораў, але не рыбак, а паляўнічы, рабочы зверасаўгаса, хоць лавіць рыбу ўмее гэтак жа ўдала, як і паляваць. Ён ва ўсім процілегласць дзядзьку Алампію. Той худы, ссутулены, гэты каржакаваты, як камёл добрага дуба, толькі крыху касалапы. Той амаль сівы ўжо, гэты ж старэйшы па гадах, а ў яго ледзь-ледзь пасерабрыліся скроні: валасы цёмныя, густыя, з рудаватым адлівам, крыху святлей калматыя бровы — амаль зусім рудыя, а вусы чорныя. Па жэсту, які Сушылаў рабіў часам, забыўшыся, я адразу здагадаўся, што ён насіў бараду. Потым стары прызнаўся: так, насіў, але ў будаўнічым батальёне, дзе ён служыў дагэтуль, камандзір прымусіў яго пагаліцца — для гігіенічнасці. Сушылаў папрасіў, каб я дазволіў яму адгадаваць бараду, і я дазволіў на сваю адказнасць. Праз тыдзень твар яго непазнавальна змяніўся.

Чуб смяецца:

— Хітры ты, Фядос Яфрэмавіч: лянуешся галіцца, бараду выдумаў. А я вось скрабу праз дзень тупой брытвай, хоць завязвай нешта...

Сушылаў не маўклівы, але вельмі немнагаслоўны, гаворыць — быццам ласку робіць. Дзяцей у яго двое, дарослыя, сын, ваенны марак, і дачка, студэнтка, асталася ў блакадным Ленінградзе. Ад сына прыходзяць пісьмы, пра дачку нічога невядома.

Але ён не ўздыхае, як Самародаў, і не ўспамінае пра дзяцей пры нас. Толькі, прыкмеціў я, у газетах надзвычай уважліва чытае ўсё пра Ленінград.

Чуб празваў Сушылава «наш кармілец». І гэта не жарт, гэта сапраўды так.

У першыя дні, уражаны Сеневай смерцю і ўсім, што адбылося пасля, я нічога не бачыў, не заўважаў, што ем, адкуль бярэцца рыба, мяса. А потым раптам звяртаецца да мяне Сушылаў:

— Мяса няма, таварыш камандзір. Дазвольце раздабыць.

— Раздабыць? Дзе? Паехаць у батальён?

Ён усміхнуўся з маёй наіўнасці.

— Схадзіць на паляванне. Можа, удасца хоць курапатку падстрэліць.

Ён пайшоў раніцой на лыжах, з вінтоўкай, з сякерай за рэменем. А вярнуўся позна ўвечары і прынёс на сваіх дужых плячах маладога аленя. Я ўбачыў, і ў мяне сціснулася сэрца, успомніўся наш батарэйны любімец Лёша.

— Навошта вы? — спытаў я Сушылава.

— Як — навошта? На мяса,— проста і нават, здалося мне, сярдзіта адказаў ён; вядома, стаміўся чалавек.

Чуб і Самародаў паглядзелі на мяне, як на вар'ята (у першыя дні яны сур'ёзна лічылі, што ў мяне «не ўсе дома»), і пачалі з сялянскай разважлівасцю і сур'ёзнасцю свежаваць аленя. А дзён праз колькі Сушылаў адпрасіўся на возера — рыбкі захацелася — і прынёс паўмяшка акунёў. Ён не толькі ўмеў паляваць і рыбачыць, але і гатаваць быў мастак. Спрабавалі кулінарыць па чарзе. Ды абеды дзядзькі Алампія — хоць на сабаку вылі, «бабскіх спраў», як ён кажа, гэты сялянскі патрыярх не разумее. Крыху хіба лепш у Чуба. А ў Сушылава нешта незвычайнае. З алеаіны ён нагатаваў такіх смачных рэчаў, якіх я ніколі ў жыцці не еў.

І ў батальён па прадукты часцей за ўсё ездзіць ён, «наш кармілец», сам просіцца. Яму давай любую работу, самую цяжкую, абы толькі не стаяць на голай скале і не ўглядацца ў пустое неба. Не можа трываць памор нерухомасці і бяздзейнасці.

Платон Чуб усяго толькі гадоў на дзесяць старэйшы за мяне. Ён кубанскі казак, ганарыцца сваім казацкім званнем і дужа перажывае, што з-за нейкай хваробы не мог трапіць у кавалерыю, па гэтай прычыне яго ў свой час і ў армію не ўзялі, але што за хвароба — сам не ведае ці, можа, хітруе, не прызнаецца. Чалавек ён не без хітрыкаў і дзівацтваў, але ўвогуле шчыры, па-сялянску прастадушны, чуллівы, паэт у душы. Крыху гультаяваты, наровіць, каб хто іншы за яго зрабіў. На дзяжурства збіраецца паўгадзіны і за паўгадзіны будзіць свайго зменшчыка — усяляк выгадвае, каб менш стаяць на марозе, асабліва ўначы. Сушылаў усё яму даруе, любую іншую работу можа выканаць за яго, а за гэта лаецца — мацюкаецца немнагаслоўна, але з такім гневам, што робіцца боязна. Я пераманіў змену, каб Чуб будзіў мяне, ён

хітры і крыху падхалім, камандзіра не будзіць на паўгадзіны раней, хоць ніколі не перастаіць і лішняе, як дзядзька Аламші.

Чуб любіць спяваць. Сядзіць ці стаіць недзе, раптам заплюшчыць вочы, кіўнецца з боку ў бок, быццам задрамаў, і заводзіць па-жаночы працяглую песню:

Ты взойди, ты взойди, красное солнышко,
Над горою взойди, над высокою,
Над ущельями взойди, над глубокими,
Над лесами взойди, над дремучими...

Песня ніякага дачынення да Кубані не мае. Але, глядзіш, па шчацэ казака коціцца сляза. Трасане галавой, і пайшло лірычнае адступленне:

— Эх, камандзір, браточкі мае, не бачылі вы Кубані! А не бачылі — дык маўчыце. Не ведаеце вы сапраўднага харaства. Эх, Кубань, Кубань, родная старонка! Як у песні пяецца. Якія прасторы, каб вы ведалі! Бывала, устанеш раніцой, выйдзеш з курэня... Дзесьці на краі свету сонца ўсходзіць. Божачка мой! Якое сонца! Хіба тут такое сонца? Ніколі вы такога сонца не бачылі. Глядзіш на яго, адарвацца не можаш, пакуль вочы не аслепіш. А потым нап'ешся цёплага сырадою, проста з гладыша, ускочыш на каня — і ў стэп (Чуб хваліўся, што ён адзін час быў брыгадзірам у калгасе). Едзеш па стэпе, па вузкай дарожцы. Раса блішчыць... А з усіх бакоў пшаніца. Во якая пшаніца! Мора цэлае, і няма яму ні канца ні краю. А Божачка мой! Хіба вы бачылі такую пшаніцу! Што ў вас можа расці? А ў нас жа на Кубані!.. На баштан заедзеш — кавуны во якія ляжаць, як тое сонца, калі ўсходзіць. Паласнеш па ім нажом — сок пад самае неба пырскае... Ясі, і есці хочацца.

Старыя слухаюць яго ўважліва; ніхто з іх на поўдні не быў, а Самародаў ніколі ў вочы не бачыў такога дзіва, як кавун.

— Вось бы дзецям гэтага кавуна,— уздыхае ён, мабыць, незадаволены такой несправядлівасцю. Яго дзеці ў жыцці не каштавалі гэтага дзівоснага кавуна, а такі «здаровы кабан», як Чуб, мог есці колькі хацеў. Яблыкамі ў дзяўчат шпурляў, як ён расказваў аднойчы. Не мае чалавек павагі да дабра, якое патрэбна дзецям.

— А то наробішся ў жніво,— раптам ад кавуноў ці яблык пераходзіць зусім на іншае Чуб, увесь аддаючыся дарагім успамінам,— так, браткі, наробішся, костачкі трашчаць...

— Не вельмі ты кідкі да работы,— сумняваецца Сушылаў.

Чуб абураецца:

— Я? Ды што ты разумееш, хоць і стары ты чалавек? Халодная твая душа! Я, можа, першы ўдарнік у калгасе быў. А ты... Ты ж пшаніцы ніколі не бачыў, не ведаеш, як яна расце... Табе б толькі звяроў страляць! А каб ты ведаў, што такое касьба ды малацьба, то не гаварыў бы так... Там, брат, у любога душа заспявае... Ты ўяві сабе...

І зноў пачынае распісваць кубанскія стэпы, уборку пшаніцы, ночы на палявым стане, ды так, што сапраўды заслухаешся. Але гэта не ўпершыню ўжо, і я кажу яму:

— Платон, ты хацеў нешта пра костачкі расказаць, якія трашчаць...

— А-а.— І такая цёплая ўсмешка расплываецца па яго твары, быццам у нашу пракураную хаціну заблудзіў прамень кубанскага сонца.— Не пра костачкі, а пра радасць жыцця... Наробішся, усё баліць і ные: здаецца, упаў бы і заснуў бы, дзе стаіш... А прыйдзеш дадому — дзеці на калені лезуць...— У Чуба таксама двое дзяцей.

— Эх, дзеткі, дзеткі,— цяжка ўздыхае дзядзька Аламп і.

— ...паскардзяцца, хто каго за чуб колькі разоў цягаў. У нашым родзе ўсе чубатыя, таму і мянушку нам такую далі. Мой дзед яшчэ пісаўся Канаваленка, а бацька, калі на тую вайну пайшоў...

— Платон, пра гэта чулі ўжо.

— А-а,— не крыўдзіцца ён,— дык вось я і кажу: жыццё, яно такую сілу мае, браткі... Напячэ жонка пшанічных блінцоў, сала скавародку насмажыць... А потым ляжаш з ёю ў свірне на падлозе, дзе халадок... Дыхае яна табе ў вуха, расказвае свае жаночыя справы, і пахне ад яе, галубкі маёй, хлебам, малаком, зямлёй, дзецьмі, стэпам палыновым — усім, што сэрцу твайму люба. Так хораша пахне, ажно ў галаве пачынае кружыцца... А пакладзеш руку на яе гарачыя грудзі, дыхаюць яны, як тыя пшанічныя паляніцы, якія толькі з печы выцягнулі. Божачка мой, адкуль тая сіла возьмецца! Ні стомленасці няма, нічога...

Самародаў дакорліва ківае галавой, дзіўна неяк усміхаецца, але слухае. Сушылаў чамусьці не любіць такіх успамінаў — хмурыцца і выходзіць з хаты ці адыходзіць, калі размова ідзе на двары.

— Старавер. Сектант нейкі,— шэпча мне Чуб, ківаючы яму ўслед. Але ніякіх рэлігійных праяў у старога паляўнічага я не заўважаю. Самародаў хоць часам употай хрысціцца, Сушылаў — ніколі.

Я асабіста нічога непрыстойнага ў расказах Чуба не бачу. Я заўсёды насцярожваўся, калі ў мужчынскай кампаніі пачыналася гаворка пра жанчын, бо часта чуў брудныя анекдоты, цынічную пахвальбу. Гэта заўсёды абражала мяне — за Сашу. Але ў Чуба няма і кроплі цынізму.

Пра жонку ён успамінае з вялікім замілаваннем, шчыра і паэтычна, гэтак жа, як пра свае кубанскія стэпы. Мяне здзіўляе і ўражвае іншае. Хораша расказаўшы пра сваё каханне да жонкі, ён раптам праз хвіліну пачынае амаль з такой жа любасцю ўспамінаць другую жанчыну.

— А то, браткі мае, на палявым стане, калі ўначы малоціш, ды і ўдзень, дзе-небудзь за сціртай у пахучай саломе прытуліш да сэрца добрую маладзіцу — а Божачка! — быццам у рай пападзеш. У нас удава ёсць, Даша Канцавая... Мая Галя аднойчы як заспела нас... Чортава баба, як дала граблямі па спіне, тры зубы да рэбраў дасталі, і цяпер шраміны відаць, як ад куль нямецкіх...

Аднойчы, калі мы ўдвух пайшлі шукаць разрыў тэлефоннага проваду, я спытаў у яго:

— Скажы, Платон, ты кахаеш сваю жонку?

— А Божачка! Ды, здаецца, каб крылы меў, паляцеў бы... Восем гадоў душа ў душу пражылі...

— Ты верыш ёй?

— Ды яна ў мяне як святая.

— А ты?.. Сам ты? Заляцаўся да другіх, здраджваў... Як ты мог?

— А братка мой! Дык жыццё ж такое! Думаеш, ты манахам пражывеш? Не пражывеш!

Гэтым наіўна-вясёлым і ўпэўненым «Не пражывеш!» ён ударыў мяне ў самае балючае месца. Я змоўк. Што я мог адказаць яму? Запярэчыць? Даказаць, што я лепшы?

Увогуле яго расказы, простыя, жыццярадасныя, надзвычай вярэдзяць мне сэрца. Як, магчыма, ніколі раней, думаю я пра Сашу, думаю бясконца, удзень і ўночы. Пачуцці мае, здаецца, разгарэліся з новай сілай — каханне, смутак, трывога, страх за яе, за Ленку. І сорам, пакута ад здрады зрабіліся такімі ж вострымі, як у першыя дні. Але разам з гэтым зноў рэўнасць, недарэчнасць, абсурднасць, ганебнасць якой я ўсведамляю, аднак нічога не магу зрабіць з сабой. Зноў, заплюшчыўшы вочы, я бачу побач з Сашай гэтага настаўніка — Лялькевіча. Ад такога відовішча кусаю рукі... Хочацца закрычаць на ўсю гэтую снежную пустыню... А можа, гэта прадчуванне? Тфу! Я раблюся забабонным і дурным! Я лаю сябе, як толькі можна, але ад гэтага мне не робіцца лягчэй.

Не сціхае і боль за Сеню. І злосць на Кідалу. Праўда, тыдзень назад я атрымаў пісьмо ад Астахава. Ён піша, што Сцяпан Кідала за смерць Пясоцкага разжалаваны да старшага сяржанта і накіраваны на трэцюю батарэю камандзірам аддзялення разведкі. Малайчына Купанаў! Ёсць, значыцца, на свеце справядлівасць! Невялікая кара, але ўсё-такі няхай адчуе, што не адзін я лічу яго вінаватым у смерці чалавека. Разам з крупінай задавальнення пісьмо прынесла смутак. Тры словы: «Дзянькі ў нас гарачыя» — разанулі па сэрцы, якое сцякае крывёю і так. Я разумеў, што значыць «дзянькі гарачыя»: лятаюць фашысты, ідуць баі. Яшчэ больш горача там, дзе нашы, мае таварышы па зброі, мае равеснікі, землякі, гоняць ворага ад Масквы і, можа, неўзабаве ступяць на беларускую зямлю — не так ужо далёка. Усюды горача. Адзін я тут прахалоджваюся са старымі дзядзькамі. Жару аленіну, смачна прыгатаваную Сушылавым, і ўглядаюся ў пустое неба: нават самалёты тут пралятаюць рэдка. Асабліва чамусьці цяжка ў ціхія бязветраныя дні. Снежная цішыня глушыць, ціснe; хочацца завыць па-воўчы.

Відаць, Купанаў ведаў, як пакараць мяне. Але я павінен вырвацца адгэтуль!

Дзён колькі назад пазванілі з «Елкі», што да нас прыедзе «дваццаць першы» — маёр Жураўлёў.

Пачалі раіцца, як сустрэць камандзіра. Сушылаў адразу прапанаваў сустрэць як належыць — не скупіцца. Дзядзька Алампі выказаў апаску (стары ўсяго баіцца), каб залішняя

гасцiннасць часам не пашкодзiла нам: пабачыць маёр, як мы жывём — i мяса, i рыба! — ды возьме i абрэжа нам паёк, якi атрымлiваем у батальёне.

— Вось жа кулак! — засмяяўся Чуб.— Бачыў ты, камандзiр, кулака? Дзядзька Аламп! Ды ты гасцей прымаў калiнебудзь? Цi ў вас, вяткаўскiх, гэта не заведзена?

— Я сына жанiў,— пакрыўдзiўся стары.— Усё сяло на вяселлi гуляла. Але ж цяпер табе не вяселле. Вайна.

Сушылаў задумаўся.

— Аленiну, я думаю, таварыш камандзiр, не трэба выстаўляць. Невядома, як маёр паставiцца да браканьерства нашага. Але прыняць трэба па-людску. Не раскашуюць нашы афiцэры — бываю, бачыў. Я курапатку падстрэлю i рыбы налаўлю.

Рэшткi аленняй тушы мы схавалi ў снезе, далей ад паста, каб яна не трапiла на вочы начальству.

Я пайшоў на паўстанак сустрэць камбата. Калi iшлi назад, то ўбачыў, што Жураўлёў слабы i хворы чалавек. Пятнаццаць кiламетраў дарогi на лыжах па лесе i сопках забралi ў яго апошнiя сiлы. Ён бадзёрыўся, жартаваў, стараўся не адстаць ад нас (iшоў таксама баец, якi прыехаў з iм), але я бачыў, як цяжка яму, i часцей, чым мне трэба было, спыняўся адпачываць.

Да нашага прыходу Сушылаў прыгатаваў царскi абед. Мiж iншым, каб не есцi з кацялкоў, ён яшчэ раней выразаў цудоўныя драўляныя талеркi з бярозы. Калi мы зайшлi ў нашу будынiну, увесь гэты посуд, напоўнены халоднай закуссю, стаяў на стале. Ад смажанiны, што падагравалася на печцы, iшоў такi апетытны пах, што вельмi проста ў галоднага чалавека магла закружыцца галава. Маёр спынiўся каля дзвярэй, заплюшчыў вочы i, здалося мне, пахiснуўся.

— Што гэта? — няўпэўненым голасам спытаў ён.

— Чым багаты, тым рады, таварыш маёр! — бадзёра прывiтаўся «наш кармiлец».

— Радавы Сушылаў — паляўнiчы i рыбалоў. Ну, вось курапатка, рыба...— тлумачыў я, крыху баючыся, што маёру можа не спадабацца такая раскоша.

Жураўлёў стомлена апусцiўся на нары.

— Спалохалі вы мяне. Думаў: зноў галюцынацыя. У мяне ў блакадзе часта было: чую пах найлепшых страў, якія еў да вайны, бачу іх...

Вельмі нас усіх кранула такое шчырае яго прызнанне і тое, як ён потым доўга хадзіў навокал стала, углядаўся ў падсмажаную рыбу, нюхаў наварыстую юшку і жоўтую апетытную курапатку.

— А гатаваў хто?

— Я! — адгукнуўся Сушылаў, спадзеючыся, мабыць, на падзяку.

— Кухарам у батальён не жадаеце пайсці?

Чуб пасля прызнаўся, што ён ледзь не самлеў, пачуўшы такую прапанову камандзіра. Кубанец больш за ўсіх любіў смачна паесці. А страціць Сушылава — значыцца, сесці на траску і гарохавы суп.

— Ніяк не, таварыш маёр! Ніколі не быў кухарам і не жадаю быць. А гэта,— кіўнуў «карміленц» на стол,— пастараліся ўсе разам для дарагога госця.

Чуб з палёгкай уздыхнуў — пранесла.

— Калі такі абед, даставай, Лунін, нашы запасы, будзем баляваць. Даўно я не сядзеў за такім сталом,— сказаў маёр.

«Самым істотным» у мяшку ардынарца была біклажка. Жураўлёў наліў у кубкі па глытку гарэлкі.

— Ну, таварышы, за тое, каб вы варту добра неслі, каб фашысты не прылятаді знянацку... каб адчулі, што цяпер — гэта ім не чэрвень сорак першага... што мы навучыліся арганізоўваць абарону аб'ектаў... За перамогу нашу!

Хораша мы паабедалі — проста, шчыра, па-сямейнаму. А потым Чуб спяваў свае працяжныя песні.

Раніцой, калі я сам стаяў на пасту, камбат падняўся на скалу. Павітаўся, уважліва агледзеў наваколле і зацягнутае хмарамі неба.

— Што ж, пост зручны ва ўсіх адносінах,— адзначыў ён, углядаючыся ў прастор возера, потым закурыў і пажартаваў: — Жывеш ты, Шапятовіч, тут, як Бог.

Я адчуў, што гэта самы зручны выпадак, каб папрасіць аб тым, пра што даўно думаў.

— Таварыш маёр! Накіруйце мяне на фронт... Не магу я... Сорамна. Зразумейце, сорамна... з дзядамі лысымі аціраццa тут...

Маёр кінуў недакурак уніз, у возера. Лоб пад шапкай стаў як гармонік — увесь у зморшчынах. Адказаў не адразу:

— Па-вашаму, значыцца, тут можна абысціся аднымі дзядамі, як вы кажаце? Сабраць сляпых, глухіх, без ведаў, без падрыхтоўкі? Дрэнна вы разумееце значэнне нашай службы, Шапятовіч.— І сказаў жорстка, як загадаў: — Служыце сумленна там, дзе вас паставілі!

Я ўнутрана сцяўся, чакаючы, што ён папракне мяне гісторыяй з Кідалам. Не. Жураўлёў не з тых людзей. Ён памаўчаў, скруціў другую цыгарку і сказаў лагодна, па-сяброўску:

— А на фронт трапіш, не гаруй. Не заўтра вайна канчаецца. Людзі спатрэбяцца. Я вось... дацэнт, палітэканомію выкладаў. Вайна пачалася, апалчэннем камандаваў, умацаванні будаваў пад Ленінградам. Потым вывезлі мяне з блакады, апухлага ад голаду, падлячылі і сказалі...

22 мая

Які радасны дзень! Радасны ўдвая. Учора Тамара Раманаўна дазволіла мне выходзіць гуляць. Але ўчора ішоў дождж. А сёння ўсё заліта сонцам, дыхае напоеная жыццятворнай вясновай вільгаццю зямля. І такая цеплыня! Для мяне — казачная, непраўдападобная, бо здаецца, што я адразу, у адзін дзень, перакінуўся са снежнай пустыні, дзе гуляла марозная пазёмка, у квітнеючую падмаскоўную вясну. Падмаскоўную! Ад таго, што я пад Масквой, таксама радасна.

Усю раніцу я гуляў па лесе навокал шпіталя. Стромкія, гаманлівыя меднастволыя сосны — такія ж і ў нас, над Сожам і Дняпром. Часам у забыцці мне здавалася, што гэта той лес, каля якога я вырас, нават асобныя дрэвы знаёмыя, мае дзіцячыя сябры! І мне хацелася размаўляць з імі гэтак жа, як у маленстве.

А перад прыгожым белым фасадам галоўнага корпуса (да вайны тут быў санаторый) цвіце бэз, быццам шызым дымам апавіла зялёныя кусты. Найлепшы ў свеце водар напаўняе наваколле — водар бэзу і сасны. Дыхаеш і адчуваеш, як прыбываюць сілы. За адзін дзень я намнога паздаравеў. Цудоўная рэч — жыццё!

Гуляючы, я ўбачыў, што аднаму з байцоў, якога выпісалі са шпіталя, аддалі яго франтавы рэчавы мяшок. Значыцца, у асобных выпадках рэчы раненых вязуць разам з імі ў тыл. Я кінуўся да сваёй сястры.

— Жэня, мілая, там сяму-таму аддаюць іх рэчы. Можа, і маё што ёсць? Ці нельга даведацца?

Яна ўсміхнулася цёпла, ласкава, у яе заўсёды кожнаму раненаму такая ўсмешка — як сённяшні майскі дзень.

— А што ў вас, скарб там, што вы так хвалюецеся?

Я на момант сумеўся, але тут жа вырашыў прызнацца шчыра, яна разумная і чулая дзяўчына, масквічка, дачка прафесара.

— Дзённік у мяне.

— Дзённік?

— З пачатку вайны я вёў дзённік.

Я не памыліўся, яна зразумела.

І вось — якое шчасце! — ён зноў у маіх руках, знаёмы, родны, зашмальцаваны агульны сшытак, дробненька спісаны ў кожную клетачку — трэба было эканоміць паперу.

Я сяджу адзінока ў дальняй альтанцы пад соснамі і размаўляю з ім, як з самым верным другам. Перагартаў, перачытаў, успомніў... Апошні запіс, які абрываецца словам «сказалі». Я не мог дапісаць, што сказалі маёру Жураўлёву...

Пісаў я позна ўначы пры святле газнічкі, зробленай з гільзы буйнакаліevернага кулямёта. Побач бестурботна спалі Чуб і Самародаў. Чуб смешна хроп, з подсвістам. А за дзвярамі тонка свістаў вецер, той своеасаблівы вецер, які здзірае самы верхні пласт снегу, узнімае тонкія снежныя пылінкі і нясе іх бясконца ў адным напрамку. Такая пазёмка засыпае след за пяць мінут.

Раптам адчыніліся дзверы, вецер калыхнуў полымя газнічкі. Сушылаў, які стаяў на варце, прашаптаў трывожна і таямніча:

— Камандзір! Сюды!

Я накінуў кажух, выскачыў. Вартавы хутка падымаўся на скалу, я за ім. Ён не стаў там у поўны рост, як звычайна, а лёг за камень, прашаптаўшы мне:

— Лажыся!

Я ўпаў побач з ім.

— Бачыш? — паказаў ён на возера.

Я пільна ўгледзеўся, але нічога не ўбачыў.

— Лыжнікі. Многа лыжнікаў. Ідуць ланцугом. У маскхалатах. Ты іх так не ўбачыш. Цені. Звярні ўвагу на цені. Ах, чортава свяціла!

Была поўня. Але па небе вецер гнаў пашматаныя хмары, і месячык то хаваўся за іх, то зноў выныраў; па азёрнай раўніне плылі цені ад хмар. Такі цень закрыў бліжэйшую да нас частку возера. Але патроху ён адступаў да левага лясістага берага, і на залітай месячыкавым святлом гладзі вырысаваліся іншыя цені — ад нябачных людзей, што кіраваліся ў наш бок.

— Чалавек сорак, калі не больш,— прашаптаў Сушылаў.— Я бачу не толькі цені, але тое, што не закрыта маскхалатамі... Да іх прыкладна кіламетр. Як думаеш, свае, чужыя?

— Фіны, Фядос Яфрэмавіч.

Я не сумняваўся — так маглі ісці толькі ворагі. Яны ведаюць, што тут пакаты бераг і лёгка выбрацца з возера. Пост наш новы, пра яго яны маглі не ведаць ці, можа, маюць намер захапіць знянацку і знішчыць.

— Будзем біцца? — спакойна спытаў Сушылаў.

— Будзем! Яны не павінны прайсці!

Я спусціўся ўніз, ускочыў у хаціну.

— Трывога, таварышы! — тузануў за нагу Чуба, больш моцнага на сон.— На возеры фіны. Ідуць сюды, прарывацца ў тыл. Але не павінны прарвацца! Будзем біцца, таварышы, да апошняга патрона, да апошняй кроплі крыві. Як нашы браты там, на фронце...

— Дзеткі мае,— прашаптаў Самародаў.

Мне не спадабаўся гэты стогн старэчай душы, і я злосна кінуў:

— Хто збаіцца — застрэлю!

Сам я таксама дрыжаў увесь, але не ад страху, а ад напружання, ад прагі бою, помсты.

— Мы не баязліўцы,— бадзёра сказаў Чуб, хапаючы вінтоўку.— Паміраць, дык з музыкай! — І моцна вылаяўся.

— Кожны на сваё месца! Як вучыў маёр. Узяць усе патроны, усе гранаты! Кулямёт вазьму я. Мы ўдарым па іх са скалы.

Камбат, калі наведаў пост, правёў з намі вучэнне па абароне ад нападзення з зямлі і з паветра. Тады я глядзеў на вучэнне крыху скептычна, а цяпер зразумеў, як яно было дарэчы: кожны ведаў, дзе яму залегчы, што рабіць.

Умомант даўшы патрэбныя ўказанні, я кінуўся да тэлефона. Мы былі звязаны з паўстанкам, дзе на камутатары дзяжурылі дзяўчаты. Па першаму слову «паветра» яны давалі нам «Елку» — штаб батальёна, і мы перадавалі даныя аб палёце варожых самалётаў. У непагадзь Чуб любіў «палякацаць» з тэлефаністкамі, «адвесці душу», як ён казаў. У апошнія дні і я часам «адводзіў душу» — прыемна сярод сонечнай пустэчы і цішыні пачуць жаночы голас, пажартаваць. Але была сярод тэлефаністак адна вельмі злосная, «баба-яга», як ахрысціў яе Чуб; яна не любіла гэтых пустых размоў, часам пагражала, што дaложыць нашаму начальству, чым мы займаемся.

— Дзяўчына! Дарагая,— паклікаў я, пачуўшы ў трубцы адказ на званок.

— Якая я вам дзяўчына? Пустабрэхі. Спакою ад вас няма...

— Маці! Таварыш дарагі!.. Перадайце на «Елку», на «Калугу» (штаб тылавой часці, якая размяшчалася каля паўстанка)... На возеры вораг, лыжнікі. Уступаем у бой. Просім дапамогі! Дапамогі!..

Голас тэлефаністкі адразу змяніўся:

— Перадам! Усё перадам... Трымайцеся, родныя мае!..

На размовы не было часу. Кінуўшы трубку, я схапіў ручны кулямёт, банку з дыскамі і палез на скалу.

Сушылаў ляжаў на самым краі абрыву. Я прымасціўся побач, падсунуўшы кулямёт яму — ён лепшы стралок. Ад яго ўзяў вінтоўку.

— Вось яны ўжо дзе... Бачыш? — прашаптаў ён.

Так, цяпер на фоне снегу вырысоўваліся рухомыя цёмныя плямы — твары, рукі, часткі непрыкрытай зброі. Вецер данёс нават голас, але пакуль што невыразны, нельга было зразумець, на якой мове. Размаўляюць, значыцца, не ведаюць пра нас. А можа?..

Сумненне, якое ўзнікла ў мяне, выказаў Сушылаў:

— Камандзір, а раптам — свае?

Падумалася аб тым, што ў батальёне засмяюць, калі трывога, якую я ўзняў, акажацца дарэмнай. А галоўнае — сапраўды не ўдарыць бы па сваіх.

— Пачакаем. Яны ідуць да нас,— прашаптаў я.— Будзем трымаць на мушках.

Я лічыў плямы, налічыў больш за пяцьдзесят. Вось яны зусім блізка, метраў за сто ўнізе, ужо і постаці добра відаць, нягледзячы на маскхалаты.

— Можа, аклікнуць? — прашаптаў Сушылаў. І ў бясстрашнага паляўнічага пачыналі здаваць нервы.

— Пачакаем.

І раптам выразная каманда на чужой мове.

Не, не маглі пасярод ночы, у такое надвор'е ісці з захаду на ўсход свае!

— Агонь!

Кулямёт паласнуў доўгай чаргой. Крык, стогн, гучная чужая каманда — і ўсё сціхла. Я прытрымаў Сушылава за локаць. Прыслухаліся, угледзеліся. Постаці як пад лёд праваліліся — нідзе ніводнай плямы. Пракляты месячык! Як на злосць, нырнуў за самую цёмную хмару! Мацней засвістаў каля вушэй вецер. На возеры мяце пазёмка, рухомы снег схаваў ворагаў, якія заляглі, накрыліся халатамі і, безмоўна, некуды паўзуць. Але куды? Адступаюць назад ці падпаўзаюць да берага, да нас? Хаця б зрабілі адзін стрэл. Яны не маглі не засекчы ўспышак кулямёта. Якая чартоўская вытрымка! Мне здалося, што нехта застагнаў пад самай скалой. Я дастаў з кішэні гранату, шпурнуў уніз. Глуха грымнуў выбух. І зноў ніякага адказу.

— Страшны звер залёг,— сказаў Сушылаў.— Майстры!

— Калі яны надумалі атакаваць нас, то зробяць гэта адтуль, з сушы. Пільнуйце тут, Яфрэмавіч, а я з кулямётам да Чуба.

Я падняўся — і адразу над галавой у мяне ціўкнула куля. Стрэл прагучаў не з возера, а з берага бухты, куды спускалася наша цясніна. Вунь яны дзе! Значыцца, блакіруюць, абкружаюць.

Я скаціўся са скалы на дах хаціны. У думках вылаяў сваіх забеспячэнцаў, якія выдалі на чатыры чалавекі толькі адзін маскхалат; нашы зашмальцаваныя кажухі і цёмныя шапкі

дэмаскіравалі нас. Яшчэ падумаў, калі ворагі зразумеюць, што нас нямнога, то могуць атакаваць па найкарацейшай адлегласці — па цясніне, якую абараняе адзін Самародаў, стары і баязлівы чалавек. Тады я паклікаў Сушылава і загадаў яму падняцца да Чуба з кулямётам.

— Займіце такую пазіцыю, каб маглі, калі трэба, страляць і сюды, у цясніну.

Я скочыў з даху, зазірнуў у хаціну, каб яшчэ раз пазваніць, паведаміць абстаноўку. Тэлефон быў мёртвы: яны паспелі перарэзаць провад. Трэба чакаць самага горшага.

Я здзівіўся свайму спакою: па-ранейшаму не было ні страху, ні панікі, толькі нецярплівасць: хутчэй бы яны пачыналі.

Калі выходзіў з хаціны, у твар ударыла яркае святло. Я ўпаў за шурку дроў, якая была складзена каля самых дзвярэй. Святло спалохала, бо не адразу я зразумеў, адкуль яно. Потым убачыў — ракета. Ворагі аглядалі нашы пазіцыі. Ракета зашыпела ў снезе недзе за хатай. Асеплены, я кінуўся да Самародава. Ён ляжаў за адным з каменняў, якія мы, па загаду маёра (эканаміст Жураўлёў усё бачыў наперад), скінулі з гары, каб было за што схавацца тут, у цясніне, калі прыйдзецца адбіваць атаку. Я лёг за другі камень. Шэптам падбадзёрыў старога:

— Трымайцеся, дзядзька Алампі!

Ён цяжка ўздыхнуў (ён увесь час уздыхаў і вохкаў — «ох-вох!»):

— Будзем паміраць, значыцца, таварыш камандзір?

Я ўспомніў, што Сушылаў спытаўся зусім іначай, і адказаў яго словамі:

— Будзем біцца! Біцца да апошняга... Да нас ідзе дапа...

Слова я не скончыў, бо ў гэты момант убачыў іх; мабыць, яны не ўлічылі, што за іх спінамі чорны фон, сасняк, унізе, на беразе бухты, ці проста хацелі хутчэй кончыць з нечаканай перашкодай... Схіленыя белыя постаці беглі да нас.

— Страляй,— крыкнуў я Самародаву і стрэліў сам з вінтоўкі — раз, другі...

У адказ затрашчалі аўтаматы. Многа аўтаматаў. Кулі заспявалі над галавой, са свістам рыкашэцілі ад скалы, ад каменняў, за якімі мы хаваліся, шлёпаліся ў снег. Успышкі стрэлаў набліжаліся.

Я ўзняўся на калена і кінуў гранату. Следам за мной шыбануў гранату Самародаў. А зверху ўдарыў з кулямёта Сушылаў.

Фашысты заляглі і пакінулі страляць, каб не дэмаскаваць сябе.

Я быў упэўнены, што цяпер яны паспрабуюць атакаваць з другога боку — з таго, які прыкрывалі Сушылаў і Чуб: там былі самыя зручныя подступы, і дыверсанты, безумоўна, разведалі іх. Я крыкнуў Сушылаву, каб яны з Чубам глядзелі больш пільна.

Сапраўды, праз некалькі хвілін угары загаварыў наш кулямёт і затрашчалі аўтаматы. Атака там з'явілася сігналам для тых, што заляглі недалёка ад нас. Яны таксама пачалі страчыць з аўтаматаў і зноў кінуліся наперад. Якая ўстарэлая зброя вінтоўка! Прыйшлося зноў выкарыстаць гранату. Яна, мабыць, добра пацэліла, бо пачуліся стогны і крыкі. Але я з жудасцю ўспомніў, што кінуў апошнюю гранату, іх нямнога ў нас было — усяго дзесятак. У каго астатнія?

— Самародаў! Гранаты ёсць?

У адказ пачуўся стогн.

Я кінуўся да старога. Ён ляжаў, уткнуўшыся тварам у снег. Я павярнуў яго. Зноў выглянуў месячык, і я ўбачыў замест твару чорную пляму. Цяпер я разумею: куля трапіла яму ў галаву, магчыма, у лоб, і твар быў заліты крывёю.

— Паміраю, камандзір,— прашаптаў ён.— Дзеці... Сыночкі мае... Дзе-еці!.. Перадай...

Што перадаць, я не даслухаў, бо зноў заціўкалі кулі. Я ўбачыў побач з вінтоўкай Самародава гранату і з радасцю схапіў яе. Але не кінуў. Месяц засвяціў так ярка, што я выразна ўбачыў постаці на снезе — відаць, забітыя. Адзін варушыўся і стагнаў. Крыху ніжэй чыркнула кароткая чарга.

«Трэба біць з вінтоўкі па ўспышках,— вырашыў я.— Гранату трэба прыберагчы». Я прыцэліўся і раптам адчуў, што нешта гарачае і ліпучае залівае вочы. Правёў рукой па твары, па валасах (шапкі не было, я не пачуў, калі яе сарвала) — усюды мокра і горача. Кроў! Ранены. Трэба перавязаць. Не, трэба перавязаць таварыша.

— Дзядзька Алампі!

— Камандзір? Жывы? — пачуўся збоку голас Чуба, дзіўны голас, здалося мне, вясёлы.

— Платон? — здзівіўся я.— Чаго ты тут?

— Сушылаў сказаў, справіцца адзін. Там іх нямнога. Паслаў падтрымаць вас. Дзядзька Алампі жывы?

Помню, я падумаў: сказаць яму ці не сказаць, што я ранены, а Самародаў забіты? Не сказаў. Спытаў:

— Гранаты ёсць?

— Тры.

— Страляй... Не давай ім падняцца.

Ён стрэліў і злосна вылаяўся пакручастым мацюком, успомніўшы ўсіх святых і грэшных, Бога і чорта, Гітлера і фінаў.

Кроў залівала мне твар. Калі я адчуў на губах яе салёны смак, закружылася галава. Рабілася млосна. У вачах дваілася; постаці, цені, месяц — усё перасеклі чырвона-фіялетавыя лініі, якія трымцелі і калыхаліся.

«Не, трэба сказаць, што я ранены, бо калі страчу прытомнасць...»

Але мяне стрымала... песня. Спяваў Чуб. Ці, можа, мне здалося? Не, ён сапраўды спяваў сваю любімую:

Посею лебеду на берегу,
Посею лебеду на берегу...
Мою крупную рассадушку...

І я заварожана слухаў, забыўшыся, што кроў залівае твар.

Мабыць, песня давяла ворагаў да шаленства. Дагэтуль яны атакавалі моўчкі, наганяючы страх аднымі аўтаматамі. А то раптам закрычалі дзіка, шалёнымі галасамі. Я зноў убачыў іх постаці. На момант іх закрыў выбух гранаты, якую кінуў Чуб. Я ўзняўся, каб таксама кінуць гранату...

Ярка-чырвонае полымя шуганула перад самым маім тварам. Апякло грудзі... Падпаліла снег. Загарэўся снег, заняўся полымем з усіх бакоў. Я пачаў адступаць ад гэтай нясцерпнай гарачыні і сарваўся ў бездань, паляцеў... І месяц чамусьці апынуўся ўнізе, пада мной, і закруціўся хутка-хутка, распырскваючы вакол сябе рознакаляровыя іскры... як тое тачыла, што стаяла каля кузні майго дзядзькі, дзе мы, малыя, вастрылі свае «шаблі»...

На апошнім чыстым лісце майго сшытка напісана нацвёрдай рукой хімічным алоўкам:

«Дарагі таварыш камандзір, Пятро Андрэевіч. Ляжаў я тыдзень з вамі побач у шпіталі ў Кандалакшы, ды ты не прыйшоў да прытомнасці, так моцна цябе пасекла праклятая граната. Таварышы нашы Аляміпі Маркавіч Самародаў і Платон Іванавіч Чуб палеглі смерцю храбрых на полі бітвы, як верныя сыны Айчыны. Вечная памяць ім.

Я адбіваўся адзін. Потым прыляцелі нашы самалёты. Асвяцілі ўсё навокал. Высадзілі дэсант. Кажуць, пералавілі ўсіх, хто ўцалеў ад нашых куль ды гранатаў.

Пятро Андрэевіч, вязуць вас у тыл. Кажа ўрач, будзеш жыць, бо малады арганізм. А я сваё адваяваў, мне дактары адпілілі левую руку. Вылечуся тут і паеду ў свой саўгас. Ачуняеце — напішыце. Перадаю дактарыцы, якая вас суправаджаць будзе, усе дакуменцікі вашы і сшытак, які так і ляжаў на стале раскрыты, нешта вы пісалі, ды не дапісалі.

Абнімаю цябе на развітанне, сынок. Сустрэцца наўрад ці давядзецца.

Фядос Яфрэмавіч Сушылаў».

Я не адразу знайшоў гэты запіс. Цяпер перачытваю скупыя словы незвычайнага пісьма і праз слёзы, як праз туман, бачу вясёлага кубанскага калгасніка Платона Чуба, які памёр з песняй. Яна гучыць у мяне ў вушах, гэта вясёлая песня:

Посею лебеду на берегу,
Посею лебеду на берегу…

У мелодыю песні ўрываецца роспачлівы стогн:
— Дзеткі мае… Сыночкі…

27 мая

Ён прыйшоў у нашу палату ў той дзень, калі да мяне наведаўся маёр са штаба ПВО, каб павіншаваць з узнагародай — ордэнам Чырвонага Сцяга. Маёр прынёс два экзэмпляры газеты, дзе вельмі недакладна і залішне ўзнёсла апісваўся наш бой. Адна газета пайшла па шпіталі. І вось ён зазірнуў таксама, каб павіншаваць. Дагэтуль я не бачыў яго. Ён прыйшоў на мыліцах, ледзь кранаючыся падлогі забінтаванымі

ступнямі. Сеў на ложак, горача, па-сяброўску загаварыў, працягваючы мне руку:

— Давай, зямляк, пацісну тваю мужную руку. Малайчына! Так і трэба нішчыць іх, погань фашысцкую.

Тут, у шпіталі, часам «земляком» называе разанец — астраханца, адэсіт — растаўчаніна, чэлябінец — хабараўца. Але па гаворцы я зразумеў, што перада мной сапраўдны зямляк, беларус, і ўзрадаваўся. Для пэўнасці спытаў:

— Вы беларус?

— Калі там,— паказаў ён на газету,— правільна пішуць, што ты гамяльчанін, дык я з Хойнік. Ведаеш? З Палесся.

— Дык гэта ж побач! У мяне жонка ў Рэчыцкім раёне. Я пехатою хадзіў да Хойнік,— яшчэ больш узрадаваўся я.— А з якога вы фронту? Дзе вас параніла?

— Я? — Ён неяк дзіўна ўсміхнуўся.— Я адтуль.

— Адкуль?

— З Палесся.

— Ды не, дзівак, я пытаюся, дзе ваяваў?

— Там і ваяваў.

— Там? Як гэта зразумець?

— Так і разумей...

Мабыць, у мяне ў тую хвіліну быў такі выраз твару, што ён не мог стрымаць вясёлага смеху.

— Але, браце, там, у партызанах. А потым накіравалі мяне для сувязі ў Маскву. Ішоў цераз лінію фронту, праваліўся ў нейкім гнілым балоце. Ногі абмарозіў. І вось качаюся два месяцы. Проста злосць бярэ. Плакаць хочацца. Там у нас, я ведаю, з вясной хлопцы так разгарнуліся... што горача гітлераўцам... А я вось тут...

Я глядзеў на яго... Немагчыма выказаць словамі, як я глядзеў на яго. Як на прышэльца з іншага свету. Не, глядзеў з радасцю, гонарам, захапленнем, бо ён прыйшоў адтуль, дзе асталося маё шчасце, з той зямлі, за якую я паміраў і гатовы паміраць зноў... Ён жывы сведка ўсяго, што робіцца ў родным краі, захопленым ворагам. Быццам баючыся, што ён пойдзе, знікне, нічога не расказаўшы, я схапіў яго за руку, хоць тады, туга перавязанаму бінтамі, мне нялёгка было зрабіць гэта — кожны рух прычыняў боль.

— Што там? Як там у нас? — дрыжучы ад нецярплівасці хутчэй пачуць пра ўсё, шэптам спытаў я.

— У нас? Ваюем. Б'ём паразітаў. Збіраем сілы. Спачатку цяжка было...— Ён расказваў надзіва спакойна, як пра самае звычайнае.

— А яны? Яны што?

— Хто?

— Гітлераўцы.

— Вядома — што... Адбіваюцца. Прабуюць нішчыць нас. Ды нас не знішчыш — з намі ўвесь народ. Каб зброі хапала ды даў кліч — усе ў лес пайшлі б. Ёсць, праўда, асобныя здраднікі, паліцаі розныя. Ды з такімі размова кароткая. Партызанскі прысуд — і гатова! Асабіста я чатыры такія прысуды выканаў...

— А народ... людзей, якія ў вёсках, яны не чапаюць?

— Ого, не чапаюць!.. Лютуюць, як шалёныя звяры... Паляць вёскі... Расстрэльваюць. Не глядзяць, ці старыя, ці дзеці... У мяне дзеда павесілі. Семдзесят восем гадоў. Мы ўсёй сям'ёй у партызаны пайшлі, а ён астаўся. Думаў, старога не зачэпяць.

— У мяне бацькі асталіся... І жонка.

Ён зразумеў маю трывогу, далікатна памаўчаў хвіліну, потым суцешыў:

— Не хвалюйся. Можа, і твае ў партызанах.

— У Сашы дзіця... маленькае... у пачатку вайны нарадзілася.

Ён, відаць, успомніў пра нешта сваё, такое ж дарагое, як для мяне ўспамін пра Сашу, і цень глыбокага смутку затуманіў яго блакітныя вочы, у якіх адбівалася рама шпітальнага акна. У вачах гэтых як бы згаслі радасныя светлячкі, якія бліскалі там праз усю размову. І раптам мой боль за Сашу і дзіця перадаўся яму. Ён скамячыў пальцамі прасціну і сказаў не мне, а некуды ў прастору, туды, дзе быў вораг:

— Усіх не зніп Не! Самі раней лягуць!..

Так пачалася наша дружба. Праўда, у партызана сяброўскія пачуцці да мяне з'явіліся не адразу. Але я прывязаўся да яго з той першай размовы. Я палюбіў Кастуся. Тады, калі

я не мог яшчэ ўставаць, для мяне быў пакутлівым, нешчаслівым той дзень, калі ён не прыходзіў у нашу палату. Я выдумляў розныя прычыны, каб яго паклікалі. Ён, мабыць, адчуваў гэта і нейкі час ставіўся да мяне, як дарослы да малога. Але я не крыўдзіўся. А калі пачаў падымацца і хадзіць, то не адступаў ад яго ні на крок.

Увесь час — удзень, увечары — мы былі разам, і ён пачаў ставіцца да мяне таксама па-сяброўску. Мы бясконца гаварылі. Пра што мы толькі не размаўлялі! Успаміналі родныя мясціны і дарагіх людзей, марылі, спрачаліся на палітычныя і ваенныя тэмы.

Нарэшце ў нейкі дзень я выказаў яму сваю мару, якая з'явілася, бадай што, адразу ж пасля першай нашай сустрэчы, але я доўга таіў яе не толькі ад яго і ад каго іншага, але нават ад самога сябе. Я гарэў жаданнем, думаў пра гэта бесперапынна, але, разважыўшы, заўсёды са смуткам прыходзіў да вываду, што ажыццявіць гэта дужа цяжка. Аднак калі дружба наша стала такой, што можна было даверыць адзін аднаму самыя патаемныя думкі, я адкрыў сваю мару:

— Кастусь, зрабі так, каб і я паляцеў з табой у тыл.

— Ты? — Ён сур'ёзна задумаўся, а потым, відаць, вырашыў крыху падражніць мяне, памучыць: — А што ты ўмееш рабіць?

— Як што? Страляць...

— Страляць цяпер усе ўмеюць.

— Я артылерыст.

— Артылерыі ў нас пакуль што няма.

Тое, што ён гулліва-спакойна адмаўляў усе мае якасці, давяло мяне да шаленства. Я крыкнуў:

— Дарогі ўмею будаваць, масты! Мала з цябе?

— Нам будаваць не трэба. Нам іх узрываць трэба...

— А калі я ўмеў збудаваць, то змагу і ўзарваць, будзь спакойны!

Мой «мучыцель» зноў сур'ёзна задумаўся.

— А вось гэта правільна. Будаўнік павінен ведаць, дзе слабое месца... Каб меншым зарадам — больш шкоды. Не, ты сур'ёзна хочаш у партызаны?

— Сур'ёзна! Ды я не ведаю, што зрабіў бы, каб апынуцца там.

— Шкада, што ты не радыст. Нам радысты патрэбны. Але нічога. Калі выпішуся, я пагутару ў партызанскім штабе. Я дакажу, што ты патрэбны чалавек.

Я ледзь не пацалаваў яго за такое абяцанне. А потым усе наступныя дні ў нас была адна гаворка: сотні варыянтаў яго размовы ў штабе, дзесяткі варыянтаў маёй заявы з просьбай накіраваць у тыл, да беларускіх партызан.

І вось сёння камандзіра разведкі партызанскага атрада «За Радзіму» Кастуся Гаманка выпісалі са шпіталя.

Я праводзіў яго да варот. Ён ішоў бадзёры, вясёлы, любаваўся сваім вайсковым абмундзіраваннем, якое яму выдалі,— ён фарсісты хлопец. Акрамя мяне яго праводзілі іншыя раненыя, санітаркі, сястра Жэня. Мне — сорамна прызнацца — не падабалася гэта, я як бы раўнаваў яго да ўсіх. Я хацеў бы астацца з ім адзін і яшчэ раз пагутарыць вельмі сур'ёзна. Людзі, якія ішлі, сваёй пустой балбатнёй, жартамі перашкаджалі. Толькі на самым развітанні, калі ён, пацалаваўшыся з санітаркамі, абняў мяне, я здолеў сказаць:

— Косця, ты ж глядзі не забудзь. Прашу цябе.

— Што ты, Пеця! Хіба я магу забыць? Для мяне цяпер гэта таксама галоўнае. Роўна праз тры дні ты атрымаеш адказ. Я прыеду сам.

Ён пайшоў. Я стаяў убаку ад іншых, глядзеў яму ўслед, і незразумелы смутак сціскаў мне сэрца. І цяпер я не знаходжу сабе месца, хоць мінула ўжо шмат гадзін, як ён пайшоў. Ці прыедзе ён? Ці выйдзе што з нашай задумы? Зрабіў запіс у дзённіку. Многа пісаць няма жадання. Перачытваў штонішто з ранейшага. Задумаўся, куды дзець дзённік, калі мара мая збудзецца і я палячу ў тыл. Аддам сястры Жэні, яна сур'ёзная і разумная, папрашу, каб схавала ў сваёй маскоўскай кватэры. Калі пасля вайны я не адгукнуся, няхай перашле па адрасе, які тут запісаны.

Надзея… І зноў правал у безнадзейнасць: ці не дарэмныя ўсе мае мары?

3 чэрвеня

«Роўна праз тры дні ты атрымаеш адказ. Я сам прыеду». Эх, Кастусь, Кастусь! Мінуў ужо тыдзень, а ад цябе і пошту няма. Забыўся. Няўжо забыўся, аказаўся балбатуном? Хаця б паведаміў, што нічога не выходзіць, і я не чакаў бы, не хваляваўся б. А можа, ты невінаваты? Не вялікі начальнік. Можа, самога загналі куды-небудзь далёка? Маглі нават вельмі проста забраць у армію. Дарэмна я так песціў сваю мару. Няшчасны фантазёр! Учора ўрач хацела мяне выпісаць і накіраваць у батальён выздараўляючых. Я прыкінуўся, што адчуваю сябе кепска, нават тэмпературу «настукаў», папрасіў Жэню, каб яна пераканала ўрачоў у неабходнасці патрымаць мяне хаця б дзянькі два.

— Я павінен атрымаць вельмі важную для мяне вестку ад Гаманка.

Агеньчык недзе ўсё яшчэ гарыць. Гарыць. І цяжка яго патушыць. Эх, Косця, Косця, навошта ты запаліў яго? Навошта?..

4 чэрвеня

Ура! Я лячу ў Беларусь!

1958